КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №44 (172)
◂ 27 ЛІСТАПАДА ◂ 2009 г.

# Новы Час



## З НЕЛЕГАЛАЎ У СПІКЕРЫ

Стар. 4

## АД КРЫЗІСУ ДА НЯНАВІСЦІ — АДЗІН КРОК

Беларусы падчас эканамічнага крызісу сталі больш злымі, перасталі верыць дзяржаве і спадзяюцца на тое, што «ўсё само сабой вырашыцца»

Стар. 5

## АПАКАЛІПСІС –2012

У інтэрнэце, па падліках амерыканскага выдання «New York Times», цяпер налічваецца 600 тысяч сайтаў, прысвечаных праблеме 2012 года

Стар. 19

## ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Стар. 9–16

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

Нарыс Аляксандра Тамковіча

**Алена Макоўская**

З цыклу «Трэці сектар у асобах»

▸ **АД РЭДАКТАРА**

# ПЛАН ДЗМІТРЫЯ МЯДЗВЕДЗЕВА

*Аляксей КАРОЛЬ*

**23 лістапада прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў у фармаце прэсавай канферэнцыі сустрэўся з беларускімі журналістамі. А на наступны дзень кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка пракаментаваў гэту сустрэчу як «абсалютна бессэнсоўную». Чым, па сутнасці, пацвердзіў яе значнасць.**



Было відавочна, што сам факт запрашэння на сустрэчу з Мядзведзевым незалежных журналістаў, прычым на парытэтных пачатках — 7 дзяржаўных, 7 незалежных — як мінімум насцярожыў беларускія ўлады: ад дзяржаўных СМІ на прэсавую канферэнцыю расійскага прэзідэнта былі камандзіраваны не галоўныя рэдактары агенцтваў і тэлеканалаў, а шараговыя журналісты. Незалежныя ж СМІ, наадварот, былі прадстаўлены галоўнымі рэдактарамі ці іх намеснікамі. У прыватнасці, там былі Іосіф Сярэдзіч («Народная воля»), Вячаслаў Хадасоўскі («Белорусы и рынок»), Анатоль Гуляеў («Товарищ»), Андрэй Скурко («Наша ніва»), Марына Золатава (БелаПАН), Ірына Лапшына (інтэрнэт-партал Tut.by). «Новы час» накіраваў мяне.

У падкрэслена парытэтным, працоўным і дэмакратычным стылі быў вытрыманы ўвесь фармат сустрэчы. Білеты да Масквы і назад — за кошт рэдакцыі. Ад вакзала да бусікаў, што чакалі нас на Васілеўскім спуску каля Крамля, каб адвезці ў загарадную рэзідэнцыю, што ў Барвісе, дабіраліся самі. Стандартныя і не абразлівыя для гонару кантроль допуску на тэрыторыю і ў памяшканне. Кава і гарбата з бутэрбродамі і печывам, пакуль мы чакалі Мядзведзева. Мабільнікі ніхто не забіраў. І ніякіх банкетаў, падарункаў пасля сустрэчы. Ад расійскіх і замежных СМІ прысутнічалі толькі тыя, хто быў запрошаны дзеля асвятлення прэс-канферэнцыі — за лініяй тэлекамер. Паводзілі яны, а таксама супрацоўнікі прэсавай службы Мядзведзева, сябе натуральна і свабодна, з павагай да прэзідэнта, але без ліслівасці. І ні аднаго кіраўніка асноўных расійскіх СМІ дзеля маўклівага параднага прадстаўніцтва.

У адным са сваіх першых каментараў адразу ж пасля прэс-канферэнцыі я адзначыў, што нічога сенсацыйнага не адбылося, ніякіх, здавалася б, лёсавызначальных палітычных заяў з вуснаў Мядзведзева не прагучала.

І на гэтым фоне неяк адышла ў цень значнасць самога факту сустрэчы расійскага прэзідэнта з прадстаўнікамі беларускай незалежнай прэсы. Упершыню за пятнаццаць апошніх гадоў. Гэта і ёсць сенсацыя — сам факт сустрэчы і яе фармат. І ці не ёсць яна знешнім знакам новага курсу новага расійскага прэзідэнта?

Думаю, што такая сустрэча да таго, як Дзмітрый Мядзведзеў апублікаваў артыкул «Расія, наперад!» і выступіў з пасланнем парламенту, дзе ў галоўных рысах вызначаліся канцэпцыя і практычны план мадэрнізацыі, была немагчымай.

Верагоднасць сапраўдных дэмакратычных перамен прагучала і ў адказах Дзмітрыя Мядзведзева на пытанні беларускіх журналістаў. Пакуль пункцірам, дзе рэхам і ўскосна, а дзе і наўпрост. І менавіта гэта, а не толькі непасрэдныя заўвагі ў бок беларускага кіраўніцтва, думаецца, сталася глыбіннай прычынай рэзка адмоўнай рэакцыі А. Лукашэнкі.

Абвешчаны Мядзведзевым курс на мадэрнізацыю Расіі падвяргаецца крытыцы з боку апазіцыйных аналітыкаў у самой Расіі. Пад сумніў ставіцца як сур'ёзнасць намераў, так і здольнасць прэзідэнта і кіроўнай эліты на правядзенне гэтага курса. Высмейваецца нават сам тэрмін — «мадэрнізацыя» замест рэформ.

Выказванні Мядзведзева падчас прэс-канферэнцыі былі скіраваны на доказ сур'ёзнасці планаў мадэрнізацыі. Адказваючы на маё пытанне, як яму — у кантэксце яго ідэй мадэрнізацыі, руху ад кіруемай дэмакратыі да нармальнай — бачацца магчымасці маральнай падтрымкі дэмакратычных перамен у Беларусі, адказаў так: «Расія не імкнецца да таго, каб штосьці навязваць... Аднак мы, безумоўна, зацікаўленыя ў развіцці беларускага грамадства і дзяржавы, гэта сумненняў не выклікае і не павінна выклікаць... Сапраўды, у маёй працы «Расія, наперад!» у адпаведным артыкуле і, пазней, у Пасланні прэзідэнта адзначалася неабходнасць мадэрнізацыі палітычных і эканамічных інстытутаў нашай краіны. Я лічу, што час для гэтага надышоў...

Калі нейкія ідэі з майго артыкула і Паслання прэзідэнта прыдадуцца нашым беларускім сябрам, я буды вельмі задаволены».

Дастаткова выразна ў адказе Дзмітрыя Мядзведзева на пытанне Вячаслава Хадасоўскага пра магчымае супраціўленне яго планам прагучала і разуменне небяспекаў рэформа, галоўныя з якіх — у супраціве кіруючых колаў.

«Рознага кшталту мадэрнізацыі, — падкрэсліў прэзідэнт, — патрабуюць унутранай напружанасці, дадатковай актыўнасці, аднак далёка не ўсе падрыхтаваныя да гэтага. Ёсць людзі, якія не хочуць ніякай актыўнасці. Даводзіцца прызнаць, што чыноўнікі ў гэтым сэнсе не самы перадавы клас...»

Але ж, акцэнтаваў Мядзведзеў: «Рашэнне прынятае, і патрэбна яго рэалізоўваць, рухацца наперад. Толькі тады будзе поспех. Я ў гэтым плане і вам, у дадзеным выпадку грамадзянам Беларусі, усім, хто тут прысутнічае, кіраўніцтву, прэзідэнту Беларусі зычу поспеху — шчыра зычу — і ва ўдасканаленні вашай эканамічнай сістэмы, правядзенні неабходных пераўтварэнняў, і ва ўдасканаленні палітычнай сістэмы. У такім разе, я перакананы, і вас, і нас чакае вельмі добрая будучыня».

І ўсё ж ні гэта інтэрв'ю беларускім журналістам, ні іншыя выказванні Мядзведзева не даюць яснага адказу на пытанне, ці пазбавіўся цалкам яго план ад спрадвечных імперскіх памкненняў. Сведчанне таму — і яго выказванні пра асабістыя адносіны Расіі і Беларусі, і пра насычэнні нейкім новым зместам старой ідэі саюзнай дзяржавы.

Як не ўтрымліваюць яны і цалкам яснага адказу на пытанні, ці ёсць план мадэрнізацыі яго самастойным планам з разлікам на выхад з ценю Уладзіміра Пуціна ў канкурэнцыі з ім, ці гэта ўзгоднены з Пуціным план, з адпаведным размеркаваннем роляў?

Такім чынам, спадзяванні беларускіх дэмакратаў на спрыяльную геапалітычную сітуацыю не толькі з боку Захаду, але і з Усходу, пакуль застаюцца пад пытаннем.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# НІ ПРАЦЫ, НІ ГРОШАЙ

Барыс ВЫРВІЧ

**Работнікам бялыніцкага прадпрыемства не заплацілі за працу ў шкодных умовах.**

Летам у бялыніцкай раённай газеце «Зара над Друццю» з’явілася абвестка: «*ООО «Белспецлит» требуются рабочие следующих специальностей: формовщик, литейщик металла, электрик, электрогазосварщик, подсобные рабочие. Обучение, высокий уровень оплаты, полный соцпакет. Справки по тел. 8-029-217-78-41, Валерий Анатольевич. УНН 790625466*». Пра новую фірму-інвестара, што пачала працаваць у Бялыніцкім раёне, паведаміў і інтэрнэт-сайт Бялыніцкага райвыканкама.

Высветлілася, што прадпрыемства сапраўды пачало працаваць у нашым раёне, адчыніўшы невялікі цэх адразу за ветсанзаводам у вёсцы Мяльнік.

Жадаючых працаўладкавацца спакушалі высокімі заробкамі, якія быццам бы збіралася плаціць за работу на прадпрыемстве. Рабочым прапаноўвалі прайсці выпрабавальны тэрмін на працягу месяца, прычым ніякіх запісаў у працоўныя кніжкі пры гэтым не рабілася. Пры прыёме на працу наогул не афармляліся ніякія дакументы, пашпарту дадзеныя жадаючых працаваць заносіліся ў нейкі спіс, дзе пазначаліся кантакты. Заработную плату ў перыяд выпрабавальнага тэрміна абяцалі плаціць у памеры 700 тысяч рублёў, а пасля яго заканчэння ліцейшчыкі і фармоўшчыкі быццам бы маглі атрымліваць ужо 1,3–1,5 мільёна рублёў. Працаваць людзі павінны былі вахтавым метадам.

Шмат хто з бялынічан паверыў гэтым абяцанням. Выказаў жаданне ўладкавацца на працу ў *«Белспецлит»* і мой сябар Андрэй І. Дзякуй Богу, што мне тады ўдалося адгаварыць яго, бо работнікі працавалі там папросту ў жудасных умовах: высокая тэмпература каля індукцыйных печак, задымленасць, адсутнасць усялякага вентыляцыйнага абсталявання, магчымасць атрымаць вытворчую траўму пры ліцці нарыхтовак. Памятаю, што мяне тады яшчэ здзівіла, як нашы шматлікія кантралюючыя органы далі дазвол на адкрыццё прадпрыемства, куды глядзіць санстанцыя і служба аховы працы Бялыніцкага раёна?

Пра гэта мы ўжо наўрад ці даведаемся, бо прадпрыемства ў Мельніку знікла гэтак жа раптоўна, як і з’явілася. А ўсе яго работнікі апынуліся каля разбітага карыта, не атрымаўшы за сваю працу ні капейкі (а многім «*Белспецлит*» вінаваты па некалькі мільёнаў рублёў).

Зараз былыя працаўнікі прадпрыемства ходзяць па розных інстанцыях, спрабуючы дабіцца, каб ім выплацілі зробленыя грошы. Звярнуліся яны па дапамогу і ў суд Бялыніцкага раёна.

Аднак ужо зразумела, што дамагчыся выканання сваіх патрабаванняў ім будзе вельмі складана. Справа ў тым, што былыя работнікі прадпрыемства ніяк не могуць дакументальна пацвердзіць, што яны сапраўды працавалі ў «ООО ***«Белспецлит»***, бо прымалі іх на працу з парушэннем заканадаўства без усялякага афармлення дакументаў. Але хтосьці ж даў дазвол на працу гэтага прадпрыемства і павінен быў кантраляваць яго работу?

ШКОЛА

# БЕЗ ПАДРУЧНІКАЎ, АЛЕ З ГАЗЕТАМІ

Барыс ВЫРВІЧ

**Мы ўжо пісалі пра тое, што ў школах Бялыніцкага раёна не хапае падручнікаў. Пасля гэта да мяне звярнулася ўжо некалькі знаёмых настаўнікаў з просьбай напісаць пра іншыя праблемы.**



У прыватнасці, настаўнікі скардзяцца на прымусовую падпіску на дзяржаўныя газеты і часопісы. Акрамя абавязковых для ўсіх педагогаў «СБ. Беларусь сегодня» і «Настаўніцкай газеты», па словах настаўнікаў, ім «рэкамендуюць» падпісацца на іншыя выданні. Чамусьці асабліва вялікай папулярнасцю ў нашага РАНА карыстаецца газета «*Юный спасатель*».

Шмат цікавага нашы паважаныя педагогі расказалі і пра спосабы выканання плана па платных паслугах і пазабюджэтнай дзейнасці, які даводзіцца кожнай школе. У некаторых школах адміністрацыя, каб не хадзіць з працягнутай рукой і не псаваць людзям нервы, папросту налічвае пэўную суму з прэміяльнага фонду на некалькіх добранадзейных настаўнікаў, а потым забірае грошы, каб выканаць план па платных паслугах. Некаторыя выкарыстоўваюць іншыя метады.

А колькі абурэння ў педагогаў выклікае неабходнасць пастаянна аддаваць грошы з заробкаў на самыя розныя, абсалютна незразумелыя мерапрыемствы!

Безумоўна, паважаныя педагогі, я больш дасканала вывучу ўсе вашы праблемы і напішу вялікі артыкул. Але выклікае вялікае здзіўленне, чаму нашы сейбіты «разумнага, добрага, вечнага», якія вучаць нашых дзяцей быць прыстойнымі людзьмі, самі не могуць узняць усе гэтыя пытанні.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ВІЦЕБСК. ДЭМАКРАТЫ ДАМОВІЛІСЯ

Прадстаўнікі дзвюх палітычных кааліцый — Аб’яднаныя дэмакратычныя сілы і Беларускі незалежны блок — дамовіліся пра сумесныя дзеянні падчас выбараў у мясцовыя саветы ў красавіку 2010 года. Віцебскія дэмакраты запланавалі сумесныя дзеянні і пастанавілі, што выбары ў мясцовыя саветы — генеральная рэпетыцыя наступнай выбарчай прэзідэнцкай кампаніі.

### ГРОДНА. ВЕЧАРЫНА КІНО І ПАЭЗІІ

На сядзібе ТБШ адбылася сустрэча з Таццянай Сапач — паэткай, перакладчыцай, аўтаркай тэлевізійных фільмаў і перадач. Аматары паэзіі ведаюць яе як аўтарку кнігі «Восень», а тэлегледачы — перадачы «Паштоўка з Вільні» на Белсаце і «Віленскі сшытак», што ўжо 20 гадоў выходзіць на першым канале Літоўскага тэлебачання. Таццяна Сапач прадставіла сваю новую кніжку «Няхай не пакіне нас восень», прачытала вершы па-беларуску, па-англійску, па-літоўску, па-польску і па-руску. У другой частцы быў прадэманстраваны новы дакументальны фільм «Тут, пад самаю Вільняй. З жыцця тутэйшых».

### АСТРАВЕЦ. ЭКОЛАГІ БУДУЦЬ ЗМАГАЦЦА

Прадстаўнікі Беларускай партыі «Зялёныя», «Экадом», мінскага аб’яднання эколагаў, навукоўцы і лідэр расійскай групы «Экозащита!» Андрэй Ажароўскі падчас прэсавай канферэнцыі заявілі, што будуць дабівацца, каб афіцыйныя матэрыялы пра магчымае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе Беларускай АЭС прызналі несапраўднымі. З іх пункту гледжання, падрыхтаваныя беларускім навукова-даследчым інстытутам энергетычнай прамысловасці матэрыялы наконт магчымага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе не адпавядаюць рэчаіснасці.

### БРАСЛАЎ. ЗОНА АДПАЧЫНКУ

У маляўнічым куточку Браслаўшчыны, у авеяных паданнямі і гісторыяй мясцінах плануецца будаўніцтва санаторна-курортнага комплексу. Аснова курорта — серавадародная крыніца і лячэбныя сапрапелевыя гразі з возера Смердзіс. Перлінай комплексу стане былая сядзіба пабудовы канца XVIII — пачатку XIX стагоддзяў. Яна захавалася ў задавальняючым стане. Будынак належаў Ваўжэцкім, Мінейкам, у ім бываў паэт Адам Міцкевіч. Побач з сядзібай захаваліся рэшткі рамантычнага парку. Рэалізаваць праект мяркуецца ў 2021 годзе.

### ГЛЫБОКАЕ. ЗРУЙНАВАЛІ МІНУЎШЧЫНУ

Шмат дзе ў Глыбоцкім раёне захаваліся фрагменты даўняй брукаванай дарогі, што ішла з Вільні на Полацк. Мясцовыя краязнаўцы называюць яе Альгердавым шляхам: мяркуюць, што праз гэты край маглі рухацца войскі Вялікага княства ў адным з паходаў канца XIV стагоддзя. Сёлета мясцовыя дарожнікі рэканструявалі ўчастак дарогі ад мястэчка Зябкі да Старых Зябак: пашырылі, выпрамілі павароты, паклалі асфальт, пад якім зніклі рэшткі легендарнай мінуўшчыны. Адначасова падчас рамонтных работ былі спілаваныя ўсе старыя дрэвы, многім з якіх не менш за сто гадоў. Пні і карані ад магутных, у два абхваты, дубоў карчавалі некалькі тыдняў.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# ГІСТОРЫЯ ВКЛ НА КУПАЛАЎСКАЙ СЦЭНЕ

Вольга ХВОІН

**На сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы адбылася тэатралізаваная прэзентацыя «Кнігі Вялікага княства Літоўскага» пад рэжысурай Мікалая Пінігіна. Міф пра гістарычную спадчыну ВКЛ увасобіўся ў музыку, танцы і філасофскія развагі.**

«Кніга Вялікага княства Літоўскага» — манументальнае выданне накладам у 1000 асобнікаў. Прадавацца яно не будзе, бо з’яўляецца падарункам выдаўцоў культурніцкім установам краіны. Гэта збор прац інтэлектуалаў Беларусі, Літвы і Польшчы, прысвечаны феномену дзяржаўнай і культурнай супольнасці.

Ідэя стварэння «Кнігі Вялікага княства Літоўскага» належыць тром асобам: Томасу Венцлаву, Чэславу Мілашу і Анджэю Струмілу. Як расказаў Анджэй Струміла, задума прыйшла падчас супольнага «выпівання гарбаты» і ўрэшце ўвасобілася ва ўнікальны зборнік. Свой унёсак у стварэнне гэтай кнігі спадар Струміла лічыць данінай павагі продкам — яго род паходзіць з Беларусі.

Канцэпцыя 552-старонкавага фаліянта, прысвечанага 1000-годдзю першай летапіснай згадкі пра Літву, ажыццёўленая польскім мастаком Анджэем Струмілам пры дапамозе польскага фонду «Памежжа» ў Сэйнах. Выданне вылучае цудоўная графіка і аднародная стылістыка, яно багата ілюстравана старадаўнімі гравюрамі, картамі, абразамі, жывапіснымі палотнамі і ўнікальнымі фотаздымкамі. Сярод беларускіх аўтараў — Уладзімер Арлоў, Сяргей Дубавец, Алег Латышонак, Генадзь Сагановіч і Сакрат Яновіч.

Кніга выдадзена на чатырох мовах — англійскай, беларускай, літоўскай, польскай і складзена з эсэ выбітных публіцыстаў, гісторыкаў і навукоўцаў, кожны з якіх мае свой уласны погляд на гісторыю ВКЛ у кантэксце сённяшняга часу.

«Спадчына Вялікага княства — не беларуская, не літоўская і не польская праблема, не прадмет спрэчкі, дзябльбы, экспансіі. Яна ўнікальная толькі як цэлае, як наша супольная антычнасць. Яна жыве аднолькавым водгукам у душах нашчадкаў Вялікага княства. Але, у адрозненні ад антычнасці, яна не стала тэкстам, бо мы расцягалі яе герояў па сваіх нацыянальных сшытках і складаем свае новыя легенды, уціскаючы ўсю сваю тысячагадовую гісторыю ў межы сваіх сучасных тэрыторый, нібы па пёрку выторгваем з крылаў Святога духа, — пішуць аўтары кнігі. — Мы і свету цікавыя найперш сваім узаемапранікненнем. Калі ж нас расчляніць, дык і ўся наша вартасць будзе ў тым, што мы не нехта, а тубыльцы, выключаныя з кантэксту ўласнай цывілізацыі».

НЕКРАЛОГ

# ПАМЯЦІ КАЛЕГІ

**Не стала калегі, даўняга сябра, грамадскага актывіста і распаўсюджвальніка «Згоды», а пасля і «Новага часу» Валянціна Доўнара.**

Ён так і не прыйшоў у прытомнасць пасля таго, як 20 лістапада ля кінатэатру «Кастрычнік» у Мар’інай Горцы на яго быў здзейснены разбойны напад. Моцна збітага Валянціна падабраў міліцэйскі патруль і даставіў у шпіталь. Амаль тыдзень дактары змагаліся за яго жыццё. Не перамаглі.

Выказваем шчырыя спачуванні родным і сваякам Валянціна. Мы смуткуем разам з вамі. І спадзяемся, што крымінальная справа, заведзеная па факту нападу, будзе раскрытая, а вінаватыя — пакараныя.



## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ЛЕПШАЯ НАВІНА — АДСУТНАСЦЬ НАВІНАЎ



Сяргей САЛАЎЁЎ

**Хаця Аляксандр Лукашэнка ў сваёй манеры і ацаніў сустрэчу Дзмітрыя Мядзведзева з беларускімі журналістамі як «абсалютна бессэнсоўную», па ўсім відаць, зараз яго больш хвалююць іншыя праблемы.**

І ці не галоўная з іх — падпісанне дакументаў па Мытнаму саюзу з Расіяй і Казахстанам. «Мытны саюз — гэта перш за ўсё мацнейшая падтрымка для Расіі», — заявіў беларускі прэзідэнт 24 лістапада ў Мінску ў размове з удзельнікамі X пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаўных інфармацыйных агенцтваў СНД .

Паводле слоў прэзідэнта, беларускі бок разлічвае, што ўдзел у мытным саюзе дасць яму эканамічны эфект. «Для нас гэта больш надзея на тое, што будзем мець эфект у эканоміцы. У тым выглядзе, у якім мы цяпер яго прымаем, ён яшчэ пакуль не дасць эфекту. Гэта працэс, але не далёкі. Мы за паўгода ўніфікуем усе мытныя тарыфы, ствараем камісію і выходзім да адзінай эканамічнай прасторы. Вось адзіная эканамічная прастора — гэта поспех», — заявіў Лукашэнка.

То бок, ніякага прапагандысцкага эфекту факт запрашэння беларускіх журналістаў Мядзведзевым для Лукашэнкі не існуе. Нават заява Мядзведзева пра тое, што ён будзе сустракацца з журналістамі рэгулярна, а ў перспектыве плануе сустрэчы з беларускай апазіцыяй, для Лукашэнкі не страшная. Ці яго больш хвалююць іншыя праблемы.

З іншага боку, Расія зрабіла шэраг рэверансаў напярэдадні падпісання дамоваў па Мытным саюзе і ў бок афіцыйнага Мінска. Удзел Беларусі ў праграме Еўрасаюза «Усходняе партнёрства» не будзе канкураваць з яе ўдзелам у СНД, ЕўрАзЭС і Мытным саюзе. Такую заяву зрабіў міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў на прэс-канферэнцыі 25 лістапада ў Маскве, дзе праходзіла пасяджэнне сумеснай калегіі знешнепалітычных ведамстваў Беларусі і Расіі.

«Нашы беларускія сябры пацвердзілі, што іх удзел у праектах «Усходняга партнёрства» не будзе наносіць ніякага ўрону, сапернічаць з актыўным удзелам Беларусі ў інтэграцыйных працэсах на прасторы СНД, уключаючы ЕўрАзЭС і Мытны саюз. Мы такі падыход лічым адкрытым, транспарэнтным і зыходзім з таго, што так яно і будзе», — заявіў Лаўроў.

А міністр фінансаў Расіі Кудрын пайшоў яшчэ далей, заявіўшы, што Расія прыме рашэнне пра выдзяленне крэдыту Беларусі на будаўніцтва АЭС у найбліжэйшыя некалькі месяцаў.

Але ж гэта толькі заяўкі. Паглядзім, як будзе развівацца сітуацыя надалей. Асабліва ва ўмовах крызісу.

### Пакуль Кудрын збіраецца фінансаваць будаўніцтва АЭС, у гэтай галіне здзівілі беларускія спецыялісты

Тым часам, пакуль Кудрын збіраецца фінансаваць будаўніцтва АЭС, у гэтай галіне здзівілі беларускія спецыялісты. Уздзеянне малых доз радыяцыі нароўні з іншымі неспрыяльнымі фактарамі (неспрыяльная экалогія, стрэс, недахоп ёду і лішак соляў цяжкіх металаў у арганізме чалавека) спрыяе развіццю псіхасаматычных захворванняў, а таксама хваробаў, абумоўленых парушэннямі імуннай і эндакрынных сістэмаў. Пра гэта сведчаць вынікі даследавання, праведзенага беларускімі спецыялістамі, паведаміла 24 лістапада ў Мінску на міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Экалогія чалавека ў постчарнобыльскі перыяд» загадчыца кафедры педыятрыі № 2 Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта дацэнт Нэлі Парамонава.

Паводле яе слоў, даследаванне ўздзеяння экалагічна неспрыяльных фактараў на арганізм дзіцяці праводзілася на працягу шасці гадоў. Былі абследаваны больш за 2 тысячы дзяцей, галоўным чынам з Гомельскай і Магілёўскай абласцей, якія найбольш пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС.

Як паказала даследаванне, уздзеянне радыеактыўных і антрапагенных фактараў на здароўе прыводзіць да парушэнняў цэнтральнай нервовай сістэмы: парушэнняў у структуры асобы, дыспрапорцый у суадносінах стэнічных і астэнічных уласцівасцяў, зніжэння інтэлектуальных здольнасцяў, парушэння генетычнай адаптацыі.

Здаецца, раней пра гэта ўвесь час казалі незалежныя эксперты, такія, як прафесар Іван Нікітчанка і былы рэктар Гомельскага медуніверсітэта Юры Бандажэўскі. Бандажэўскага за гэта пасадзілі. А Нікітчанку мала хто слухаў. І вось зараз — прызнанне іх слушнасці на афіцыйным узроўні.

Ну, і яшчэ здзівілі замежныя калегі. Еўрапейская камісія мае «неўзабаве» прыняць рашэнне пра зніжэнне кошту шэнгенскіх віз для беларусаў, заявіў міністр замежных спраў Літвы Вігаўдас Ушацкас 24 лістапада падчас сустрэчы са студэнтамі Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта ў Вільнюсе.

«Беларусаў да гэтага часу дыскрымінуюць, і тое не робіць гонару Еўрасаюзу», — сказаў дыпламат. Ушацкас пацвердзіў, што кошт павінен быць зніжаны прынамсі да ўзроўню, які плацяць грамадзяне Расіі і Украіны, — 35 еўра замест цяперашніх 60.

«Спадзяюся, Еўракамісія прыме аператыўныя рашэнні, каб выправіць абсалютна непрымальную цяперашнюю сітуацыю», — зазначыў Ушацкас.

Што ж, будзем чакаць сюрпрызаў. Спадзяюся, прыемных.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### АЛЯКСАНДР КУЛІНКОВІЧ




Беларускі гурт «Нейра Дзюбель» адзначае дваццацігоддзе сваёй творчай дзейнасці. Лідэр калектыву Аляксандр Кулінковіч перад юбілейным канцэртам у інтэрв'ю журналістам расказаў, што цяпер гурт задавальняе стабільная ўнутраная ўвага слухачоў, а пра сусветную папулярнасць больш не марыць. Кулінковіч быў адным з музыкаў, якія хадзілі ў Адміністрацыю прэзідэнта дамаўляцца, каб гуртам, што знаходзяцца ў «чорным спісе», дазволілі выступаць на канцэртных пляцоўках Беларусі. «Цяпер забароны няма, можна спакойна ладзіць канцэрты. Адно выявіўся парадокс: калі мы былі забароненыя, нас запрашалі не менш. Але нас запрашалі не як музыкаў, а як «забаронены гурт з Беларусі», — цытуе словы Аляксандра адно з он-лайнавых выданняў краіны. — Цяпер людзі ідуць толькі на нашу творчасць, што мне больш да сэрца. Мне падабаецца, калі мяне любяць ці не любяць за мае песні, а не за тое, які сцяг мне падабаецца больш». Музыка сцвярджае, што як і раней, іх творчасць знаходзіцца па-за цэнзурай.

Гурт «Нейра Дзюбель» быў заснаваны ў 1989 годзе, за гэты час выпусціў 17 альбомаў. Найбольш вядомымі сталі кампазіцыі *«Охотник и Сайгак»*, *«Переехала камбайнам»*, *«Женщина моих галлюцинаций»*. У 1998 годзе «Нейра Дзюбель» атрымаў званне найлепшага гурта Беларусі — «Рок-карону». На «Рок-каранацыі» 2005-га першы беларускамоўны альбом гурта «Танкі» быў прызнаны альбомам года, праз тры гады гэткае ж прызнанне атрымаў альбом «STASI».

### УЛАДЗІМІР АСІПЕНКА



Прадпрымальніку з Ваўкавыска Уладзіміру Асіпенку прад'яўлена абвінавачванне ў падрыхтоўцы тэрарыстычнага акту. 20 лістапада аналагічнае абвінавачванне было прад'яўлена Мікалаю Аўтуховічу. Праваабаронца Алег Волчак выказаў меркаванне, што абвінавачванне ў падрыхтоўцы тэракту будзе таксама прад'яўлена іншым фігурантам гэтай справы. Вядома, што апроч Аўтуховіча і Асіпенкі па справе праходзяць Юрый Лявонаў (быў вызвалены 8 жніўня, 24 верасня з прадпрымальніка зняты ўсе крымінальныя абвінавачванні), былы міліцыянер Міхаіл Казлоў і былы супрацоўнік фірмы Аўтуховіча Аляксандр Ларын.

«Міхаіл Казлоў — адзін з былых кіраўнікоў аддзела па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю Гродзенскага аблвыканкама. Менавіта Казлоў прымаў рашэнне пра завядзенне крымінальнай справы ў дачыненні да начальніка інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах Ваўкавыскага раёна ў 2003 годзе на падставе скаргаў Аўтуховіча, — паведаміў БелаПАН праваабаронца. — Пазней яго абвінавацілі ў неданясенні інфармацыі аб тэракце, што рыхтаваўся. Нібыта Казлоў ведаў пра яго падрыхтоўку і не паведаміў». Па словах Алега Волчака, пацвердзілася інфармацыя і пра тое, што Ларын раней ужываў наркотыкі, а таксама ўдзельнічаў ва ўзброеных канфліктах. І менавіта на яго сведчаннях будуецца ўсё абвінавачванне.

Ваўкавыскіх прадпрымальнікаў Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава і Уладзіміра Асіпенку затрымалі 8 лютага гэтага года, праз дзесяць дзён ім было прад'яўлена абвінавачванне па арт. 218 Крымінальнага кодэкса, а 23 чэрвеня ў дачыненні да Аўтуховіча і «іншых асобаў» была заведзеная справа па арт. 359 Крымінальнага кодэкса (падрыхтоўка тэрарыстычнага акту).

### АНАСТАСІЯ НОВІКАВА




Ураджэнка Жодзіна Анастасія Новікава (вагавая катэгорыя да 58 кг) заваявала срэбра ў суме дваяборства на чэмпіянаце свету па цяжкай атлетыцы ў Паўднёвай Карэі. Па выніках двух практыкаванняў беларуска падняла 225 кг (100 кг у рыўку і 125 кг у штуршку). Золата выйграла кітаянка Лі Сюень, якая набрала суму 239 кг (107+132), бронза дасталася ўкраінцы Юліі Каліне — 215 кг (96+119).

У актыве Анастасіі Новікавай таксама два малыя срэбныя медалі ў асобных практыкаваннях — рыўку і штуршку. Раней Новікава выступала ў лягчэйшай катэгорыі (53 кг), выйграўшы бронзу Алімпіяды–2008 у Пекіне і срэбра Чэмпіянату свету–2007.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# З НЕЛЕГАЛАЎ У СПІКЕРЫ

Вольга ХВОІН

**Двое прадстаўнікоў беларускай дэлегацыі ўвайшлі ў склад пастаянных кіраўнікоў створаных органаў Форума грамадзянскай супольнасці. Кіраўнік Асамблеі НДА, якой улады Беларусі неаднаразова адмаўлялі ў рэгістрацыі, Сяргей Мацкевіч узначаліў першую тэматычную працоўную групу «Дэмакратыя, правы чалавека, належнае дзяржаўнае кіраванне і стабільнасць», а таксама быў заяўлены як афіцыйны спікер форума. Старшыня кансорцыума «ЕўраБеларусь» Улад Вялічка ўвайшоў у склад кіраўнічага камітэта ў якасці прадстаўніка беларускай дэлегацыі (так званы статус country facilitator).**



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Сяргей Мацкевіч

Галоўным дасягненнем першага Форума грамадзянскай супольнасці, што адбыўся ў Брусэлі ў межах праграмы «Усходняе партнёрства», стала фармаванне структур, якія будуць займацца каардынацыяй дзейнасці ў межах праграмы форума, а таксама запачаткаванне працы на сталай аснове.

Паводле слоў Улада Вялічкі (у форуме ўдзельнічалі 25 прадстаўнікоў ад беларускіх грамадскіх арганізацый), дасягнуць кансенсусу было не так лёгка. Размова ідзе пра адстойванне інтарэсаў прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці, якія прыехалі на форум са сваімі прапановамі, і суаднясенне іх з чаканнямі Еўрапейскай камісіі. У выніку быў прапанаваны кампрамісны варыянт: стварыць пастаянны орган — кіруючы камітэт з семнаццаці чалавек, які будзе каардынаваць працу тэматычных груп.

Нагадаю, што ў склад камітэта ўвайшлі кіраўнікі працоўных груп форума, па адным прадстаўніку ад кожнай з дэлегацый краін «Усходняга партнёрства», а таксама прадстаўнікі еўрапейскіх арганізацый грамадзянскай супольнасці. «Тое, што рашэнне пра фармаванне пастаяннага працоўнага органа было прынята, гарантуе, што працэс працягнецца і не будзе насіць характар «адной сустрэчы на год», — лічыць кіраўнік кансорцыума «ЕўраБеларусь».

Форум грамадзянскай супольнасці, як і праграма «Усходняе партнёрства», працуе па чатырох тэматычных платформах: дэмакратыя і належнае кіраванне; эканамічная інтэграцыя і збліжэнне з палітычнымі курсамі ЕС, навакольнае асяроддзе, змена клімату і энергетычная бяспека, кантакты паміж людзьмі. Першая тэматычная група падчас форума сабрала найбольшую колькасць удзельнікаў, і менавіта на ёй уздымаліся вострыя пытанні. У выніку быў выпрацаваны шэраг рэкамендацый для ЕС і ўрадаў краін «Усходняга партнёрства».

Асаблівая ўвага была скіравана на сітуацыю з правамі чалавека ў краінах-партнёрах, неабходнасць узмацніць дэмакратычныя прынцыпы, пашырыць падтрымку плюралізму і незалежнасці СМІ, прыняць захады па забеспячэнні бяспекі і мірнага будаўніцтва. Беларуская дэлегацыя прапанавала ўнесці ў выніковую рэзалюцыю пункт пра неадкладнае вызваленне палітвязняў, якія, на жаль, ёсць у краінах, што ўваходзяць у праграму «Усходняе партнёрства». Заля вітала прапанову авацыямі. Надалей форум будзе рыхтаваць адмысловыя для кожнай краіны справаздачы па дэмакратычным кіраванні, якія могуць стаць асновай ацэнкі прагрэсу зменаў у грамадска-палітычным жыцці дзяржаў.

Разам з тым прадстаўнікі трэцяга сектару звяртаюць увагу на праблему некансалідаванасці дзеянняў паміж дзяржаўнымі структурамі і грамадзянскай супольнасцю ў межах праграмы «Усходняе партнёрства». «У нас з'явіліся два лідэры ў грамадзянскай супольнасці — Асамблея НДА і кансорцыум «ЕўраБеларусь», і паміж імі мусіць быць альянс. Неабходна прад'явіць аргументы наяўнасці грамадзянскай супольнасці ў краіне, прад'явіць дзяржаве факт таго, што ёсць з кім размаўляць, што мы ведаем, як арганізаваць грамадска-кансультатыўную раду», — падкрэслівае метадолаг Уладзімір Мацкевіч. Паводле меркавання эксперта, Беларусь цяпер лідзіруе ва «Усходнім партнёрстве», і «калі ты першы хацябгадзіну, то мусіш быць годным лідэрам. Зараз на беларускай дэлегацыі ляжыць вялікая адказнасць».

Сярод пытанняў, якія абмяркоўваліся на Форуме грамадзянскай супольнасці, для беларусаў цікавасць уяўляе прапанова стварыць дарожныя карты для жыхароў краін-парнёраў праграмы «Усходняе партнёрства». Ініцыятыва была ўнесена ў выніковую рэзалюцыю форума.

«Патрабаванне дэлегатаў форума вельмі канкрэтнае: адмяніць візавы рэжым з краінамі «Усходняга партнёрства», — падкрэсліў прадстаўнік беларускай дэлегацыі Улад Кобец. — Не палегчыць, не спрасціць, не падумаць, а адмяніць. У фінальнай рэзалюцыі было прапісана, што для кожнай краіны мусіць быць распрацавана дарожная карта. Бо адна справа — паездкі людзей з Беларусі і Украіны, іншая — жыхароў Каўказа. Да таго, як будзе распрацавана дарожная карта, прапануецца ўвесці бясплатныя візы для жыхароў краінаў «Усходняга партнёрства». Гэта было вітана форумам, еўракамісарам Бенітай Фэрара-Вальднер і Карлам Більдам — міністрам замежных спраў Швецыі. Пазіцыя па візах будзе агучана ў снежні на сходзе міністраў замежных спраў краінаў Еўрапейскага саюза, а ў маі наступнага года пытанне будзе ўзнята ў Еўракамісіі.

Перад форумам прадстаўнікі беларускай дэлегацыі асцярагаліся, што мерапрыемства будзе мець фармальны характар і не атрымаецца дасягнуць канкрэтных вынікаў. Аднак урэшце старшыня праўлення Інавацыйнага фонду прававых тэхналогій Алена Танкачова заявіла, што цяпер яна з гонарам думае пра грамадзянскую супольнасць Беларусі. Дарэчы, Сяргей Мацкевіч як спікер прадставіць вынікі форума на канферэнцыі міжміністэрскага паседжання палітыкі «Усходняе партнёрства» 8 снежня ў Стакгольме.

«Поспех беларускай дэлегацыі на форуме быў не выпадковым, — лічыць палітолаг Андрэй Ягораў. — Гэта вынік працяглай працы, якая была распачата кансорцыумам «ЕўраБеларусь» яшчэ ў снежні мінулага года. За гэты час былі разгорнуты дзеянні па лабіраванні фармату форума, праведзена праца па кансалідацыі пазіцыі грамадзянскай супольнасці Беларусі ў межах «Усходняга партнёрства», арганізаваны грамадскія слуханні па пытаннях працы грамадска-кансультатыўнай рады пры Адміністрацыі прэзідэнта, каб пазбегнуць імітацыі дыялогу ўладаў з грамадзянскай супольнасцю краіны. Аднак зразумела, што першы форум — толькі пачатак працы. Змястоўнасць мерапрыемства стане магчымым ацаніць праз год, калі будуць падрыхтаваны неабходныя дакументы і з боку інстытуцыянальнага справа скранецца ў бок практычны.

З НАГОДЫ

# СМЕРЦЬ АДС ЗАЎЧАСНАЯ

Генадзь КЕСНЕР

**На апошнім пасяджэнні Сойму Партыі БНФ — аднаго з заснавальнікаў кааліцыі Аб'яднаных дэмакратычных сілаў (АДС) — яго ўдзельнікі прынялі рашэнне пра тое, што АДС больш не існуе. Прапануем меркаванні наконт таго, наколькі абгрунтавана такое рашэнне.**



Photo.ByMedia.Net

**Аляксей Янукевіч, старшыня Партыі БНФ:**

— Гэта відавочна, таму што статутныя дакументы АДС даўно не дзейнічаюць і не выконваюцца. З моманту заснавання АДС з яго складу выходзілі цэлыя групы ці асобныя арганізацыі. І на сённяшні момант абсалютна аб'ектыўна, што любыя кансультацыі ў межах дэмакратычных сілаў заўсёды адбываюцца ў фармаце, значна больш шырокім за АДС, гэта ўжо рэчаіснасць. Палітычная рада АДС — кіроўны орган, прызначаны ў 2007 годзе Кангрэсам дэмакратычных сіл, не збіраецца з 2008 года. Таксама апошнім часам не адбываюцца кворумныя пасяджэнні Палітычнай рады АДС.

Такім чынам, ніводны орган АДС сёння фактычна не працуе. Сёння АДС на міжнародным узроўні нідзе не разглядаецца як орган, які можа гаварыць ад імя ўсіх дэмакратычных сіл, і такая сітуацыя перашкаджае фарміраванню іміджу беларускіх дэмакратычных сіл, іміджу апазіцыі і сярод нашых міжнародных партнёраў, і сярод беларускіх грамадзян як сілы, здольнай дамаўляцца, шукаць агульныя падыходы.

**Анатоль Лябедзька, кіраўнік Аб'яднанай грамадзянскай партыі, сустаршыня Прэзідыума Палітрады АДС:**

— Ёсць юрыдычны складнік і сітуацыя «дэ-факта». Што тычыцца юрыдычнага боку, то нават любы студэнт юрфаку скажа, што адмяніць рашэнне можа той, хто яго прымаў. Рашэнне пра стварэнне АДС і яго структур прымалася



Photo.ByMedia.Net

Кангрэсам дэмакратычных сіл. І толькі кангрэс валодае легітымнасцю прымаць ці адмяняць падобныя рашэнні.

А ёсць сітуацыя дэ-факта: няма дзейнасці — няма кааліцыі, якая мае магчымасць існаваць толькі на паперы. Але дзейнасць ёсць, значыць, і кааліцыя існуе. Там засталіся дзеяздольныя структуры. Варта адзначыць, што ў кааліцыі існуюць чатыры зарэгістраваныя партыі. А гэта азначае, што яны адпавядаюць пэўным крытэрам, якія выстаўляе ўлада. А крытэры гэтыя дастаткова высокія і жорсткія. Да таго ж, ёсць дастаткова дзейсная структура — рух «За свабоднае развіццё прадпрымальніцтва», ёсць незалежныя прафсаюзы, ёсць аргкамітэт па стварэнню незалежнай жаночай арганізацыі. Нашу дзейнасць можна сёння адчуць, яна звязана з антыкрызіснымі прапановамі. Тут ёсць сацыялогія, ёсць масмедыя, якія ўцягнуты ў папулярызацыю антыкрызісных прапаноў. Ёсць таксама і кавалак працы, зробленай па выпрацоўцы прапаноў па змене выбарчага заканадаўства, па перамовах з БДПЧ.

Пры ўсёй павазе да Партыі БНФ, я адзначу: відаць, можа казаць, што павінен надысці калапс, каб АГП выйшла з гэтага працэсу. Так скláліся абставіны, што апошні год БНФ не працаваў актыўна як структура, працавалі асобныя людзі, якія і надалей будуць працаваць, нягледзячы на рашэнне, якое прынята Соймам. Стварэнне Беларускага незалежніцкага блоку, над якім працавалі актывісты БНФ, не з'яўляецца прыярытэтам АДС.

КРУГЛЫ СТОЛ

# КУРАПАТЫ — СПРАВА ДЗЯРЖАВЫ І ГРАМАДСКАСЦІ

Аляксей ХАДЫКА

**20 лістапада пад старшынствам кандыдата гістарычных навук, сябра міжнароднага таварыства «Мемарыял» Ігара Кузняцова адбылося пасяджэнне «круглага стала» «Курапаты — праз 20 гадоў».**



Грамадскасць сабрала публікацыя ў газеце «СБ — Беларусь сегодня» 29 кастрычніка 2009 года рэдакцыйнага артыкула Паўла Якубовіча «*Куропаты: мир под соснами*» і матэрыялаў дыскусіі, водгукі на якія «НЧ» прапанаваў у № 43.

Прадстаўнік «СБ» Іван Кірыленка, які рыхтаваў да друку тыя сенсацыйныя матэрыялы, не здолеў прысутнічаць на грамадскім «круглым стале». Таму ацэнку публікацыі давялося рабіць без дыялога з яе ініцыятарамі ў «СБ».

Увагу ўсіх сабраных — гісторыкаў, палітыкаў, пісьменнікаў, мастакоў, грамадзянскіх дзеячаў — звярнула дата з'яўлення артыкула. Гэта дзень, калі ў памяць масавага расстрэлу 29 кастрычніка 1937 года арыштаваных беларускіх пісьменнікаў і паэтаў у Беларусі неафіцыйна ўшаноўваецца памяць ахвяр палітычных рэпрэсій.

«Публічнае прызнанне газетай прэзідэнцкай адміністрацыі факту знішчэння нявінных людзей у Курапатах сёння выглядае як вярхоўная санкцыя, — пракаментаваў падзею для «НЧ» Ігар Кузняцоў. — Яно дае магчымасць грамадскім арганізацыям паслядоўна рабіць наступныя крокі. Па-першае, звяртацца ў КДБ пра адкрыццё доступу да звязаных з рэпрэсіямі дакументаў (спраў, пастаноў, даведак па выкананні прысудаў) і пра ўдакладненне спісаў пакараных, а пры магчымасці — катаў. Да Савету Міністраў мусіць быць накіраваны запыт з нагоды выканання ўласнай пастановы, прынятай яшчэ 18 студзеня 1989 года «Пра ўвекапомненне ахвяр масавых рэпрэсій 1937–1941 гг. у лясным масіве Курапаты», што складалася з пяці пунктаў. Ніводны з іх за 20 гадоў цалкам не ўвасобіўся ў жыццё. Замест помніка ва ўрочышчы з'явілася толькі шыльда са спавяшчэннем пра намер яго пабудаваць, конкурс спыніўся на першым этапе, сродкі на ўпарадкаванне тэрыторыі і фінансаванне работ завіслі ў паветры, рабочая група па вывучэнні прычын і наступстваў масавых рэпрэсій, створаная пры Інстытуце гісторыі НАН, не дзейнічае, энцыклапедычнае выданне з мэтай ушанавання памяці закатаваных і забітых так і не падрыхтавана. Фактычна, дзяржава не выканала ўзятыя на сябе абавязкі».

З'яўленне матэрыялаў у «СБ», аднак, не зняло многіх балючых пытанняў, а некаторыя заблытала. Далёка не ўсе рэпрэсаваныя рэабілітаваны — даследчыкі мяркуюць, што гэтыя страшныя лічбы суадносяцца як прыблізна 650 і 180 тысяч. Застаецца неабходнасць аднаўлення імёнаў ахвяр.

Што датычыцца Курапат, то дагэтуль дакументальна названыя толькі два празвішчы палеглых: беларускія дакументы, у адрозненне ад архіваў расійскага ФСБ, застаюцца закрытымі. І сімвалам прымірэння паміж ахвярамі і катамі Курапаты ніколі не зробіцца хоць бы таму, што нават рэпрэсаваных «сталінскіх сокалаў» ніколі не расстрэльвалі разам з «простым людам». Па словах даследчыка сталінскіх рэпрэсій у Беларусі Леаніда Маракова, прысуд да большасці асуджаных на смерць супрацоўнікаў НКУС (а нядаўняе юбілейнае выданне «Щит и меч Отечества» называе па ўсім СССР іх лічбу ў 20 тысяч) прыводзіўся ў выкананне ў Маскве.

Курапаты могуць паслужыць мемарыялам толькі для мірных грамадзян, і напачатку — сімвалам больш чым 100 месцаў у 48 населеных пунктах Беларусі, дзе ў сталінскія часы масава знішчаліся людзі. Месцаў, дагэтуль не прызнаных дзяржавай. Толькі ў Мінску масавых катоўняў пад адкрытым небам налічваецца каля дзесяці — у Драздах, Парку Чалюскінцаў, Трасцянцы…

У Драздах ляжаць каля 10 тысяч расстраляных немцамі савецкіх ваеннапалонных, якіх афіцыйная гісторыя таксама не рэабілітавала, дагэтуль трактуючы як здраднікаў. Пакуль не ўдакладнена колькасць ахвяр савецкіх рэпрэсій у Трасцянцы, а канцэпцыя нядаўна завершанага конкурсу па мемарыялізацыі гэтага месца апошняга спачыну 200 тысяч закатаваных сталіністамі і фашыстамі па-ранейшаму разглядае яго толькі як канцлагер часоў апошняй вайны. Трасцянец варты асобнай гаворкі, якую ўдзельнікі «круглага стала» прапанавалі правесці ў снежні бягучага года.

Калі публікацыя ў «СБ» не з'яўляецца толькі дэкларатыўнай дэманстрацыяй жадання сказаць праўду пра жудасныя старонкі гісторыі, наступнымі крокамі мусяць быць публікацыя звестак пра іншыя месцы масавых пахаванняў і пачатак пошуку імёнаў расстраляных. А зрабіць гэта будзе няпроста.

Як засведчыў падчас дыскусіі археолаг, кандыдат гістарычных навук Андрэй Мяцельскі, нават апошняе даследаванне Курапат у 1997 годзе гісторыкамі НАН, супрацоўнікамі пракуратуры, КДБ і грамадскасці, па выніках якой была прынята аднагалосная выснова пра тое, што расстрэлы — справа рук НКВД, не атрымала адпаведнай публічнасці. Мяцельскаму давялося бачыць ліст з Генпракуратуры ў Адміністрацыю прэзідэнта з прапановай «матэрыялы следства не абнародаваць і да ведама грамадскасці не даводзіць».

З другога боку, КДБ у Беларусі не толькі працягвае абмяжоўваць доступ да расстрэльных спраў, але і ў тых нешматлікіх дакументах, што трапілі ў рукі незалежных экспертаў, апошнія старонкі па выкананні прысудаў звычайна адсутнічаюць. Без іх нашчадкі забітых не даведаюцца пра месца іх апошняга спачыну. Застаецца спадзявацца, што дублікаты пакуль яшчэ ацалелі ў Маскве.

Народны мемарыял-некропаль з усталяваных ва ўрочышчы вялікіх і малых памятных крыжоў, варта, на думку старшыні грамадскага аб'яднання «Хрысціянская злучнасць «Курапаты» Вацлава Нямковіча, захаваць такім, якім ён утварыўся. Дзяржава спазнілася з яго комплексным упарадкаваннем — магчыма, з яе боку дастаткова будзе дадаць невялікі помнік там, дзе з 1989 года сіратліва вісіць афіцыйная шыльда. Паклапаціцца пра фінансаванне невялікай капліцы ва ўрочышчы, а за яго межамі — падумаць пра стварэнне музея. А грамадскасці неабходна тэрмінова вырашыць справу надання ўзведзеным там знакам статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Пакуль дзяржаўныя ахоўныя гарантыі пашыраюцца толькі на зямлю ўрочышча і прылеглую да яго тэрыторыю.

АПЫТАННЕ

# АД КРЫЗІСУ ДА НЯНАВІСЦІ — АДЗІН КРОК

Вольга ХВОІН

**Беларусы падчас эканамічнага крызісу сталі больш злымі, перасталі верыць дзяржаве і спадзяюцца на тое, што «ўсё само сабой вырашыцца».**



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Надзея Яфімава

Такія вынікі апытанняў фокус-групаў, праведзеных у рамках праекту Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў «Развіццё грамадскага дыялогу пра сацыяльна-эканамічныя і палітычныя альтэрнатывы». Даследаванне на працягу кастрычніка — лістапада праводзіла аксіёметрычная лабараторыя «Новак» на тэму таго, як успрымаюць эканамічны крызіс у Беларусі.

Настроі ацэньвалі сярод работнікаў буйных прадпрыемстваў, бюджэтнікаў, студэнтаў. Выявілася, што кожны з прадстаўнікоў гэтых сацыяльных груп па-рознаму ацэньвае крызіс. Найбольш пацярпелі работнікі буйных прадпрыемстваў. Яны лічаць, што сітуацыя з дабрабытам радыкальна змянілася ў горшы бок. Прычым пачаткам эканамічнага спаду яны лічаць чэрвень-ліпень гэтага года. Наступствы крызісу праявіліся ў скарачэнні працоўнага часу, заробкаў, аб'ёмаў вытворчасці, а таксама росце цэн і ў вялікай разбежцы паміж выдаткамі і прыбыткамі. Свой маральны стан работнікі прадпрыемстваў ацэньваюць словамі «трывожна», «страшна», «неспакойна». Да таго ж, гэтая фокус-група заявіла, што дзяржаўнай стратэгіяй з'яўляецца не падтрымка, а змяншэнне сацыяльных абавязальніцтваў перад насельніцтвам. Таму дапамогі рабочыя чакаюць ад сваіх родных і знаёмых, а не ад дзяржаўных інстытутаў. Цікавы факт: беларусы ва ўмовах крызісу не супраць скарыстацца сувязямі і знаёмствамі для пошуку новага месца працы, але асуджаюць за гэта іншых.

Даследаванне другой фокус-групы — «бюджэтнікаў» — паказала, што ў гэтай сферы эканамічны крызіс мае пастаянны характар, «проста цяпер пра гэта загаварылі». Супрацоўнікі бюджэтнай сферы бачаць сябе не як асобную групу, а як частку агульнага ланцужка: пагоршыўся стан спраў у рэальным сектары, горш стала жыць і ім.

Для студэнтаў фінансава-эканамічны крызіс пакуль носіць адасоблены характар. То бок маладыя людзі разважаюць пра гэту з'яву як пра нешта абстрактнае, паколькі наўпрост не сутыкнуліся са скарачэннем прыбыткаў.

Сацыёлаг Надзея Яфімава звяртае ўвагу, што пагаршэнне эканамічнага стану спараджае атамізаванасць і сацыяльную раз'яднанасць. Беларусы ўсё часцей успрымаюць адзін аднаго як канкурэнтаў на рынку працы. Крызіс выклікае адчуванне страху і непакою за ўласную будучыню. Песімізм узмацняецца яшчэ і тым фактам, што суайчыннікі панабіралі крэдытаў і цяпер баяцца застацца без якой-кольвек працы. Гэта прымушае трымацца за месца, нават калі там мала плацяць.

Эканамічны крызіс многія эксперты называюць своеасаблівай пляцоўкай для новага старту, але ў Беларусі ён не з'яўляецца штуршком для актывізацыі прыватнай ініцыятывы, прадпрымальніцкай дзейнасці. Надзея Яфімава лічыць, што перашкодай для вялікай часткі насельніцтва ёсць своеасаблівая «прышчэпка» 1990-х гадоў, калі паслякрызісная прадпрымальніцкая дзейнасць для большасці не стала крыніцай доўгачаканага росту дабрабыту. Увогуле, перыяд 1990-х гадоў для пакалення, якое атрымала тагачасны досвед, з'яўляецца базай для параўнання з сучаснай сітуацыяй, а таксама для ацэнак і побытавых прагнозаў.

Кіраўнік Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Віталь Сіліцкі адзначае, што апошнія гады сацыёлагі сутыкнуліся з феноменам «пасткі рэйтынгу», калі ўлада не паспявала за чаканнямі грамадзян, дабрабыт якіх паступова рос. Цяпер сітуацыя адваротная. «Атрымліваецца такі парадокс: для дзяржавы тым лепш, чым горш грамадству. Пералом свядомасці адбыўся настолькі хутка, што мы не чакалі. Чалавек не можа разлічваць на бліжэйшага, бачыць у ім канкурэнта і з-за гэтага «сыходзіць» у сябе. Ёсць рэакцыя пратэсту, а ёсць рэакцыя сыходу на ўзроўні прымітыўнай саматэрапіі. Наша грамадства знаходзіцца ў нейкай віртуальнай рэальнасці, якую сабе стварыла, і спадзяецца, што ўсё развеецца само сабой», — рэзюмуе Віталь Сіліцкі.

На падставе вынікаў фокус-групаў будзе падрыхтавана анкета для нацыянальнага апытання, якое запланавана на канец бягучага — пачатак наступнага года.

САМАКІРАВАННЕ

# ВЯРНУЦЬ МАГДЭБУРГСКАЕ ПРАВА

Марына ЗАГОРСКАЯ

**Гарадку Дзісна, што ў Міёрскім раёне, калісьці даравалі прывілеі Усяслаў Чарадзей, Жыгімонт Аўгуст і Стэфан Баторый. Цяпер мясцовыя жыхары — а іх усяго каля 2,5 тысяч — не чакаюць літасцяў ад улады. Яны разлічваюць на сябе. Самаму маленькаму беларускаму гораду дапамагае выжываць уласная стратэгія ўстойлівага развіцця.**



Колькі гадоў таму на міжнароднай турыстычнай выставе ў шведскім Гётэбаргу на вачах у здзіўленай публікі шведскія, латвійскія і беларускія мастакі малявалі на велізарным палатне дзесяткі карцін адначасова. На пытанне, што яны робяць, адказвалі: «Размалёўваем белую пляму на карце гісторыі». Так у далёкай Швецыі даведаліся пра беларускую Дзісну, дзе па старых традыцыях і з размахам святкуюць яблычны і мядовы спас, вараць сапраўдны беларускі эль і прадаюць на рынку выключнае па смаку сметанковае масла.

У 1986 годзе, калі збіраліся будаваць Даўгаўпілскую ГЭС, самаму маленькаму гораду ў Савецкім Саюзе было наканавана на дзве трацiны сысці пад ваду. Добра, што праект так і не быў рэалізаваны. А некалькі гадоў таму з-за недастатковай колькасці жыхароў статус Дзісны ледзь не панізілі да гарадскога пасёлка. Але мэрыя і дэпутаты мясцовага савета заявілі: «Давайце тады рэферэндум праводзіць!» На гэта спатрэбіліся б велізарныя грошы. І раённыя ўлады адступілі. Дзісна засталася горадам.

А калі тутэйшыя нешматлікія прамысловыя прадпрыемствы прыйшлі ў заняпад, ініцыятыўныя мясцовыя жыхары ўсяго за два гады стварылі Стратэгію ўстойлівага развіцця Дзісенскага краю да 2020 года на аснове турызму. Калі пераказаць гэты сур'ёзны дакумент у трох сказах, то гучыць ён так: «У нас няма прамысловасці, няма чыгункі, але ёсць багатая гісторыя, прыгожая прырода і гасцінныя людзі. Адзіны шлях для адраджэння нашага краю — гэта турызм. Наш брэнд: Дзісна — самы маленькі горад Беларусі».

Дзісенскі край пачаў «прасоўваць» сябе на выставах і фэстах. На яго звярнулі ўвагу шведскія турыстычныя арганізацыі, якія не ў Мінску і не ў Полацку, а менавіта ў Дзісне адкрылі свой інфармацыйны цэнтр.

Зараз мэру Дзісны Вользе Мароз часцяком даводзіцца праводзіць экскурсіі па драўляным мосце стогадовай даўнасці і вулачках, пазначаных яшчэ на картах XVI стагоддзя. Вулачкі спускаюцца да Заходняй Дзвіны. Па водах гэтай магістралі хадзілі калісьці на сваіх шнэках і ладдзях вікінгі — лепшыя ваяры і гандляры таго часу. Гэта быў залаты век для горада. Разам з гербам — ладдзёй пад белымі ветразямі на срэбных хвалях на фоне блакітнага неба — Дзісна атрымала тады Магдэбургскае права. Такога кшталту прывілей дазваляў абіраць гарадскую раду, развіваць рамёствы, варыць піва і арганізоўваць кірмашы, прыбыткі ад якіх ішоў у гарадскую казну.

Так што няпраўда, нібыта палітыка дэцэнтралізацыі, якую актыўна прапагандуе камітэт рэгіёнаў Еўрасаюза, для Беларусі — з'ява нязвыклая. Многія гарады на тэрыторыі нашай краіны жылі па прынцыпу мясцовага самакіравання яшчэ ў сярэдневеччы. Бяспраўнай правінцыяй яны сталі толькі пасля таго, як Беларусь адышла да Расійскай імперыі, а да заняпаду дайшлі пад кіраўніцтвам саветаў, якія і цяпер «заводзяцца» па ўказцы зверху.

## Нашто Беларусі мясцовыя павесткі

Дырэктар Міжнароднага гуманітарна-асветніцкага фонду «Жывое партнёрства» Алег Сіваграказ лічыць, што ў рамках развіцця мясцовага самакіравання ў Беларусі і цяпер варта было б увесці своеасаблівае Магдэбургскае права — перадаць многія кампетэнцыі рэспубліканскіх органаў на нізавы ўзровень.

«Гісторыя ведае прыклады, калі гарады ў выключныя моманты атрымлівалі розныя прэферэнцыі. Так, напрыклад, Быхаў пасля моцнага разбурэння быў вызвалены ўладамі Вялікага княства Літоўскага ад падаткаў на 20 гадоў. Быў выкарыстаны інструмент, адрозны ад звычайных капіталаўкладанняў у эканоміку горада, — Быхаву далі магчымасць развівацца на льготных умовах», — распавядае эксперт.

Распрацаваная ў Дзісне стратэгія ўстойлівага развіцця называецца мясцовай павесткай — гэта інструмент стратэгічнага (на 10–20 гадоў) планавання жыцця рэгіёна з улікам эканамічных, сацыяльных і экалагічных аспектаў развіцця, а таксама інтарэсаў усіх чальцоў мясцовай супольнасці, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі стратэгіі. У Беларусі першыя такія павесткі з'явіліся ў 1999 годзе.

«На практыцы для стварэння мясцовай павесткі спачатку фармуецца вобраз жаданай, ідэальнай будучыні пэўнай тэрыторыі з улікам абмежаванняў, звязаных з прыродным асяроддзем, паводле прынцыпу спалучэння сацыяльна-эканамічнага і экалагічнага ў развіцці, а таксама арыентацыі на мясцовыя рэсурсы і партнёрства ўладаў і мясцовай супольнасці», — тлумачыць Алег Сіваграказ.

Змест мясцовай павесткі залежыць ад канкрэтнага населенага пункта. У буйных гарадах акцэнт часта робіцца на рашэнні экалагічных праблем або развіцці прадпрымальніцтва. У сельскай мясцовасці — на развіцці агра- і экатурызму.

З пачатку 2009 года ў Беларусі дзейнічае праект Праграмы ААН «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні». А сам працэс падтрымкі мясцовых павестак у Беларусі грунтуецца на Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця на перыяд да 2020 года. Яна вызначае, што вядучую ролю ва ўстойлівым рэгіянальным развіцці павінны адыгрываць мясцовыя ўлады. «Ініцыятыўная група можа пачаць рэалізацыю мясцовай павесткі і без падтрымкі ўладаў, але калі ўлада потым не далучаецца — гэта непаўнавартасны працэс. Зрэшты, і ва ўлады без супрацоўніцтва з мясцовай супольнасцю нічога не атрымаецца», — падкрэслівае кіраўнік Праграмы падтрымкі Беларусі Федэральнага ўрада Германіі Астрыд Зам.

Пытанне ў прыярытэтах, якія вызначае для сябе ўлада на месцах. «Мэр маленькага амерыканскага пасёлка сказаў мне: «Галоўнае для мяне — умець слухаць сваіх падаткаплатнікаў і размаўляць з імі», — распавядае Алег Сіваграказ. — У Беларусі ж ва ўмовах слаба развітага мясцовага самакіравання склалася ўнікальная сітуацыя. На месцах прызвычаіліся да дзяржаўнага планавання, дзе ёсць валавыя паказчыкі, якія даводзяцца зверху. Хоць у развітых эканоміках даўно адышлі ад выключна эканамічных паказчыкаў».

Як сведчыць сусветная практыка, аднабокая нацэленасць на эканамічнае развіццё не дапамагае выцягнуць рэгіён, таму што на месцах, у пэўных мясцовых супольнасцях людзі не толькі зарабляюць грошы. Яны там жывуць, у іх ёсць асабістыя планы і інтарэсы.

З іншага боку, у мясцовых органаў улады ў Беларусі вельмі мала фінансавых рэсурсаў, якімі яны рэальна могуць распараджацца. А чыноўнікі з міністэрстваў і ведамстваў нярэдка заяўляюць, што сельскім або малым гарадскім саветам наогул не варта давяраць фінансавыя сродкі, паколькі на месцах няма кваліфікаваных кадраў і грошы папросту «разбазараць». Але, як сцвярджаюць міжнародныя эксперты, слабыя кадры і ўтрыманства якраз і ёсць вынік звышцэнтралізацыі, калі мясцовае самакіраванне не зацікаўлена зарабляць грошы, паколькі гэта адразу зніжае паступленні ў бюджэту.

Зрэшты, у Беларусі, дзе страчаны досвед уцягвання людзей у стратэгічныя пытанні планавання, часцяком на месцах не выкарыстоўваецца нават такі «бясплатны» рэсурс, як чалавечы патэнцыял.

Алег Сіваграказ сцвярджае: «Мясцовая павестка ў такіх умовах становіцца школай мясцовага самакіравання і адной з прыладаў, што спрые яго развіццю. На прыкладзе невялікіх праектаў аднаўляецца разуменне таго, што голас мясцовай супольнасці павінен быць пачуты».

Астрыд Зам адзначае досыць вялікую цікавасць «нізоў» да ідэі мясцовых павестак. «Праграма падтрымкі Беларусі Федэральнага ўрада Германіі толькі рэагуе на гэты попыт, але не стварае яго», — падкрэслівае кіраўнік праграмы.

Цяпер у краіне дзейнічае каля пяцідзесяці мясцовых павестак. Да гэтай формы супрацоўніцтва з насельніцтвам улады ставяцца пакуль з пэўнай насцярогай. Хоць мясцовая павестка — гэта яшчэ і добрая магчымасць для прыцягнення донарскіх сродкаў. Напрыклад, аб'ём знешняга фінансавання Дзісны больш, чым увесь бюджэт самага маленькага горада краіны.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

# ЧЫНОЎНЫЯ ЗЛОДЗЕІ

**За гады сваёй навуковай дзейнасці мне ўдалося выключна ўласнымі высілкамі і на асабістыя сродкі надрукаваць каля двух дзесяткаў манаграфій і дакументальных зборнікаў. Таму ў мяне заўжды выклікалі агіду кар'ера за чужы кошт і нахабнае прысваенне працы падначаленых.**

Напачатку 2007 года пры працаўладкаванні ў аддзел публікацый Нацыянальнага гістарычнага архіва мне было публічна даручана дырэктарам А. К. Галубовічам узначаліць калектыў па напісанню зборніка «Віцебская губерня. 1802–1917». Мяне афіцыйна зацвердзілі складальнікам і навуковым рэдактарам зборніка, а тэхнічную падрыхтоўку тэксту да выдання аддалі загадчыку аддзела публікацый З. Яцкевічу. Галоўным складальнікам гэтага праекта на той момант з'яўлялася былая супрацоўніца архіва Т. Е. Лявонцева. Ёю было напісана больш за 70 працэнтаў матэрыялаў зборніка, праўда, не на аснове архіўных першакрыніц, а па знакамітаму Поўнаму збору законаў Расійскай імперыі. Сваю працу яна выканала скрупулёзна і сумленна.

З яе асабістага дазволу мне выпала карэкціраваць і правіць атрыманы ад яе тэкст і дабавіць да яго новыя артыкулы ў маім асабістым выкананні і пры ўдзеле чатырох іншых калег (З. Антановіч, Я. Насытка, Дз. Лісейчыкава і А. Лютарэвіч). Мною былі напісаны ўводзіны. У такім выкананні тэкст зборніка быў ухвалены двума рэцэнзентамі і ў лістападзе 2008 года быў рэкамендаваны да друку Вучонай Радай архіва.

І вось зборнік пабачыў свет, аднак, насуперак рашэнню той Рады, я не значуся ні ў якасці складальніка, ні яго навуковага рэдактара. Насуперак пастановы Рады, аўтарам прадмовы фігуруе ўжо дырэктар архіва, а ў якасці яго складальніка запісаны загадчык аддзела публікацый. Па-сутнасці, яго кіраўніцтва зводзілася да таго, што ён разоў па 20 на дзень заглядваў у дзверы і сачыў, чым займаюцца падначаленыя. Насуперак рашэнню Вучонай Рады, без усякага папярэджвання, у склад аўтараў былі запісаны два супрацоўнікі, якія не напісалі ніводнага радка ў рэкамендаваным Радай тэксце.

Годнасці і недахопы толькі што выдадзенага зборніка, як звычайна, ацэняць спецыялісты, а не толькі афіцыйныя рэцэнзенты. Мне, натуральна, не выпадае пераказваць тэкст або прадузята каменціраваць яго. Але мне стала брыдка трымаць у руках твор, пісаны і перапісаны мной ад пачатку да канца, складанне якога прысвоілі чыноўныя людзі толькі таму, што скарысталіся сваім службовым становішчам.

**Яўген Анішчанка, кандыдат гістарычных навук**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 30 ЛІСТАПАДА, ПАНЯДЗЕЛАК

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** У свеце матораў.
**09.10** Nota Bene.
**09.40** «Зорныя танцы». «Жаночы сезон».
**11.00** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**12.10** Дэтэктыў «Мім Бім, або Чужое жыццё» (Украіна).
**14.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Я веру толькі серыялам».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** «Культурныя людзі».
**15.55** Здароўе.
**16.25** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.25** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.25** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**18.50, 00.20** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.50** Адмысловы рэпартаж АТН «12+1».
**22.05** Драматычны серыял «Часткі цела».
**00.25** Дзень спорту.
**00.40** Хакей для ўсіх.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** АНТ прадстаўляе: «Рэкламная паўза».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Ералаш.
**16.45** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Мая выдатная няня». 2004 год.
**18.55** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Выбар».
**22.15** «Марскі патруль-2». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**23.20** Нашы навіны.
**23.35** Навіны спорту.
**23.40** «Злачынствы стагоддзя».
**00.15** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.45** «Без розуму ад цябе». Шматсер. фільм.
**01.35** Нашы навіны.
**01.50** Навіны спорту.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Меншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Зорны рынг».
**15.05** «Далёкія сваякі».
**15.30** «Гарачы лёд».
**16.00** «Культурнае жыццё» з Аляксандрам Ефрэмавым.
**16.50** «Я - вандроўца».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Меншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Кінапанядзелак»: «Свае дзеці». Расія.
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Сталічны футбол».
**23.30** «Гучная справа».
**00.25** «Халасцякі». Серыял.

---

**07.00** Добрая раніца.
**08.00** Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Меладрама «Арфа для каханай».
**12.00** «Пра мастацтва».
**12.30** Школа рамонту.
**13.20** Мультфільм.
**13.35** Мультсерыял «Доктар Дог».
**14.10** «Жадаю ўсё ведаць». Кіначасопіс.
**14.25** Пазакласная гадзіна.
**14.40** Бухта капітанаў.
**15.20** Тэлебарометр.
**15.35** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Дэтэктыў «Залатая міна». 1-я серыя.
**20.40** «Калыханка».
**20.55** Беларуская часіна.
**22.00** Хакей. Формула гульні.
**22.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**23.30** Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
**00.00** Серыял «На рагу ў Патрыяршых-3».

---

РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Карней Чукоўскі. Забароненыя казкі». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Ранішняя пошта з Ларысай Грыбалёвай».
**12.00** Вія Артманэ, Леанід Кулагін у дэтэктыве «Следствам устаноўлена».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**15.25** Фільм «Прыехалі на конкурс кухара...».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** Прэм'ера. «Карміліта. Цыганскія страсці». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.30** Руская серыя. «Вольф Месінг: Той, хто бачыў скрозь час».
**22.30** Тэлесерыял «Вядзьмарскае каханне».
**23.30** «Нічога асабістага».
**23.45** Навіны - Беларусь.
**23.55** «Весткі+».
**00.15** «Мой срэбны шар. Галіна Польскіх».

---

НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.40** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**09.10** «Руская сенсацыі».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**11.15** «Кулінарны паядынак».
**12.10** «Следства вялі».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Закон і парадак».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Прэм'ера. Дэтэктыўная меладрама «Генеральская ўнучка».
**21.50** Крымінальны серыял «Гадзіна Волкава».
**23.00** Сёння.
**23.25** «Сумленны панядзелак».
**00.20** «Калекцыя дурасцяў Максіма Кананенкі».
**00.50** «Школа зласлоўя».

---

EUROSPORT

**09.35** Горныя лыжы. Кубак свету ў ЗША (Аспен). Жанчыны. Слалам. 2-я спроба.
**10.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Канадзе (Лейк-Луіс). Мужчыны. Супергігант.
**11.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куусама). HS 142.
**12.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Фінляндыі. Жанчыны. 10 км класічным стылем.
**13.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Фінляндыі (Куусама). Мужчыны. 15 км класічным стылем.
**14.45** Лыжнае дваяборства. Кубак свету ў Фінляндыі. Гонка па сістэме Гундэрсена.
**15.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куусама). HS 142.
**17.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету ў Паўднёвай Карэі. Мужчыны. 105 кг.
**18.00** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету ў Паўднёвай Карэі. Мужчыны. +105 кг.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**21.15** Футбол. Еўрагалы. Андрэй Шаўчэнка.
**21.35** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**22.15** Пра рэстлінг. Vintage Collection.
**23.15** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**00.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куусама). HS 142.
**01.45** Лыжнае дваяборства. Кубак свету ў Фінляндыі. Гонка па сістэме Гундэрсена.

---

БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** Дакументальная гадзіна: «Баравічок», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**19.55** На колах.
**20.25** Госць «Белсату».
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Беларусы ў Грунвальдскай бітве».
**21.30** «Цемна-сіні, амаль чорны», маст. фільм, рэж. Даніель Санчэс Арэвале.
**23.10** Аб'ектыў.

## 1 СНЕЖНЯ, АЎТОРАК

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.05** Вострасюжэтны серыял «Шлюб па завяшчанні» (Расія), заключная серыя.
**10.00** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Адмысловы рэпартаж АТН «12+1».
**12.10** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША- Вялікабрытанія).
**13.10** Серыялерыял «Вераніка Марс-3».
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Беларускі fashion. Galeries Royales: на боку караля».
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Турэцкага» (Расія).
**16.45** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Вострасюжэтны серыял «Блудныя дзеці» (Расія). 1-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.50** Драматычны серыял «Часткі цела».
**00.15** Дзень спорту.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.05** Тэорыя неверагоднасці.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Мая выдатная няня». 2004 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Афіцэры». Шматсер. фільм.
**22.20** Прэм'ера. «Непераможны».
**23.25** Нашы навіны.
**23.40** Навіны спорту.
**23.45** «Зваротны адлік».
**00.20** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.45** «Без розуму ад цябе». Шматсер. фільм.
**01.10** Нашы навіны.
**01.25** Навіны спорту.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Меншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Кіно»: «Свае дзеці». Расія, 2007 г.
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавела.
**11.45** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Крокі да поспеху» з Алінай Кабаевай.
**14.40** «Элен і хлопцы. Лепшыя серыі». Моладзевы серыял.
**15.35** «Top Gear. Руская версія».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Меншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.55** Прэм'ера! «Правілы ўгону». Серыял.
**22.00** СТБ прадстаўляе: «З чаго пачынаецца Радзіма». Фільм дзевяты «Землякі».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Надзвычайныя гісторыі».
**23.55** «Халасцякі». Серыял.
**00.40** «Рэдакцыя». Серыял.

---

**07.00** Добрая раніца.
**08.00** Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Дэтэктыў «Залатая міна». 1-я серыя.
**11.40** «Страсці па культуры» з Генадзем Давыдзько.
**12.20** Хакей. Формула гульні.
**12.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**13.40** Кінапробы.
**14.05** Мультсерыял «Доктар Дог» (Францыя).
**14.30** «Жадаю ўсё ведаць». Кіначасопіс.
**14.40** Пазакласная гадзіна.
**15.00** Свая кампанія.
**15.35** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Дэтэктыў «Залатая міна». 2-я серыя.
**20.45** Калыханка.
**21.00** Беларуская часіна.
**22.05** Спорт-кадр.
**22.35** Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
**23.05** Баскетбол.
**00.45** Серыял «На рагу ў Патрыяршых-3».

---

РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** «Аднойчы будзе каханне». Расія.
**10.10** «Бомба для спевака. Уладзімір Мігуля». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага».
**11.45** «Восеньскі дэтэктыў».
**13.25** «Гарадок». Дайджэст.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Вядзьмарскае каханне».
**15.20** «Вольф Месінг: той, хто бачыў скрозь час». Расія, 2009 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** «Карміліта. Цыганскія страсці». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** «Аднойчы будзе каханне». Расія.
**20.30** «Вольф Месінг: той, хто бачыў скрозь час».
**22.30** «Вядзьмарскае каханне».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Весткі+».
**00.00** «Ты - феномен! За гранню магчымага». Дакументальны фільм.

---

НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.40** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**09.10** «Сеанс з Кашпіроўскім».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**11.10** «Кватэрнае пытанне».
**12.10** «Савецкія біяграфіі» Міхаіл Фрунзе.
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Закон і парадак».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Прэм'ера. Дэтэктыўная меладрама «Генеральская ўнучка».
**21.50** Прэм'ера. Крымінальны серыял «Гадзіна Волкава».
**23.00** Сёння.
**23.25** «Вочная стаўка».
**00.15** «Фатальны дзень». Ахвяры глянцу.

---

EUROSPORT

**09.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куусама). HS 142.
**10.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**11.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Фінляндыі (Куусама). Жанчыны. 10 км класічным стылем.
**12.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Фінляндыі (Куусама). Мужчыны. 15 км класічным стылем.
**13.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куусама). HS 142.
**14.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**15.30** Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат свету ў Паўднёвай Карэі. Мужчыны. +105 кг.
**16.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**18.00** Настольны тэніс. Суперкубак Еўропы ў Расіі (Санкт-Пецярбург). Дзень 1-ы. Прамая трансляцыя.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Ралі. Мэта - Дакар. Часопіс.
**20.25** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**21.10** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі WBC у Канадзе. Паўцяжкая вагавая катэгорыя.
**22.00** Бокс. Паядынак за тытул чэмпіёна свету па версіі WBA у Германіі. Цяжкая вагавая катэгорыя. .
**00.00** Экстрэмальны спорт. «Freeride Spirit».
**00.20** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**00.30** Лодкавы спорт. Чэмпіянат свету. Клас Р1. Агляд сезону.
**01.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.

---

БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** Макрафон: XIV Фестываль песенный паэзіі і аўтарскай песні «Бардаўская восень-2007»: выступ Віктара Шалкевіча.
**19.40** Тыдзень з радыё «Свабода».
**20.10** Акно ў Еўропу.
**20.40** Асабісты капітал.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Канстанцін Астрожскі і бітва пад Оршай».
**21.30** Блізкая гісторыя: іншы погляд: «Казка», дак. фільм, 2005 г., Польшча-Расія.
**21.55** Героі не нашага часу: Дынастыя. Гісторыя кахання. Людміла, Ларыса, Леаніда Фёдараўна...
**22.15** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**22.30** Маю правa (праваая праграма).
**22.45** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 2 СНЕЖНЯ, СЕРАДА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05** Вострасюжэтны серыял «Блудныя дзеці» (Расія). 1-я серыя.
**09.55** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.35** Алімпійскі часопіс.
**12.10** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША-Вялікабрытанія).
**13.10** Серыял «Вераніка Марс-3» (ЗША).
**14.05** Альманах вандраванняў.
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Беларускі fashion. Галерэя Kaufhof».
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Турэцкага» (Расія).
**16.45** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 23.55** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** «Зямельнае пытанне».
**19.55** Футбол. Ліга Еўропы. БАТЭ-Бенфіка. Прамая трансляцыя. У перапынку: 20.45 «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**22.00** Панарама.
**22.50** Драматычны серыял «Часткі цела».
**00.05** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.00** «Афіцэры». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Мая выдатная няня». 2004 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Афіцэры». Шматсер. фільм.
**22.20** Прэм'ера. «Непераможны».
**23.25** Нашы навіны.
**23.40** Навіны спорту.
**23.45** АНТ прадстаўляе: «Дакументальны дэтэктыў». «Адзінкавы налёт».
**00.20** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.45** «Без розуму ад цябе». Шматсер.фільм.
**01.10** Нашы навіны.
**01.25** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Рэдакцыя». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавела.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Ваенная таямніца».
**14.40** «Элен і хлопцы. Лепшыя серыі». Моладзевы серыял.
**15.35** «Правілы ўгону». Серыял.
**16.50** «Новыя вандраванні дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Калі ласка, скардзіцеся».
**20.55** Прэм'ера! «Правілы ўгону». Серыял.
**22.00** «Мінск і мінчукі».
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**23.55** «Халасцякі». Серыял.
**00.40** «Рэдакцыя». Серыял.

**07.00** Добрая раніца.
**08.00** Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Дэтэктыў «Залатая міна». 2-я серыя.
**11.45** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.30** Спорт-кадр.
**12.55** Док.фільм «Вожык - абаронца садоў».
**13.55** Мультсерыял «Доктар Дог».
**14.10** «Жадаю ўсё ведаць». Кіначасопіс.
**14.20** Пазакласная гадзіна.
**14.35** «Лабірынты: таямніца воўчынскай крыпты». Фільм другі.
**15.05** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**15.35** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ».
**16.25** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Хакей. КХЛ. Лакаматыў (Яраслаўль) - Дынама (Мінск). У перапынку: «Калыханка».
**21.20** Беларуская часіна.
**22.00** Футбол. Ліга Еўропы. Валенсія - Ліль. Прамая трансляцыя.
**00.00** Біятлон. Кубак свету. Індывідуальная гонка. Жанчыны.

РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** «Аднойчы будзе каханне». Расія.
**10.10** «Жарты вялікага чалавека. Яўген Маргуноў». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Восеньскі дэтэктыў».
**13.10** «Гарадок». Дайджэст.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Вядзьмарскае каханне».
**15.20** «Вольф Месінг: той, хто бачыў скрозь час». Расія, 2009 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** «Кармеліта. Цыганскія страсці». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** «Аднойчы будзе каханне». Расія.
**20.30** «Вольф Месінг: той, хто бачыў скрозь час».
**22.30** «Вядзьмарскае каханне».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Весткі+».
**00.00** Дакументальны фільм.
**00.55** Заканчэнне эфіру.

НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.40** «Выратавальнікі».
**09.10** «Вочная стаўка».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**11.10** «Дачны адказ».
**12.10** «Алтар Перамогі». Кацюша.
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Прэм'ера. Дэтэктыўная меладрама «Генеральская ўнучка».
**21.50** Прэм'ера. Крымінальны серыял «Гадзіна Волкава».
**23.00** Сёння.
**23.25** «І зноў добры дзень!».
**00.15** «Першая кроў».

EUROSPORT

**09.30** Экстрэмальны спорт. «Freeride Spirit».
**09.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Фінляндыі. Жанчыны. 10 км класічным стылем.
**11.30** Лыжнае двааборства. Кубак свету ў Фінляндыі. Гонка па сістэме Гундэрсена.
**12.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куусама). HS 142.
**13.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**15.00** Настольны тэніс. Суперкубак Еўропы ў Расіі (Санкт-Пецярбург). Дзень 1-ы.
**16.00** Настольны тэніс. Суперкубак Еўропы ў Расіі. Дзень 2-ы. Прамая трансляцыя.
**18.00** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Астерсунд). Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы. Прамая трансляцыя.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** «Формула-1». Часопіс.
**21.15** Абранае па серадах.
**21.20** Пола. Адкрыты чэмпіянат (Аргенціна).
**22.15** Навіны коннага спорту.
**22.20** Конны спорт. Агляд сезону.
**23.15** Гольф-клуб.
**23.20** Яхт-клуб.
**23.30** «Спартовы курорт». Часопіс.
**23.45** «Спартовы вандроўца». Часопіс.
**00.00** «Алімпійскія гульні». Часопіс.
**00.30** «За чыстую планету». Часопіс.
**01.00** Настольны тэніс. Суперкубак Еўропы ў Расіі (Санкт-Пецярбург). Дзень 2-і.
**02.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куусама). HS 142.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** Праект «Будучыня».
**19.35** «Рэвалюцыя: як гэта робіцца», дак. фільм, 2001 г., Галандыя.
**20.30** Рэпарцёр.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Пачатак суперніцтва паміж Вільняй і Масквой».
**21.35** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 35 серыя.
**22.20** Асабісты капітал.
**22.40** Аб'ектыў.

## 3 СНЕЖНЯ, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Зямельнае пытанне».
**09.05** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна). Фільм «Зорныя жаніхі і нявесты».
**10.00** Меладрама «Сёстры па крыві».
**10.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Відэафільм АТН «На Ганцавіцкіх ростанях» цыкла «Зямля беларуская».
**12.10** Фантастычны серыял «Зорны крэйсер «Галактыка» (ЗША-Вялікабрытанія).
**13.10** Дэтэктыўны серыял «Вераніка Марс-3» (ЗША).
**14.05** Уласны персанал.
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Беларускі fashion. Галерэя Lafayette».
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Турэцкага» (Расія).
**16.45** Меладрама «Сёстры па крыві».
**17.50** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Вострасюжэтны серыял «Блудныя дзеці» (Расія). 2-я серыя.
**21.00** Панарама.
**21.50** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.05** Драматычны вострасюжэтны серыял «Часткі цела» (ЗША).
**00.05** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.00** «Афіцэры». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Дэтэктывы».
**11.50** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Монтэкрыста». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Мая выдатная няня». 2004.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Афіцэры». Шматсер. фільм.
**22.20** Прэм'ера. «Непераможны».
**23.25** Нашы навіны.
**23.40** Навіны спорту.
**23.45** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.40** «Без розуму ад цябе». Шматсер. фільм.
**01.25** Нашы навіны.
**01.40** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Калі ласка, скардзіцеся».
**08.50** «Рэдакцыя». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавела.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.40** «Былая». Серыял.
**13.50** «Дзеці гісторыі».
**14.40** «Элен і хлопцы. Лепшыя серыі». Моладзевы серыял.
**15.35** «Правілы ўгону». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Былая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.55** Прэм'ера! «Правілы ўгону». Серыял.
**22.00** «Асабістая цікавасць» з Паўлам Каранеўскім.
**22.55** «Сталічныя падрабязнасці».
**23.00** «Сакрэтныя гісторыі».
**23.55** «Халасцякі». Серыял.
**00.40** «Рэдакцыя». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Камедыйны серыял «Юрыкі» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.30** Драма «Каліна чырвоная» (СССР).
**12.15** Экспедыцыя.
**12.45** Бітва экстрасэнсаў.
**13.40** Моладзевы серыял «Начныя агні пятніцы» (ЗША).
**14.30** Прэм'ера. Мультсерыял «Доктар Дог» (Францыя). 1-я і 2-я серыі.
**14.55** «Хачу ўсё ведаць». Кіначасопіс для дзяцей (Расія).
**15.10** Пазакласная гадзіна.
**15.25** Жывы гук.
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Камісар Мегрэ» (Францыя-Бельгія-Швейцарыя).
**16.50** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Беларуская часіна.
**19.55** Футбол. Ліга Еўропы. Рома-Фулхэм. Прамая трансляцыя.
**22.00** Футбол. Ліга Еўропы. АЕК-БАТЭ. Прамая трансляцыя.
**00.00** Час футболу.
**00.25** Хакей. Кубак Палесся-2010. Аўстрыя-Беларусь.

РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2009 г.
**10.10** «Папялушка саюзнага значэння. Людміла Сенчына». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Восеньскі дэтэктыў».
**13.10** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Вядзьмарскае каханне».
**15.20** «Вольф Месінг: той, хто бачыў скрозь час». Расія, 2009 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**17.55** «Кармеліта. Цыганскія страсці». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** «Аднойчы будзе каханне». Расія.
**20.30** «Вольф Месінг: той, хто бачыў скрозь час».
**22.30** «Вядзьмарскае каханне».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Весткі+».
**00.00** Прэм'ера. «Далёкаўсходні выход». Фільм 2-і. «Рускі Харбін». Дак. фільм.
**01.00** Заканчэнне эфіру.

НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.40** «Змаганне за ўласнасць».
**09.10** «І зноў добры дзень!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**11.10** «Жаночы погляд». Далорэс Кандрашова.
**12.00** «Прафесія рэпарцёр».
**12.30** «Першая кроў».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Закон і парадак».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Прэм'ера. Дэтэктыўная меладрама «Генеральская ўнучка».
**21.50** Прэм'ера. Крымінальны серыял «Гадзіна Волкава».
**23.00** Сёння.
**23.25** «Галоўны герой прадстаўляе».
**00.15** «Позняя гутарка».

EUROSPORT

**09.30** «Алімпійскія гульні». Часопіс.
**10.00** Лодкавы спорт. Чэмпіянат свету. Клас Р1. Агляд сезону.
**10.30** «Формула-1». Часопіс.
**11.30** Аўтаспорт. Гонкі чэмпіёнаў (Пекін, Кітай).
**12.15** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**12.45** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Астэрсунд). Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы.
**13.45** Настольны тэніс. Суперкубак Еўропы ў Расіі (Санкт-Пецярбург). Дзень 2-і.
**14.45** Фігурнае катанне. Паказальныя выступы ў Германіі.
**16.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**17.00** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Астэрсунд). Жанчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы.
**18.00** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Астэрсунд). Мужчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы. Прамая трансляцыя.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.15** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў (Венгрыя).
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. «Klash/Slamm» (Швейцарыя).
**00.00** Пра рэстлінг. «Vintage Collection». ЗША.
**01.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**01.30** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Астэрсунд). Мужчыны. Індывідуальныя спаборніцтвы.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял: 29 серыя.
**19.35** YoLife! (моладзевая праграма).
**19.55** На колах.
**20.25** Еўрапейскі Саюз без сакрэтаў, 19 серыя: «Еўрасаюз і вайна».
**20.50** «Бульбаны», мультсерыял: «Урок гісторыі».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Афіцэр», дэтэктыўны серыял.
**22.15** Без рэтушы: «Палі і чужынцы», рэж. Уладзімір Міхарскі, 2009 г., Польшча.
**22.40** Аб'ектыў.

# ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №8 (36) (лістапад)

www.litbel.org www. novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»


Анонс


«НАВІНЫ»: асноўныя падзеі літаратурна-грамадскага жыцця лістапада ........ 2

«ПАЭЗІЯ»: новыя вершы Васіля ЗУЁНКА ........ 3

«ПРОЗА»: фрагмент новага гістарычнага рамана Леаніда ДАЙНЕКІ ........ 4–5

«ПРОЗА»: «Размовы са стодзівамі» Алеся ПАПЛАЎСКАГА і «стрэмкі» Вячаслава ДУБІНКІ ........ 6

«ГУТАРКА» з Алесем КАМОЦКІМ ........ 7

«КАЛЕЙДАСКОП»: «Позірк» Уладзіміра СЦЯПАНА; анонс новых кніг; рэклама ........ 8


СЛОВА

# КРЫТЫКАВАЦЬ НЕЛЬГА ПАМІЛАВАЦЬ

**Восень выдалася ў нашым жыцці не толькі часам авітамінозу ды грамадскага шаленства на невядомы грып, распачатага ці то страшылкамі-інфармацыямі ў СМІ, ці то «змовай» фармацэўтаў, ці то некампетэнтнасцю медыкаў.**



Ці — хутчэй за ўсё — беднасцю насельніцтва ды недахопам якаснага харчавання ў гнілы бяссонечны час. Восень стала ў медыйнай прасторы часам завостранай крытыкі — і не толькі міністэрства аховы здароўя ды фармацэўтаў. Пад газетны агонь патрапілі і пісьменнікі, незаслужана і заслужана, за іх грамадскую пазіцыю і творчасць. Вось толькі два паказальныя выпадкі.

Некалі найпаважанае (і тыражнае) выданне творчай інтэлігенцыі «адной шостай часткі зямлі», а сёння сродак спакойнага і бесклапотнага зарабляння грошай на дзяржбюджэтных праектах тыпу «Лад» ды інш., «Литературная газета» ў апошнім сваім кастрычніцкім нумары «ўспомніла» пра трох украінскіх пісьменнікаў. Зазначым напачатку: трох найвядомых ва Украіне творцаў і грамадскіх дзеячаў. Нехта Вадзім Далганаў, кіеўскі (тамтэйшы?) «праўдаруб», у артыкуле «Головомор. Русофобия» палівае гразёй Уладзіміра Яварыўскага (дэпутата і лаўрэата Нацыянальнай прэміі), Дмітра Паўлычку ды Івана Драча (Героя Украіны). А разам з тым — і сучасную нацыянальную палітыку Украіны. «Шумно и весело отпраздновали юбилеи Мазепы и Петлюры... — падшпільвае аўтар «Литературной газеты». — Весь же год проходит под знаменем другого «славного народного героя» — Степана Бандеры, со дня рождения которого прошло аккурат столетие. Все эти даты обозначены праздничными в официальном постановлении Верховной рады. Автор документа — выдающийся «письменник», общественный деятель, а к тому же председатель депутатского комитета по культуре и духовности Владимир Яворивский. Ярый борец за незалежность, против засилья русского языка, активный пропагандист «обновлённой» украинской истории, где среди первых героев — тот же Бандера да эсэсман Шухевич».

Журналісцкі прыём крытыкі «господин» Далганаў выбраў архібанальны: супаставіўшы некатарыя за вушы прыцягнутыя даўнія «факты» — з выказваннямі ды дзеямі цяперашнімі. Маўляў, гэта пярэваратні, якія некалі ўхвалялі ідэі камунізма-ленінізма, а цяпер запісаліся ў нацыянальныя павадыры… Нават нібыта ёсць недзе «…текст давнего письма в адрес председателя КГБ Юрия Андропова и первого секретаря правления СП Георгия Маркова с набором тогдашних штампов, типа «решительно осуждаем», «не может быть прощения замахнувшимся на самое святое — социализм, дружбу между русскими и украинцами»… А послание сие подписали признанные мэтры украинской советской литературы Дмитрий Павлычко, Иван Драч и… всё тот же Яворивский», — «вещает» «Литгазета» вуснамі Далганава. А цяпер жа тыя літаратары (які жах!!!) пішуць… «стихи о страданиях соотечественников под ярмом москалей, яростную публицистику в защиту «героев ОУН–УПА» (бандеровцев то бишь)».

Брава, «Литгазета»! Ці не пачаць захапляцца тваёй мужнасцю ды пільнасцю?! Толькі што — хіба адна згаданая троіца пісьменнікаў, якія жылі ў СССР, прыйшла да нацыянальнай самасвядомасці? Прабачце, а сотні расійскіх літаратараў не тое ж «прарабілі»? Ці іх любоў да Расіі і яе культуры — гэта правільна, а любоў украінскіх творцаў да Украіны і яе культуры — «галавамор»? Толькі ж пра «свае пенаты» газета не піша. Не піша, напрыклад, пра «паравёртышаў»-кіраўнікоў сваёй дзяржавы, якія пры камуністах займалі адказныя пасады, а затым узнялі (і ўздымаюць) над Расіяй «уласаўскі» сцяг. Чым не паралель з бандэраўшчынай? Аднак у сваім воку і бервяно цяжка знайсці, затое ў суседавым і парушынка здалёк відна…

Усё, па-праўдзе, тут зразумела: чарговая зласлівая пена «пакрыўджанага» падмаскоўскага шавініста, «спецзамова», якая насамрэч яшчэ болей узвялічыць «раскрытыкаваных» украінскіх пісьменнікаў у вачах незалежнай Украіны. І не толькі Украіны. Уладзімір Яварыўскі, Дмітро Паўлычка ды Іван Драч — вядомыя творцы і ў Беларусі. Яны — ганаровыя члены Саюза беларускіх пісьменнікаў. Ад імя Рады СБП у іх абарону і з абурэннямі ў адрас рэдакцыі «Литературной газеты» ўжо выказаліся вядомыя беларускія літаратары: Мікола Аўрамчык, Ніл Гілевіч, Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Алесь Пашкевіч, Барыс Пятровіч, Анатоль Вярцінскі, Сяргей Законнікаў, Васіль Зуёнак, Міхась Скобла, Эдуард Акулін ды інш…

А вось крытычны артыкул пра іншага вядомага грамадскага і творчага дзеяча — Мікалая Чаргінца — ці ўзніме папулярнасць ды салідарнасць з ім у літаратурным (і грамадска-палітычным) цэху? Адказ, хутчэй за ўсё, адмоўны. Крытычных матэрыялаў пра кіраўніка новастворанага Саюза пісьменнікаў Беларусі за апошнія месяцы шмат. Чакаецца і вязьмо хвалебных, у дзяржаўныя СМІ прыйшло распараджэнне міністэрства інфармацыі з «прапановай» актыўней папулярызаваць дзейнасць «афіцыйнага» СП… Аднак тое, магчыма, наперадзе. Сёння ж — гаворка пра нашумелы артыкул Вячаслава Дашкевіча «Кто «съест» Лукашенко?» ў «Народнай волі» (10-12 лістапада). Яго аўтар выкарыстоўвае, між іншага, цытаты апошніх па часе выказванняў як ён называе «лучшего, пожалуй, писателя среди милиционеров и лучшего милиционера среди писателей». У адным месцы аўтар крытыкуе Мікалая Чаргінца за ягоны прагноз, — што ў 2009 годзе мы (Беларусь) «будем островком благополучия по сравнению со странами бывшего соцлагеря». Дастаецца на абаранкі «экс-сенатару» і за пабудаваны аграмадны «чудо-коттедж», і за адну з апошніх ягоных кніг «Тайна Овального кабинета» («где самым убедительным персонажем (по частоте упоминания и литературной обрисовке) является… половой орган президента США», а нядаўна, дзівіцца В.Дашкевіч у «Народнай волі», «Н.Чергинца избрали председателем общественной комиссии по этике»…); дастаецца літаратару і за пісьменніцкі Дом адпачынку: «Есть надежда, что соответствующие органы … наконец-то разберутся с неприглядной историей вокруг писательского Дома отдыха «Ислочь» — его куплей-продажей. Насколько выплаченная сумма соответствует истинной стоимости огромного лесного участка и сооружений? Что за фирма-покупатель и кто за ней стоит?». «Надеемся, — звяртаецца Вячаслаў Дашкевіч, — уважаемый Николай Иванович, что вы как бывший председатель ОО «Беллитфонд», в ведении которого была «Ислочь», и как нынешний председатель Союза писателей Беларуси окажете главе Администрации президента, а возможно, и следственным органам всяческую помощь». Дастаецца М.Чарнінцу і за Акадэмію праблем бяспекі, абароны і правапарадку, ліквідаваную Генпракуратурай Расіі («вице-президентом этой шарашкиной конторы являлся не кто иной, как уважаемый Н.Чергинец»); дастаецца і за нейкія «правакацыі» («Защищать без всякой на то нужды мальчика Колю»), і за вымогі пачуць праз 15 гадоў імя яшчэ аднаго народнага пісьменніка («Не трудно догадаться, кто первым стоит в этой очереди. Не опускайте очи долу, Николай Иванович, не смущайтесь», — іранізуе аўтар «Народнай волі»).

Дастаецца і «правой руке» М.Чаргінца па «афіцыйным» новастворным Саюзу пісьменнікаў Беларусі Анатолю Аўруціну — за тое, што назваў Мінск літаратурнай правінцыяй (у параўнанні, мабыць, з «вялікай» Масквой). Назваў — ва ўжо згаданай намі напачатку «Литературной газете». А таму наступную цытату з артыкула В.Дашкевіча па праву хочацца прыпісаць і да папярэдніх развагаў пра «литгазетовский» «головомор» кіеўскага штрэйбрэхера: «И какая, извините, шелупонь окопалась в прославленной некогда «Литературной газете»? Не могли подобную писанину в помойку выбросить? Сами питаются олигархическими объедками и нашим горе-интернационалистам подыгрывают».

Словам, крытыка прагучала ў адрас М.Чаргінца вострая і «з перцам», крытыка, так бы мовіць, з нізоў: Вячаслаў Дашкевіч, як і падпісана ў артыкуле, член створанага М.Чаргінцом і ва ўсім падтрыманага дзяржавай Саюза пісьменнікаў Беларусі… Нават і пра «заказнасць» матэрыялу Вячаслава Дашкевіча з боку «незадаволеных» прадстаўнікоў Саюза беларускіх пісьменнікаў гаварыць няма як, бо яго — Дашкевіча — з тога старэйшага Саюза калісь выключылі…

«Не буду разжёвывать всё до мелочей», — упэўнена і з відавочным намёкам завяршае свой артыкул Вячаслаў Дашкевіч. — Скажу прямо: если кто и «съест» Лукашенко, так это его кадры».

Нас жа найперш цікавілі кадры літаратурныя. І разбірацца ў іх, натуральна, павінны найперш чытачы — і згаданых газет, і названых краін.

Яны, урэшце, і павінны паставіць коску ў назве гэтага артыкула…

**Мікола КАЛІНОВІЧ**

## ПАЛІЦА

### «ALAIZA» — СЛАВУТЫЯ І НЕВЯДОМЫЯ ВЕРШЫ АНАТОЛЯ СЫСА




Укладальнік кнігі Алесь Бяляцкі выбраў найлепшыя творы паэта і ягоную паэму «Алаіза» ў першапачатковай рэдакцыі, без рэдактарскіх правак. У кнігу таксама ўвайшлі вершы, якія пры жыцці Анатоля Сыса не былі надрукаваныя і дагэтуль невядомыя аматарам творчасці паэта.

### «ЯГАМОСЬЦЬ» — ЗДЗЕЙСНЕНАЯ ЗАДУМА




Бібліятэчка часопіса «Дзеяслоў» папоўнілася не зусім звычайным выданнем — кнігай паэтычных прысвячэнняў Анатолю Сысу «Ягамосьць». Паэтычныя радкі Анатолю Сысу прысвячалі многія аўтары: мэтры і пачаткоўцы, паэты, што ведалі Анатоля асабіста, і тыя, хто не быў з ім знаёмы…

Кніга «Ягамосць» — другая ў гісторыі сучаснай беларускай літаратуры анталогія паэтычных прысвячэнняў. Напачатку 2009 года Саюзам беларускіх пісьменнікаў у выдавецтве «Кнігазбор» была выдадзеная падобная кніга ў гонар народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава.

РАДА

# САЮЗНАЕ ПАПАЎНЕННЕ

**5 лістапада адбылося чарговае пасяджэнне Рады ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў».**

Старшыня СБП Алесь Пашкевіч выступіў з паведамленнем аб зробленым старэйшай творчым аб'яднаннем за мінулы перыяд. Найпершая ўвага надзялялася арганізацыйнай (праца секцый і прыёмнай камісіі, утрыманне інтэрнэт-сайта, выданне дадатку «Літаратурная Беларусь», нечарговая праверка з боку міністэрства юстыцыі), выдавецкай (у запачаткаванай бібліятэцы «Кнігарня пісьменніка» выйшла 5 кніг) ды міжнароднай дзейнасці.

Рада СБП прыняла ў шэрагі Саюза пісьменнікаў 8 новых сяброў. Імі сталі: **Сяргей Вітушка** (нарадзіўся ў в. Чысць Маладзечанскага р-на 10 красавіка 1965 г., аўтар краязнаўчых эсэ і вершаў, кнігі ўспамінаў і кнігі казак), **Іван Данілаў** (нарадзіўся 27 верасня 1927 г. у в. Ляжыткавічы Драгічынскага р-на, удзельнік Айчыннай вайны, аўтар кніг «Записки западного белоруса» (2007), жыве ў Мінску), **Леанід Зубараў** (нарадзіўся ў 1943 г., аўтар кніг «Максім Багдановіч» (1988), «Бомба для Сталина» (2004), «Змітрок Бядуля» (2005) і інш.), **Яўген Зубовіч** (нарадзіўся 21 жніўня 1984 г. у г. Чавусы, аўтар кніг «Чавусы — горад святога Марціна» (2008) і «У небе сонца заходзіць самотна» (2009), жыве ў Мінску), **Вера Пракаповіч** (нарадзілася 12 сакавіка 1943 г. у в. Мурыны Камянецкага р-на, аўтар кніг «Незримой нитью» і «Дорога домой», жыве ў Брэсце), **Мікола Кандратаў** (нарадзіўся 20 траўня 1957 г. у в. Замосце Талачынскага р-на, аўтар кнігі вершаў «Возера Рудакова» (2002) і «Вершы і зоркі» (2008), жыве ў Мінску), **Васіль Філіпенка** (аўтар зборнікаў прозы, жыве ў Мінску і на Палтаўшчыне), **Сяргей Цыплюк** (нарадзіўся 25 студзеня 1937 г. ў в. Ваўкаставец Камянецкага р-на, аўтар рамана «Белый свет на околице» і кнігі «Лестница в небо», жыве ў Брэсце).

ФОРУМ

# ПАЭТЫЧНЫ ЛІСТАПАД

**З 3 па 7 лістапада ў Польшчы адбыўся Міжнародны паэтычны фестываль «Познаньскі Лістапад».**



Познаньскі ўніверсітэт імя Адама Міцкевіча.

У фестывалі прынялі ўдзел 52 паэты з США, Іраку, Нямеччыны, Чэхіі, Літвы, Украіны, Расіі, Індыі, Турцыі, В'етнаму. Беларусь на форуме прадстаўляў намеснік старшыні СБП паэт і бард Эдуард Акулін. «Для мяне было вялікім гонарам узяць удзел у паэтычным форуме, які сёлета праходзіць у Познані ў 32 раз, — паведаміў ён. — Так атрымоўваецца, што апошнім часам пачуваеш сябе запатрабаваным творцам, на вялікі жаль, толькі за межамі Беларусі, дзе шануюць не толькі сваю літаратуру, а і літаратуру іншых народаў».

Урачыстае адкрыццё фестывалю адбывалася ў сценах знакамітага Познаньскага ўніверсітэта імя Адама Міцкевіча. А цырымонію адкрыцця сваёй прысутнасцю ўпрыгожыла вышэйшае кіраўніцтва горада і ўніверсітэта. «Нашым бы чыноўнікам гэтаму павучыцца… — сказаў Э.Акулін. — Толькі дзе? У нас на Беларусі апошнім часам няма ні тое што міжнародных, а нават фестываляў абласнога і раённага маштабу. А зусім нядаўна паэтаў зусім пазбаўлялі магчымасці сустракацца з чытачамі. Дзякуй Богу, гэтыя «блізарукія» загады чыноўнікаў ад адукацыі канулі ў лету, і на іх нават не варта азірацца. Трэба вучыцца ў нашых суседзяў — палякаў, літоўцаў, украінцаў, сербаў, славенцаў — ва ўсяго славянскага свету, як шанаваць свае святыні. Я маю на ўвазе найперш — роднае Слова і яго найвышэйшую іпастась Паэзію, якая з часоў Францішка Скарыны была на ўзроўні царкоўнай малітвы. Нездарма ж смаргонскі паэт Алесь Жамойцін лякуе хворых людзей, чытаючы над імі прадмовы да Біблій нашага першадрукара…»

Другі і трэці фестывальныя дні былі прысвечаныя творчым прэзентацыям гасцей фестывалю. Адбыліся дзесяткі выступленняў у навучальных установах Познані і яе ваколіцах: Лесзне, Коніне, Чэмпені, Буку, Пневе і інш.

«Было вельмі прыемна, — зазначае Э.Акулін, — што арганізатары фестывалю Збігнеў Гордзей і Марыя Магдалена Пацгай запланавалі ў межах імпрэзы маю творчую вечарыну з бардаўскім канцэртам. Яна адбылася 5 лістапада пры поўным аншлагу ў Познаньскім цэнтры адпачынку «Markietanka». Дарэчы на гэтай вечарыне адбылася і міжнародная прэзентацыя кампаніі «Будзьма беларусамі». Госці Познаньскага лістападу з цікавасцю ўспрынялі інфармацыю аб гэтай незвычайнай для іхняга разумення акцыі, бо і палякі, і літоўцы, і чэхі, і нават в'етнамцы ўжо даўно ёсць. А мы, беларусы, яшчэ толькі збіраемся быць…»

Па выніках форуму выйшла анталогія паэзіі «Як плынь ракі» з творамі ўдзельнікаў «Паэтычнага Лістападу» ў перакладзе на польскую мову».

УГОДКІ

# ГАРОШКАЎСКАЕ СВЯТА ПАЭЗІІ

**На радзіме беларускага паэта Анатоля Сыса ў вёсцы Гарошкаў Рэчыцкага раёна ў чацвёрты раз прайшло свята беларускай паэзіі «Дух — гэта, людзі, Я!». Мерапрыемства праводзіцца з 2006 года па ініцыятыве Саюза беларускіх пісьменнікаў і рэдакцыі часопіса «Дзеяслоў».**



Анатоль Сыс нарадзіўся 26 кастрычніка 1959 года. У 1982 годзе скончыў Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт. Друкаваўся з 1974 года. З'яўляўся адным з заснавальнікаў арганізацыі маладых пісьменнікаў «Тутэйшыя», быў членам Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Памёр паэт у Мінску ў траўні 2005 года.

31 кастрычніка ў Гарошкаве родныя, сябры Анатоля Сыса, вядомыя дзеячы беларускай культуры ўсклалі кветкі да магілы паэта. У свяце прынялі ўдзел больш за 120 чалавек.

На хаце паэта 31 кастрычніка была адчыненая мемарыяльная шыльда, затым адбыліся паэтычныя чытанні і бардаўскі канцэрт.

«Анатоль Сыс ад самога свайго нараджэння быў чальцом саюза, і нават не Саюза беларускіх пісьменнікаў, а саюза творцаў Беларусі, паколькі на гэтай прыдняпроўскай зямлі тысячы гадоў назад жылі і тварылі беларусы», — сказаў на свяце паэзіі старшыня СБП Алесь Пашкевіч.

Ён адзначыў, што пра паэтаў у Беларусі ў мінулым часе не гавораць: пра паэтаў вечна гавораць іх тэксты, творы, і таму лепшым помнікам Анатолю Сысу з'яўляюцца ягоныя кнігі. «Анатоль не любіў пафасу, не любіў лозунгаў, але мы не можам не сказаць: беларуская паэзія жыве, жыве памяць пра Анатоля. Хай яму будзе сонечна і ў іншым свеце», — пажадаў А. Пашкевіч.

Пра паэта сказаў і яго старэйшы калега Анатоль Вярцінскі: «Сыс параўноўваў паэзію з рэлігіяй, але пазней ён удакладніў: ён ставіў на адну дошку такія паняцці, як паэзія і Беларусь. Яго беларускасць, патрыятызм зусім не дэманстратыўныя, зусім не напаказ, калі мець на ўвазе не яго ўчынкі, а яго радкі — абсалютна шчырыя, памножаныя на яго асаблівасць як чалавека, як творцы».

На падворку паэтавай хаты прамаўлялі Уладзімір Някляеў, Барыс Пятровіч, Славамір Адамовіч і дзесяткі іншых творцаў, спявалі барды. Вёў свята намеснік старшыні СБП Эдуард Акулін.

У рамках свята прайшла прэзентацыя кнігі паэтычных прысвячэнняў Анатолю Сысу «Ягамосць» (выйшла ў бібліятэчцы «Дзеяслова») і выбранага тома паэзіі «Алаіза». Быў таксама прэзентаваны 42-і нумар часопіса «Дзеяслоў», у якім апублікаваныя лісты паэта, успаміны сяброў, вершы, якія раней не друкаваліся.

# ЮБІЛЕЙ ШЫЛЕРА

**У Нямеччыне лістапад стаў не толькі юбілейным месяцам разбурэння Берлінскай сцяны. На фоне гэтай палітычнай падзеі не засталіся незаўважанымі і культурныя мерапрыемствы. Сярод іх — урачыстасці з нагоды 250-годдзя нараджэння Фрыдрыха Шылера, класіка нямецкай літаратуры, філосафа і гісторыка.**



Партрэт Фрыдрыха Шылера работы Людавікі Сімановіц. 1793–1794.

Ёган Крыстаф Фрыдрых фон Шылер (Friedrich Schiller) нарадзіўся 10 лістапада 1759 года ў горадзе Марбах-на-Некары ў сям'і палкавога фельшара. Вучыўся ў вясковай школе і ў пастара. Пры спрыянні Вюртэмбергскага герцага у 1773-м паступіў у элітную ваенную акадэмію, дзе вывучаў юрыспрудэнцыю і медыцыну. У перыяд вучнёўства пачаў пісаць свае першыя п'есы. У 1777 годзе ў часопісе «Нямецкія хронікі» была апублікаваная яго ода «Заваёўнік».

У 1780 годзе Ф.Шылер стаў палкавым доктарам у Штутгарце. Пасля пастаноўкі п'есы «Разбойнікі» ў Мангэйме ў 1782 годзе быў пасаджаны на гаўптвахту. Герцаг Вюртэмберзкі быў незадаволены літаратурнымі захапленнямі свайго медыка і забараніў яму займацца мастацтвам. Шылер адмаўляецца ад вайсковай кар'еры і пакідае службу.

Пачынаецца вандроўніцкае жыццё. Пісьменнік гасцюе ў свайго сябра і жыве ў Веймары. У 1789 годзе прызначаны прафесарам гісторыі і філасофіі ў Йенскім універсітэце (які цяпер носіць яго імя). Жэніцца на Шарлоце фон Ленгефельд, нараджаюцца два сыны і дзве дачкі.

Ф.Шылер вяртаецца ў Веймар, дзе на сродкі мецэнатаў выдае некалькі літаратурных часопісаў. Зблізіцца і сябруе з Гётэ, заснуе з ім Веймарскі тэатр (сёння вядучы тэатр Нямеччыны).

Пісьменніцкую вядомасць Ф.Шылеру прынеслі ягоныя балады «Кубак», «Пальчатка», «Ібікавыя жураўлі», «Ода да радасці» (музыку да якой напісаў Людвіг ван Бетховен), п'есы «Разбойнікі», «Каварства і любоў», «Марыя Сцюарт», «Арлеанская дзева», «Дон Карлас», «Вільгельм Тэль» ды інш.

Творы Ф.Шылера ўхвальна ўспрымалі не толькі ў Нямеччыне, але і ва ўсёй Еўропе. Адны называлі пісьменніка паэтам свабоды, іншыя — апорай буржуазнай маралі. Яшчэ ў сярэдзіне XIX стагоддзі тэксты Ф.Шылера ўвайшлі ў школьныя падручнікі. Нацыянал-сацыялісты імкнуліся падаць пісьменніка «нямецкім творцам», аднак у 1941 годзе пастаноўкі «Вільгельма Тэля» і «Дон Карласа» былі забароненыя па загадзе Гітлера.

Апошнія гады жыцця цяжка хварэў. Памёр у Веймары ад сухотаў 9 траўня 1805 года.

У 1826 годзе парэшткі пісьменніка вырашылі перазахаваць, але дакладна ідэнтыфікаваць не змаглі. Выбраныя адвольна парэшткі перавезлі ў бібліятэку герцагіні Ганны Амаліі. Гледзячы на чэрап Шылера, Гётэ напісаў аднайменны верш. Напрыканцы 1827 года прах Ф.Шылера быў пахаваны ў княскай усыпальні на новых могілках, дзе побач з сябрам па запавеце затым займеў свой апошні зямны прытулак і Гётэ.

У 1911 годзе знайшлі яшчэ адзін чэрап, які прыпісвалі Ф.Шылеру. Доўгі час ішлі спрэчкі аб іх «сапраўднасці». У межах акцыі «Код Фрыдрыха Шылера», якая праводзілася радыёстанцыяй «Mitteldeutscher Rundfunk» і Фондам «Веймарскі класіцызм», у 2008 годзе ў дзвюх незалежных лабараторыях праводзілася экспертыза ДНК, якая выявіла наступнае: ані адзін з чэрапаў не належаў пісьменніку. Парэшткі ў труне належалі мінімум тром людзям. Фонд «Веймарскі класіцызм» вырашыў пакінуць труну Шылера пустой…

250-годдзе з дня нараджэння творцы — выставы, літаратурныя дыскусіі, тэатральныя пастаноўкі — адбываліся ў Марбаху-на-Некары (Цюрынгія), дзе нарадзіўся Ф.Шылер, а таксама ў Веймары, Йене ды іншых нямецкіх гарадах.

ВЕРШЫ

ВАСІЛЬ ЗУЁНАК

# ХОЧАЦЦА МУЗЫКІ СВЕТЛАЙ…

* * *

*Кажуць: убачыў грака —*
*Мудрасць такая даўняя, —*
*То і вясну сустракай*
*Вітальнымі песнямі-дайнамі.*

*А як, калі не сакрэт,*
*Быць з сённяшняю акрасаю:*
*«Гракі прыляцелі» — сюжэт*
*Нязменны — з карціны Саўрасава.*

*Ці збіўся ў зямлі разварот,*
*Ці сонца іначай схіляецца:*
*Гракі-мінчукі круглы год*
*У горадзе аціраюцца.*

*Бясснежжа — а ім самы раз*
*Няўладзіца гэта сезонная:*
*Без просьбы птушыных мас*
*Уладу трымаюць над зонаю.*

*Дубінкамі дзюбаў трасуць,*
*Паблісківаюць чорнымі робамі, —*
*Па сметніках гонар нясуць*
*Шыхты прызначэння асобага…*

*І масленка, як з-пад ярма,*
*На свет выязджае з подзівам:*
*Нібыта й вясны няма,*
*Бо і зіма не прыходзіла…*

### ПАСТАЯНСТВА

*Хоць забыліся даўно мы,*
*Як народ дзяліўся:*
*І паны даўно — фантомы,*
*І мужык змяніўся, —*

*Ды жыве перасцярогі*
*Мудрай пастаянства:*
*Не дай божа свінні рогі,*
*А мужыку панства…*

### ПЕРАДЗІМ'Е

*Двор пахруствае крохкім лядком,*
*Трызніць полазам чарнатроп.*
*Сонца нехаць, нібы сілком,*
*Грэе хаце шыферны лоб.*

*Дзень тужлівай красой снегіроў*
*Плоціць лету рахунак нямы,*
*І ў высокіх дымах камінсоў —*
*Прадчуванне марознай зімы.*

* * *

*Хочацца музыкі светлай,*
*А мне забіваюць вушы*
*Вэрхалам з апраметнай*
*«Гомікі» і клікушы…*

*Хочацца шчырага слова,*
*А «гномікі духу» мелюць*
*Душам асцё ды палову —*
*Трактуюць, каб хлеб з іх мелі…*

*Хочацца летуценна*
*Ляцець да зорных вышыняў,*
*Ды часу турэмныя сцены*
*Цяжэй, чым ярмо на шыі…*

*Хочацца, каб жылося*
*Па-людску і нашаму люду,*
*Ды лёс не прарокаў прыносіць*
*На нашу зямлю, а прыблудаў…*

### КРЭКС-КРЭКС…

***Драч /лац.: Crex crex/, такі шматлікі ў недалёкім мінулым насельнік беларускіх балот і лугоў-сенажацяў, знаходзіцца сёння пад пагрозай глабальнага знікнення…***
***З экалагічных назіранняў.***



*«Crex crex» — вучоная латынь*
*Драчу з балота нашага*
*Імя выкрэквала — і тым*
*Вучонасць назапашвала.*

*І кожны, хто чытаў ці чуў*
*Пра тую сістэматыку,*
*Зайздросціў нашаму драчу,*
*Славутасцю багатаму.*

*Што перапёлка з салаўём! —*
*Нуль у начным канцэрце,*
*Калі, надзьмуўшыся валлём,*
*Драч стане песню дзерці.*

*«Крэкс-крэкс» — задзірыста скрыпіць*
*Мелодыя бляшаная.*
*Прачнецца нават чорт, што спіць*
*Пад купінай імшанаю…*

*Ды навалілася бяда —*
*Як гнёт: меліярацыя…*
*Сышла вада, а па слядах*
*Збег драч у эміграцыю…*

*Парваўся голас на шматы,*
*Развеяўся да каліўца, —*
*І нават гучная латынь*
*Драча не дагукаецца…*

*Вярнуцца, кажуць, абяцаў…*
*Ды сцежка незваротная, —*
*І ні пачатку, ні канца,*
*Як ні лугоў з балотамі…*

*— Крэкс-крэкс?..*
*— Crex-crex…*

* * *

*І хто намаліўся, і хто награшыў —*
*Рахунак аднолькавы мае:*
*Загадку жыцця ніхто не рашыў,*
*І часу ніхто не стрымае.*

*За часам не вернешся наўздагон, —*
*Час — ён двайнік наш сустрэчны.*
*Час — гэта я, гэта ты, гэта ён,*
*А ўсё, што без нас, — гэта вечнасць…*

### КУДЫ ПАЙСЦІ?

*Афіша не жмуркамі —*
*Аршынна — абʼяўляе*
*Спектаклі*
*Для дэбілаў і дубоў:*
*«Ужин с придурками»*
*Спачатку замаўляе,*
*А потым — як закліч:*
*«Дурацкая любовь»!..*

### НЕНАЕДА

*Ні рубля, ні капейкі —*
*Толькі тысячы, тысячы…*
*Цень цвяліць еўрапейскі,*
*Галаву табе лысячы…*

*Размнажаюцца грошы,*
*Як жукі каларадскія,*
*Як мільтоны, як вошы… —*
*А кішэні — жабрацкія!..*

*Стос паперак не ліпавы,*
*А басота басотай, —*
*Вочы здзіўлена лыпаюць,*
*Як нулі на банкнотах…*

*Ні рубля, ні капейкі…*
*І куды ўсё дзяваецца?..*
*Хоць зажмурся — ды ў пельку,*
*Як у песні спяваецца…*

*Той матыў прыгадаеш,*
*Як збярэшся паснедаць*
*І ўваччу, маладая,*
*Паўстае ненаеда.*

*Голад пашчу не шчэрыць*
*І зубамі не клацае:*
*І абед, і вячэру,*
*Кажуць, з'ела інфляцыя…*

* * *

*Хто мне цвёрда адкажа,*
*Хто запэўніць мяне,*
*Што ўжо лёс нехлямяжы*
*Заўтра нас абміне.*

*Што народ акрыяе*
*І паверыць сабе,*
*Што не будзе раздраяў*
*У сыноў на сяўбе.*

*Што пад мудрай аховай*
*Наша памяць спачне,*
*Што спрадвечная мова*
*Гаспадыніць пачне.*

*Што лягчэйшы, чым гэты,*
*Будзе новы рэжым*
*І што апалагеты*
*Пабягуць на крыжы…*

* * *

*Узвіжанне гоніць вужак*
*У мох і ў лаўжы на сховы,*
*Апошні качар-крыжак*
*Пакінуў свой куст альховы.*

*Азіміну для зайцоў*
*Салодзіць марозік лёгкі.*
*Крумкач — мудрэц з мудрацоў —*
*Аб лёсе нагадвае крохкім…*

*Чарнеюць прадонні віроў,*
*Вясёлку імжа разагнула,*
*І ў шуме трывожным вятроў*
*Зімы праразаюцца гулы…*

### АПТЫМІСТ

*На цёплы поўдзень прыдбалі квіткі*
*Суседзі — і шпак, і ластаўка,*
*А вераб'ю ляцець не з рукі:*
*Пара ў яго самая ласая.*

*Капейка ў кішэні, а з'еў на рубель —*
*Жыццё па-асеннияму лёгкае, —*
*І на таку аптыміст-верабей*
*Вось-вось салаўём зацёхкае.*

### І ТАДЫ ЎРАТАВАННЕ АДНО…

*Каб трываласці мець запас,*
*Век улады народ не песціў.*
*Так ужо і вядзецца ў нас:*
*Праўду рэжа той, хто на пенсіі.*

*Ёсць капейчына на харчы —*
*Хоць жабрацкая, ды незалежная.*
*А таму яны й зухі вучыць*
*Гэтак жыць, як жылі пры Брэжневе.*

*І агонь у крыві не патух —*
*Палыхае ўсё, аб чым марылі, —*
*Ібаруры Далорэс дух,*
*Той, іспанскай, пасіянарыі.*

*Ды не чуюць іх — ні ірвачы,*
*Ні запечнікі, — як закляніла:*
*Хто зацята маўчыць, хто крычыць,*
*Каб маліліся ім маўклівыя .*

*Словатворныя гмахі ўстаюць,*
*Славатворныя ідалы высяцца, —*
*Новы дзень з малатка прадаюць, —*
*А былыя ідэі лысяцца.*

*І праз бурбалкі слоў не відно*
*Дно чыноў прадажна-таварнае…*
*І тады ўратаванне адно —*
*Пенсіянеры пасіянарныя.*

### ПРЫКЛАД

*Вяскоўцы штурмуюць алімпы ўладныя:*
*Хто ў маштабах раёна, а хто і ў сталіцы.*
*А як жа! — прыклад бацькі натхняе*
*і радуе, —*
*Нельга з прыкладам гэтакім памыліцца!..*

*А інтэлігенты ў галовах з пражэктамі,*
*Як выцягнуць вёску прагрэсу трасамі,*
*З барознаў бульбоўных на «сотках»*
*манжэтамі*
*Каларадскіх жукоў страсаюць…*

### ДОМА

*Лацвей нам, беларусам, —*
*Хоць гэтым ды ўзялі! —*
*За краты пад прымусам*
*Не пруць на край зямлі.*

*Дамашняе заданне, —*
*Хіба гэта прысуд?!.*
*Жыве адно ў паданнях*
*Сібірскі шлях-маршрут…*

*Цяпер усё пад бокам,*
*Усё, лічы, сваё.*
*І сам на відавоку,*
*І сховішча тваё.*

*І ні тайгі астрожнай,*
*Ні Калымы няма —*
*У нас у сэрцы ў кожным*
*У кожнага турма…*

### ІДЗЕ ПРАГРЭС…

*Ідзе прагрэс углыб і ўшыркі:*
*Каханнем вёсны адцвілі —*
*І нараджаюцца ў прабірках*
*Нашчадкі нашы на зямлі.*

*Ды пляскаць не гатоў у ладкі*
*Пакуль што я — адзін з жывых, —*
*Хачу спытацца для пачатку:*
*А што за людзі выйдуць з іх?*

*Кім свет заселіцца, нарэшце,*
*Па тых народзінах шкляных,*
*Як адамрэ той спосаб грэшны,*
*Што самы райскі між зямных?..*

*Уваж наіўнае пытанне,*
*Камп'ютар мудры, — адкажы:*
*Якое будзе ў іх каханне*
*І з чым у сэрцах будуць жыць?..*

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# ЛІСОЎЧЫКІ

## ФРАГМЕНТ НОВАГА РАМАНА

Леанід ДАЙНЕКА



…Пакінуўшы большасць сваіх людзей у Нясвіжы, Аляксандр Лісоўскі спешным маршам павёў у Інфлянты сотню вершнікаў, самых падрыхтаваных і самых праверанных. У Інфлянтах ён меркаваў уліцца ў харугву усвяцкага старосты Яна Пятра Сапегі.

Лісоўскага перад выправай у Інфлянты наведаў канцлер Леў Сапега. Прыехаў з Вільні, зайшоў у ягоную рэзідэнцыю, абняў, сказаў:

— Ты, пане, Лісоўскі, а я — Ліс. З адной нары, з аднаго гнязда з'явіліся мы на белы Божы свет. І гняздо гэтае — Вялікае Княства Літоўскае. І нам патрэбна абараняць яго ад ворагаў усімі сваімі сіламі. А ворагаў, пане, шмат. Куды ні зірні — адусюль дзьме халодны вецер.

— Так, пане канцлер, — згодна захітаў галавою Лісоўскі. — Ворагаў шмат. І меней іх не робіцца.

Леў Сапега пранізліва зірнуў на яго, потым паглядзеў на абраз Хрыста, што вісеў на сцяне рэзідэнцыі, прамовіў:

— Ёсць Бог, найвялікшы і наймудрэйшы. І ёсць Мікалай Капернік, які не збаяўся паставіць сонца ў цэнтр вечнага неба. Ёсць Ян Гус, што згарэў у вогнішчы, не адрокшыся ад жыццёвага ідэалу. І ёсць мы, што пастаянна мяняем свае веры і мовы. Як зразумець і як вытлумачыць такое? Я сам нарадзіўся праваслаўным. Потым, калі вучыўся ў Лейпцыгскім універсітэце, запісаўся ў кальвіністы. Потым у 1586 годзе стаў католікам. Тры веры перамянілася ў маёй душы. Хіба гэта правільна? Значыць, няма ўва мне цвёрдага пастаяннага стрыжня. Як агонь пад ветрам, вера мая.

— Пан канцлер не адзін такі, — асцярожна ўставіў сваё слова Аляксандр Лісоўскі. — Амаль усе мы такія.

— А чаму? — спытаў Сапега і сам жа адказаў на сваё пытанне: — Таму што пасяліў нас Пан Бог паміж ляхам і маскалём, а яны ганарыстыя, яны задзірыстыя і агрэсіўныя. І мы, наш народ, як бы разрываемся паміж імі. Мы ўвесь час уступаем на ўсё новыя вуніі, каб захавацца і не знікнуць, увесь час прыхіляемся да больш моцных, да больш вялікіх. Але ж яшчэ любамудр Сенэка сказаў: «Радзіму любяць не за тое, што яна вялікая. Радзіму любяць за тое, што яна радзіма». Я добра разумею гэта, васпане. Я разумею, што немец і швед хоча ўзяць нашую волю, а маскаль ды й той жа лях хочуць узяць нашую душу. Мы, дзяржаўныя мужы Княства, як толькі можам, супраціўляемся гэтаму. Вось чаму ў віленскай друкарні Мамонічаў я фінансаваў і распарадзіўся надрукаваць Статут Вялікага Княства Літоўскага нашай прыроднай мовою, каб паказаць усім і кожнаму, хто мы ёсць на гэтай зямлі.

Ён змоўк, як бы прыслухоўваючыся да нечага ўнутры сябе. Па ягоным твары было відно, што яму не дае спакойна жыць пастаянная барацьба думак, якія неадступна і неадчэпна нараджаюцца ў самай патаемнай глыбіні душы. Вось і цяпер, памаўчаўшы, Леў Сапега сказаў:

— Жыццё павінна быць вострае.

— Прашу прабачыць, пане, але што такое — вострае жыццё? — пацікавіўся Лісоўскі.

— Стыло, якім пішаш. Слова, што нараджаецца пад гэтым стылом. Шпага, якой абараняеш свой гонар і гонар сваёй Айчыны, — з найвялікшай жарсцю і перакананасцю адказаў Леў Іванавіч Сапега.

Канцлер, пажадаўшы радзівілаўскаму почату і самому Аляксандру Лісоўскаму вайсковага шчасця, вярнуўся ў стольную Вільню, а лісоўчыкі з усёй імклівасцю рушылі ў Інфлянты. Верасень фарбаваў у жоўты колер лясы. Шэрымі даждамі плакала неба. Птушкі ляцелі на поўдзень. Людзі рваліся на поўнач, на раку Дзвіну, спрадвечны крывіцкі Рубон, і далей — у залітую крывёй бясконцых войнаў Лівонію.

Яшчэ на самым пачатку трынаццатага стагоддзя ўвесь Рубон да самага ягонага вусця, дзе ўліваецца ён у Балтыйскае мора, належаў Полацкаму княству. Гэта быў водны шлях палачанаў у Еўропу. Лівы і леты, што жылі на берагах ракі, плацілі Полацку даніну, прызнавалі верхавенства полацкага князя. Але прыплылі з захаду ў гэты край рыцары-мечаносцы, і ўспыхнуў агонь вайны, які, калі зірнуць на падзеі ўважліва, па-магчымасці, бясстрасным вокам, гарэў, ніколі не тухнучы. Шмат жыццяў узяў ён. Згарэў у гэтым суровым агні князь Вячка, гераічна абараняючы свае гарады Кукейнос і Юр'еў, якія пад жалезнай пятой мечаносцаў сталі называцца Кокенгаўзенам і Дэрптам. Гарэў агонь бязлітаснай вайны (на гэты раз паміж Рэччу Паспалітай і Швецыяй) і цяпер — у верасні 1605 года. Швецыя імкліва набірала сілу. Ёй было цесна ў сваіх скандынаўскіх межах. І ўрэшце рэшт сіла гэтая штармавіта выплеснулася на ўсходне-еўрапейскія абшары.

На крывавых ратных шляхах сустрэліся вялікі гетман Ян Караль Хадкевіч і шведскі кароль-пратэстант Карл Судэрманскі. Узнагародаю пераможцу павінна была стаць Рыга, горад, які валодалі палякі і ліцвіны. Глыбокай ноччу пад шквалістым праліўным дажджом, пад раскацістымі ўдарамі грому павёў на Рыгу сваіх жаўнераў ваяўнічы адважны швед, павёў з надзеяю, што ніхто не чакае яго ў такое жахлівае вар'яцкае надвор'е. Ды ў дзвюх мілях ад Рыгі каля вёскі Кірхгольм не спаў, гуртаваў баявыя шыхты Хадкевіч. Ліў бурны дождж, нібы хацеў астудзіць гарачыя людскія галовы, утрымаць іх ад душагубства. Дзве грозныя сілы стаялі адна насупраць другой. Лепей бы ім не сутыкнуцца на халодных начных дарогах, прайсці, не заўважыўшы адна адну. Але яны сутыкнуліся. Дзьмуў у твары густы мокры вецер, нёс з прыморскіх дзюнаў шурпаты калючы пясок.

На самым золку Аляксандр Лісоўскі са сваім початам далучыўся да Яна Сапегі, які стаяў на правым фланзе. Пад началам ва ўсвяцкага старосты былі дзве сотні ўласных вершнікаў, панцырная сотня Невяроўскага, початы Млоцкага, Гедройца і Баркоўскага — усяго каля дзевяці соцень жаўнераў.

— Вітаем рыцараў з Нясвіжу! — узрадавана выгукнуў Ян Пётр Сапега і пад'ехаў, распырскваючы ліпкую гразь, на сваім вёрткім рыжым коніку да шыхта Лісоўскага. — Хопіць працы і вашаму, панове, вастраму мячу!

Калі сплыў-сцёк з мокрых расквашаных дажджом дзюнаў белы ранішні туман, убачылі проста перад сабою шведаў. Яны (каля васьмі тысяч пяхоты) пагрозліва стаялі двума шэрагамі, стаялі на ўзгорках. І ў гэтым была іхняя перавага над войскам вялікага гетмана Яна Караля Хадкевіча, што шыхтавалася ў нізіне. Блішчэлі дзіды, адкаваныя са славутага шведскага жалеза. Тапырыліся дулы мушкетаў. Праўда, порах трохі адсырэў пад бясконцым начным дажджом.

Разам са шведамі прыйшлі лавіць вайсковую ўдачу ў мокрых слізкіх лівонскіх дзюнах нямецкія, французскія, галандскія і ангельскія жаўнеры. Яны моўчкі стаялі агромністай непарушнай армадаю. Іх чакалі або вялікія грошы, або смерць.

Карл Судэрманскі, новааб'яўлены шведскі кароль, прыспешваючы перамогу, разгуртаваў пяць соцень кавалерыстаў па флангах пяхоты. Ім жа ў падтрымку даў адзінаццаць гарматаў, якія шквальным агнём павінны былі скрышыць безгарматнага ворага. Сам кароль з гвардыяй застаўся ў тыле, але кожнае імгненне гатовы быў рынуцца туды, дзе дасць першую трэшчыну ліцвінская сцяна.

Хадкевіч падзяліў сваё войска на тры часткі. У цэнтры ішоў у бітву адборны гетманскі полк пад зверхніцтвам Вінцэнта Войны. Левым крылом кіраваў Тамаш Дубрава. Тут былі панцырныя гусары, тры конныя татарскія харугвы, лівонскія пешцы-ландскнехты Плетэнберга разам з узброенымі абознікамі. Лісоўчыкі стаялі на правым фланзе разам з жаўнерамі Яна Пятра Сапегі.

Перад самым боем вялікі гетман Хадкевіч, памаліўшыся разам з усімі, зняўшы шлем, ад чаго валасы адразу ж ускудлаціў вецер, сказаў войску:

— Перад намі стаіць швед, услаўлены перамогамі, загартаваны бітвамі ваяр. Але й мы, сыны Княства Літоўскага, умеем ваяваць і перамагаць. Шлях вось з гэтага поля адзін: альбо ў рай, альбо ў пекла. Не саступім жа ворагам. Не адвернем позіркі свае. Хоць ворагаў, шчыра кажу я вам, шмат, іх нават цяжка палічыць.

— А мы іх палічым тады, калі ўсіх пераб'ем! — крыкнуў Іван Мастоўскі.

Хадкевіч пачуў такія словы, усхвалявана адказаў:

— Дай Божа, каб вашы, пане рыцар, словы споўніліся. За добры знак прымаю вашу ахвоту і спадзяюся на вашую мужнасць.

У гэты самы час на другім беразе Дзвіны загарцавалі тры сотні рэйтараў курляндскага герцага Фрэдэрыка, якія прымчаліся на дапамогу ліцвінам. Злёту яны ўрэзаліся на конях у вірлівую рачную плынь, удала знайшлі брод і неўзабаве былі ўжо побач з шыхтамі гетмана Хадкевіча. Рэйтараў сустрэлі крыкамі захаплення.

Убачыўшы такое, Карл Судэрманскі загадаў барабаншчыку біць сігнал атакі. Ярасна ўдарылі палачкі з найшчырэйшага шведскага дуба па туга напятай бычынай скуры. Звонкі пошчак пакаціўся па маўклівых мокрых дзюнах. І адразу ж усё ажыло, загуло, зарухалася. Шведы пачалі баталію. Яны ішлі ў сініх мундзірах, у чорных капелюшах, высокія, станістыя, шыракаплечыя, з доўгімі грывамі светлых валасоў, з халоднай ярасцю ў позірках. Зрабілася ціха-ціха. Толькі рыпеў пясок пад тысячамі моцных мускулістых ног. Ды ці можна спыніць такую сілу? Усё змяце яна на сваім шляху, як гняўлівая вясновая паводка змятае масты і грэблі.

Лісоўчыкі з Аляксандрам Лісоўскім чакалі шведскага ўдару на правым крыле ліцвінскага войска. Яны ўзнялі над сабою свой бел-чырвона-белы сцяг з выяваю двух вершнікаў на адным кані. Сцяг трымаў Марцін Жабыка-Жэмба. Ягоныя сінія вочы натхнёна ззялі.

Непадалёк ад сцяганосца, сутыкаючыся страмёнамі, суцішвалі ўзбуджаных коней Лявонцій Кукарэцкі і Антон Даніловіч-Гоцкі…Чакаючы першай у сваім жыцці сапраўднай бітвы, бітвы, вядома ж, з непазбежнай крывёю і нават смерцю, Лявонцій думаў: «Няўжо я магу загінуць? Няўжо праз нейкія імгненні мяне ўжо не будзе? Як гэта — мяне не будзе? А дзе ж будуць мая галава, мае рукі і ногі, маё сэрца? Дзе будуць мае думкі, мае вершы? Дзе будзе каханне маё да дзвюх прыгожанькіх сястрычак?».

Даніловіч-Гоцкі бачыў і разумеў хваляванне свайго маладзейшага аднашыхтоўца. Ён вырашыў падчас бою па магчымасці апекаваць, абараняць яго, але рабіць гэта не дужа прыкметна, каб не пакрыўдзіць уражлівага паэта.

Тым часам сіняя непарушная шведская сцяна пагрозліва набліжалася. І тады вялікі гетман Хадкевіч паслаў на пярэднюю лінію вестуна з загадам: адступаць, уцякаць. Гэта быў звычны хітры манеўр з разлікам на ўпэўненасць шведаў і самога іхняга караля Карла ў сваёй непераможнасці і неадольнай сіле. Пярэднія ліцвінскія воі паказалі зад, пабеглі бязладнай гурмою, спатыкаючыся, спалохана хапаючыся за галовы, але не выпускаючы з рук зброю. Такі паварот падзей стаўся салодкім п'янлівым віном для суровых шведаў. Яны паверылі, разладзілі свой дасюль амаль ідэальны шыхт, ашчацініўшыся дзідамі, рынуліся ўперад. І тут іх чакала крывавая і страшная неспадзяванка. За невысокім бязлесным узгорачкам яны напароліся на гетманскі полк Вінцэнта Войны, сутыкнуліся лоб у лоб. Шматдульным злым залпам грымнулі мушкеты, няшчадна зрэзалі ўвесь пярэдні шведскі шэраг. У клубках жоўтага парахавога дыму ўзгорачак на нейкія імгненні як бы знік, быццам яго й не было. Але дым развеяўся, і шведы, тыя, хто ацалеў, убачылі проста перад сабой калючы зіхоткі лес вострых ліцвінскіх дзідаў. Гэты сталёвы лес размашыста і прагавіта ўпіўся ў іхнія гарачыя маладыя целы, беспамылкова знаходзячы сэрца, выпускаючы трапяткую душу ў нябёсы. Пачуўся страшны рык-стогн. Зазвінеў захрабусцеў метал. Ручаямі хлынула яркая чырвоная кроў. Узвіхурылася бітва. Мала было забіць шведа. Яго, моцнага і ўстойлівага, як дуб, трэба было яшчэ й паваліць на зямлю. А такое можна было зрабіць толькі вялікай крывёю і вялікім потам.

На правы фланг ліцвінскага войска ярасна наваліліся шведскія рэйтары ў бліскучых кірасах і шлемах, з доўгімі вострымі шаблямі і ручной агняпальнай зброяй. Іхнія грудастыя мясістыя коні, дзіка храпучы, зразаючы цяжкімі капытамі ўсіх, каму не пашанцавала і хто ўпаў на зямлю, несліся напралом.

— Вера і перамога! — люта закрычаў Аляксандр Лісоўскі, узвіваючы ўгору сваю бязлітасную шаблю, прышпорваючы каня.

— Вера і перамога! — падтрымалі баявы кліч усе, як адзін, лісоўчыкі і, быццам камяні лавіны, што няўмольна абрушваюцца следам за самым першым валуном, рынуліся ў атаку за сваім водцам.

Сутыкнуліся, пачалі грызці адно аднаго коні. Людзі пачалі дзідамі і шаблямі калоць і пластаваць ворага. Адчайныя крыкі, пранізлівае конскае іржанне, звон зброі, гулкія стрэлы з мушкетаў, глухія ўдары па мяккаму жывому чалавечаму целу запаланілі наваколле. Гэта быў страшны голас вайны.

Лісоўчыкі біліся супраць рэйтараў, прафесійных шведскіх ваяроў, якія жылі толькі сечамі і паходамі. Магчыма, не хапала лісоўчыкам такога ж баявога майстэрства, бо зусім нядаўна зліліся-з'ядналіся яны ў адзін почат, але адвагі ім было не пазычаць. І натхнёна вёў іх у самае пекла лютага бою чалавек мужнай рукі і ваяўнічага духу — Аляксандр Язэп Лісоўскі. «Сын грому» — ужо знайшоў яму высокае ганаровае імя паэт Лявонцій Кукарэцкі.

Сам Лявонцій, напружваючы ўсе сілы, абліваючыся салёным потам, выганяючы з сэрца страх, калоў і калоў дзідай. Побач з ім секлі шаблямі, стралялі з пісталетаў і мушкетаў Антон Даніловіч-Гоцкі і Вітаўт Гарткевіч. Крыху далей ярасна кружыўся на кані Іван Мастоўскі, адбіваючыся ад

рэйтараў буздыганам, цяжкой жалезнай булавой з рубчастымі вострымі пер'ямі. Гэтым буздыганам ён крышыў шведскія чарапы і крычаў:

— Раней смерці не памерці!

…Сцяганосец Марцін Жабыка-Жэмба таксама рынуўся ў самы вір бязлітаснай сечы. Дрэўка сцяга лісоўчыкаў, бел-чырвона-белага палотнішча, ён намёртва прывязаў-прыкруціў папругаю да тулава і, вызваліўшы такім чынам рукі, хвастаў шабляю налева і направа. Са сваім яркім сцягам ён быў падобны на крылатага ваяра-анёла, што адважна зляцеў з хмарных нябёсаў на залітую гарачай крывёй, здратаваную конскімі капытамі зямлю.

Велізарны шведскі рэйтар у бліскучых металічных латах, якія ў некаторых мясцінах былі ўжо прабітыя, у завірусе бою заўважыў сцяганосца, крута развярнуў свайго каня і, пад'ехаўшы да Марціна, скокнуў на яго ззаду, як драпежная рысь. Яны пакаціліся на зямлю. Швед хацеў запалоніць сцяг. Ён быў больш моцны, больш цяжкі — і пачаў душыць Жабыка-Жэмбу, упіўшыся таму жалезнымі пальцамі ў горла.

Даніловіч-Гоцкі з Кукарэцкім ірванулiся на дапамогу сцяганосцу. Саскочылі з коней, навалiлiся на раз'ятранага шведа. Ён быў магутны, як пушчанскі зубр. Цяжка варочаўся, адбіваўся рукамі і нагамі, укусіў Даніловіча-Гоцкага, а потым ударыў галавой. Ды супроць траіх не ўстояў, здаўся, заціх.

Бітва доўжылася амаль чатыры гадзіны. Нарэшце шведы не вытрымалі. Іхняя конніца кінулася на ўцёкі, топчучы сваю ж пяхоту. Кожны, як толькі мог, ратаваў уласнае жыццё. Паранены Карл Судэрманскі цудам выслізнуў з ліцвінскай пасткі, даімчаўся да свайго карабля, загадаў неадкладна адплываць ад берагу.

— Ваша вялікасць, як я рады, што вы ацалелі! — радасна ўсклікнуў ягоны верны стары камердынер. Кароль адразу ж пранізаў камердынера шпагаю, істэрычна закрычаў з пенаю на патрэсканых скрываўленых вуснах:

— Мярзотнае гадаўё! Усе вы павінны былі быць там, дзе толькі што быў я!

У войску вялікага гетмана Хадкевіча загінула больш за сотню ваяроў. Між іх адзінаццаць лісоўчыкаў. Шведаў лягло некалькі тысяч. Гэта быў жахлівы разгром. Пераможцы ўзялі шмат палонных. Узялі ўсе адзінаццаць шведскіх гарматаў.

Лісоўчыкі, якія скруцілі велізарнага шведскага рэйтара, не ведалі, што з ім рабіць. Палонны паныла стаяў між іх. Чырвоныя абдзёртыя рукі дробна трымцелі.

— Злавілі плотку, што не лезе ў глотку, — разгублена шкроб падбароддзе Антон Даніловіч-Гоцкі. — Трэба б было адразу прыкончыць яго, і ўвесь гамон. А цяпер думай, куды дзець гэту жалезную лялькў.

І тут прагучаў загад гетмана:

— Палонныя шведы пацягнуць у Рыгу свае ж гарматы.

Даніловіч-Гоцкі ўзрадаваўся, паляпаў рэйтара па плячы:

— Будзеш за каня. Усё лепей, чым на тым свеце ў вогненнай смале кіпець.

Пахавалі забітых на высокім дзвінскім беразе. Шведы таксама закапалі сваіх мёртвых, але ў ніжэйшым месцы далей ад ліцвінаў. Трупаў было дужа шмат, і невясёлая праца доўжылася амаль суткі.



Мы ўвесь час уступаем ва ўсё новыя вуніі, каб захавацца і не знікнуць, увесь час прыхіляемся да больш моцных, да больш вялікіх

Бяда напаткала ў сечы Вітаўта Гарткевіча — цяжка паранілі Самума. Шведская дзіда прапарола бедная жывёліне левы бок. Конь ляжаў на пяску, сіпла перарывіста дыхаў, то заплюшчваў, то расплюшчваў вялікія карычневыя вочы, у якіх ззялі гарошыны слёз. Часам ён слаба варушыў хвастом, перабіраў тонкімі сухімі нагамі і ўмольна глядзеў на свайго гаспадара, нібы просячы за нешта прабачэння…

Пад'ехаў Аляксандр Лісоўскі, паглядзеў на ўсё, сказаў строгім голасам:

— Не да твару шляхціцу румзаць у тры ручаі. На тое й вайна. Гінуць не толькі людзі. Гінуць коні. Уставай. Трэба грузіць пакалечанага каня на фурманку і везці ў Рыгу. Там знойдуцца лекары.

Так і зрабілі. Вітаўт Гарткевіч, як у тумане, ішоў за фурманкаю. Самум, лежачы на травяной падсцілцы, неадрыўна пазіраў на яго.

Па той жа цяжкой пясчанай дарозе палонныя шведы валаклі ў Рыгу адзінаццаць сваіх гармат. Пад прымусам рабілі яны гэтую немілую зняважлівую працу. А куды дзенешся? Як казалі старадаўнія лаціняне: Memento quia pulvis es — Памятай, што ты прах.

Адзін з лісоўчыкаў, вёрткі чарнавусенькі шляхцючок аднекуль з-пад Ліды, спрытна ўскочыў на гармату, якую цягнулі чацвёра шведскіх рэйтараў, сядзеў на ёй, красуючыся, і ўсё паўтараў вясёлую прыгаворку:

— Я на шведу еду. Я на шведу еду…

…Рыга радасна вітала сваіх збаўцаў ад шведаў. І старыя, і малыя выбеглі на вуліцы і плошчы, махалі рукамі, падносілі букеты кветак, хлеб, збаны з півам і віном, смажаную балтыйскую салаку на закуску. Лісоўчыкі разам з усім ліцвінскім войскам прагарцавалі па горадзе. Ім, відома ж, было вельмі прыемна чуць такую ўсеагульную пахвалу.

Трыумфатарамі вярнуліся ў Нясвіж, але тут іх сустрэлі зусім не так, як у Рызе. Можна сказаць, не заўважылі іхняе вяртанне. Сам Лісоўскі здзівіўся такому холаду і такой цішыні. Аказалася, радзівілаўскай сталіцы было не да іх. Іншыя страсці клекаталі тут, як вогненны вулкан. Тры дні таму нечакана прыехаў з Аўгсбургу ў родны дом старэйшы сын Мікалая Крыштофа Радзівіла Ян Юрый з паніклай павіннай галавою. Высветлілася, што ніхто яго не краў і не трымаў у змрочных падзямеллях, дзе мітусяцца жахлівыя павукі і пацукі. Глытнуў малады княжыч вольнага салодкага паветра ў Еўропе, пайшла кругам зялёная нявопытная галава, і захацелася яму зрабіцца такім, як усе людзі, што былі навокал яго: бесклапотным, азартным, гуллівым. Захацелася яму быць вагантам, вандроўным паэтам мінулых часоў. Адразу ж прыбілася да багатага ліцвінскага княжыча цэлая плойма нахабнага прагавітага люду, у якога наўме былі толькі віно і распусныя жанчыны. Добра пагулялі яны, забыўшыся пра вучобу і пра ўсё на свеце. Калі ж залаты запас пайшоў на вецер і ў кішэнях не засталося ні дынарыя, падгаварылі гэтыя беспрабудныя п'яніцы-гульцы Яна Юрыя выцыганіць у бацькі яшчэ болей грошай. Так нарадзілася легенда пра таямнічае знікненне радзівілаўскага нашчадка. У яе паверылі нават мудрагелістыя езуіты. Меркавалася атрымаць грошы на выкуп і знoўку рынуцца туды, дзе зваблiва гучаць салодкагалосыя лютні і тамбурыны, танцуюць, як аголеныя антычныя багіні, вясёлыя чарнавокія смуглянкі і ракой льецца віно. Але ў нейкі момант Бог вярнуў Яну Юрыю розум. Патаемна ад сваіх ненапойных шумлівых сябрукоў ён сустрэўся з пaслом караля і вялікага князя Жыгімонта ў Вене князем Чартарыйскім, як на споведзі, адкрыў яму душу і неўзабаве прыехаў у Нясвіж.

Гэта было класічнае вяртанне блуднага сына. Дужа разгневаны, аж вішнёваскуры ад порсткага прыліву ўзбунтаванай крыві сядзеў Мікалай Крыштоф Радзівіл у Рыцарскай залі замка за шырокім чырвонага дрэва сталом з мармуровымі ножкамі ў выглядзе львіных лапаў. За некалькі крокаў ад яго стаяў на каленях, нізка апусціўшы павінную русую галаву, ягоны старэйшы сын Ян Юрый. Шчокі адлівалі мармуровай беллю. Ва ўсім замку, ды й, мабыць, ва ўсім Нясвіжы звінела напружаная цішыня.

— Нагуляўся? — сказаў нарэшце ціхім голасам бацька. Сын пры гэтых словах яшчэ ніжэй унурыў галаву.

— Напіўся маёй і матчынай крыві? — пачаў узвышаць голас старэйшы Радзівіл. Сынава галава схілілася ледзь не да бліскучай паркетнай падлогі.

— Зняславіў наш род? Плюнуў на магілы продкаў нашых? — павольна пачаў уздымацца з-за стала Радзівіл Сіротка. Хацеў ляснуць кулаком па стале, а потым і дурному сыну па твары. Ды Ян Юрый заплакаў, тоненька, з усхліпам, па-дзяцінаму. Гэта спыніла ўз'юшанага бацьку. Ён раптам успомніў, як маленькага трохгадовага Яна Юрыя ўджаліў проста ў шчочку чмель. Яны гулялі ў лузе над Ушой, і сын нахіліўся над яркай вельмі прыгожай кветкай.

— Ой, татачка! Ой, баліць! — бег тады да яго сын, залiваючыся горкімі слязамі, просячы дапамогі, шукаючы паратунку.

Ад такога ўспаміну Мікалай Крыштоф Радзівіл пакутліва зморшчыўся, колькі імгненняў стаяў і не ведаў, што рабіць. Затым перахрысціўся на абраз Дзевы Марыі, пазваніў у настольны залаты званочак. На парозе Рыцарскай залі адразу ж з'явіўся лёкай.

— Завезці княжыча ў Альбу, — амаль спакойным голасам загадаў Радзівіл.

Альба была прыгарадным фальваркам Нясвіжа, дзе Радзівілы пабудавалі свой дом. Акрамя яго тут стаяла каля дзесяці сялянскіх драўляных крытых саломаю хатак, вельмі прыгожых, нібы цацачных. Былі загоны і хлявы для быдла, студня з жураўлём, маленькія агародчыкі, лавачкі каля хатак.

Па ўсёй Рэчы Паспалітай квітнела мода на сарматызм, пакланенне продкам-сарматам, якія прыйшлі калісьці ў Еўропу з усходніх спякотных стэпаў і зрабіліся ваяўнічай гераічнай шляхтай. Уладарны культ апрашчэння, набліжэння да прыродных каранёў. Вось чаму пыхлівыя магнаты са сваімі капрызлівымі распешчанымі жонкамі на некалькі дзён пертвараліся ў звычайных хлопаў і хлопак, апраналі хлопскае адзенне, бралі ў белыя рукі сярпы і косы, старанна хадзілі за плужком, выганялі ў поле скаціну, жылі ў маленькіх драўляных хатках. Вядома ж, гэта была толькі гульня. Усе гэтыя «сяляне і сялянкі» цудоўна ведалі, што яны паны, гаспадары ўсяго жывога і мёртвага на гэтай зямлі, што варта ім толькі шчоўкнуць пальцам, і да іхніх ног упадуць дзесяткі рабоў і рабынь, каб неадкладна выканаць іхні самы нечуваны капрыз, бо недзарма спрадвеку кажуць: пан пануе, а хлоп гаруе. Але такою была мода, а ваяваць супраць моды ва ўсе часы лічылася і лічыцца безгустоўным. Самі сябе ўдзельнікі гэтага маскараду называлі на італьянскі манер пейзанамі.

Вось куды саслаў разгневаны Радзівіл свайго сына. Ян Юрый, пакорліва згадзіўшыся, падпарадкаваўшыся без аніякіх пярэчанняў бацькавай волі, жорстка памыліўся, калі палічыў, што ў Альбе ён таксама зробіцца на нейкі час бесклапотным пейзанінам. Усяго адну ноч пераначаваў ён у прыгожай хатцы. А назаўтра з самай раніцы з пышнай світаю зноў аб'явіўся ў Альбе Мікалай Крыштоф, грозны, халоднавокі, загадаў сыну выйсці на вуліцу. Яшчэ туман поўз па лагчынах, бялеўся, як гусіны пух. Нясмела пачыналі кукарэкаць пеўні. Непадалёку стары свінапас выганяў на пашу гурт пярэстых вісклівых свіней. Радзівіл узмахам рукі паклікаў яго да сябе. Пастух, хуценька здзёршы з лысай галавы брудную пакамечаную шапку-аблавушку, падбег да князя, нізканізка сагнуўся ў паклоне.

— Як завуць цябе? — спытаў Радзівіл.

— Міхаіла, — спалохана прашалясцела ў адказ.

— Вось гэты, — пальцам у залатых пярсцёнках тыцнуў князь на Яна Юрыя, — з сённяшняга дня будзе ў цябе за падпаска. Зразумеў?

У адказ было мёртвае маўчанне. Выцвілыя старэчыя вочы свінапаса напоўніліся невымерным жахам.

— Будзе тваім падпаскам, — княжы голас усё болей люцеў. — І пугі, пугі не шкадуй! Калі што не так зробіць, пугаю яго, пугаю! Вось гэтак!

Мікалай Крыштоф Радзівіл выграў з рук у старога пугу, шырока размахнуўся і з усяе сілы шлегануў, але не сына, а самога свінапаса. Той скурчыўся ад болю. Раскошная яркая світа начале з нясвіжскім ардынатам велічна развярнулася і паехала ў палац. На вясковай туманістай вуліцы засталіся толькі свінячы пастух, княжыч Ян Юрый і мітуслівыя вечна галодныя свінні.

Канцлер Сапега вельмі цёпла сустрэў новага палкоўніка, павіншаваў, доўга цісnуў намазоленую эфесам шаблі далонь. Потым распытваў пра кірхгольмскую бітву, цікавіўся, ці праўда, што шведы вельмі выдатныя ваяры.

— Праўда, пане канцлер, — з усёй шчырасцю адказваў Лісоўскі. — Хацеў бы я, каб у мяне былі такія. Яны як крэмень, як валуны. Стаяць да канца…

Потым канцлер загаварыў пра ўсходнія маскавіцкія справы, пра цара Дзмітрыя Першага Іванавіча, які шчасліва пазбег смерці ад рук людзей Гадунова і сядзіць на маскоўскім троне, хоць шмат хто называе яго Самазванцам ці Разстрыгаю. Загаварыў пра Смаленск, які яшчэ Вітаўт у свой час далучыў да Вялікага Княства Літоўскага, але Масква ў 1514 годзе зноў захапіла гэты крывіцкі горад.

— Крыўдна мне і балюча, — казаў канцлер. — Мы, Сапегі, са смаленскіх баяраў. Там нашыя спрадвечныя вотчыны, нашыя землі. Але нас выгналі адтуль, выгналі ненаедкі-ненасытнікі, якім заўсёды чагосьці не хапае. Кітайскі правіцель Шан Ян яшчэ за трыста гадоў да нараджэння Хрыстова пісаў: «Калі людзі дурныя, можна ўладарыць над імі пры дапамозе розуму; калі ж людзі разумныя, можна ўладарыць над імі толькі пры дапамозе сілы». Маскоўскія цары прызнаюць і паважаюць толькі сілу. Вось таму і мы павінны быць моцнымі, быць адважнымі і рашучымі. Сёння спрыяльны момант, каб вярнуць назад усё забранае ў нас сілай. «Ex unque leonem» — Па кіпцюрах пазнаюць льва. Так што не заплывай лішнім тлушчам, пан палкоўнік, рыхтуйся і рыхтуй сваіх людзей — неўзабаве пойдзем на Маскву…

ФРАГМЕНТЫ

# ІДЗІ І ЖЫВІ!

Алесь ПАПЛАЎСКІ

**Урывак з аповесці «РАЗМОВЫ СА СТОДЗІВАМІ»**

Жыццё пачынаецца з хлусні, дробязнай і бяскрыўднай. З жыццесцвярджальнага, спакуслівага: «Усю-усю-усю!..». Ты хочаш есці ды інстынктыўна цягнешся да белай выспачкі цела, што прывідна ўздрыгвае ў бездані-выразе мамінай блузкі, і натыкаешся на гэтае п'янкое, шматабяцальнае: «Ах ты, маё любінятка!..». Слязлівасць імгнення сціраецца ўсмешкай. Як мала нам патрэбна насамрэч! Але ты патрабуеш большага. А значыць, недазваляльнага. Твой рот затыкаюць сувенірнай пустышкай, і гаркавы прысмак гумы крадзе на невызначаны час голад. З узростам імкненне да недазволенага робіцца неабходнасцю. Імклівасць, хуткаплыннасць і разнастайнасць жыцця агаломшваюць цябе. Ты губляеш арыецірыТы не здольны выяўляць ужо, хто хлусіць табе, а каму хлусіш ты. Гэта сведчанне таго, што ты стаў дарослым. Цяпер і табе дазваляльна ўсё. Ты захапляешся сваёй самадастатковасцю. Выстаўляеш напаказ свае пачуцці. Твой вопыт — узор для перайманння. Насамрэч, гэта тое, без чаго можна з лёгкасцю абысціся. Пераважная большасць мерае жыццё іншымі меркамі. Але ты да іх ліку сябе не далучаеш. Ты перакананы, што ты іншы. Так склалася. Стала звычкай. Неабходнасцю. Даведзеным да абсурду імкненнем да спазнання мудрасці, пра якую некаторыя яшчэ нават і не здагадваюцца. Ты спяшаешся, робіш памылкі. Табе зайздросцяць. Ты губляеш сяброў. Усё мае свой кошт. Ты ігнаруеш створаны самім сабой вакуум і сілішся запаўняць яго абы чым. Верагодна, гэтак жа спяшаецца вязень, які толькі што вярнуўся на волю з-пад варты. Жыццё толькі-толькі пераваліла за трыццаць, а ты выразна ўжо адчуваеш на сваёй патыліцы ледзяное дыханне адзіноты. Разуменне таго, што прайшло яно пераважна ў пошуках чужых памылак, неаспрэчнае. Цяпер ігнаруюць цябе. Цяпер абыходзяць бокам цябе. Не ўспрымаюць… І ты змушаны з гэтым жыць. Ты злуешся. Яно і не дзіва. Быць навідавоку для цябе — значыць быць незаўважным. А скрытнасць для такіх, як ты, аматараў назіраць за чужым жыццём — галоўная ўмова існавання. Толькі хто падкажа табе, што ты і ёсць тая памылка, якую шукаеш вось ужо палову жыцця ў іншых?..

— Усё роўна цябе пацалую! Ляля!..

Гэтая юродзівая спыняе цябе кожны дзень. Яна мае звычку матэрыялізавацца там, дзе яе не чакаюць. І табе нічога не застаецца іншага, акрамя як выціраць ад яе бязмэтнай вар'яцкай усмешкі. Нібыта ад агіднага пляўка. А яшчэ ад погляду. Бачылі б вы яе вочы! Але ты здольны прыняць ад яе любыя абразы. Ты перакананы, што дэманы, якія жывуць у душах вар'ятаў, адкрываюць утоеныя ад людзей ісціны.

— Усё роўна цябе пацалую! Ляля!.. — завіхаецца вакол цябе ў рытуальным танцы вар'ятка і цягне да твайго твару парэпаныя брудныя пальцы.

Вузкая стужка асфальту, шчыльна заціснутая з двух бакоў будынкамі. Містычны свет звыклай агіднай сімволікі… І ніводнай жывой душы. Толькі ты і яна, — жахліва рэальныя ў гэтым свеце. Усё, што павінна адбыцца, адбудзецца! Змірыся! Прайдзі праз гэта! Уяві, што цябе тут няма… Адчуй сябе вар'ятам! Рабі што-небудзь!..

— Усё роўна цябе пацалую! Ляля!..

Ты ў'яўляеш свой знявечаны ў дзяцінстве твар, — вынік гісторыі, якую наўмысна ўтойваеш ад сябе, — і злуешся. Ты не здольны прыняць гэтае крыўлянне за ісціну. «Не зараз, Біллі! Не цяпер…»

— Не цяпер, Біллі! — шэпчаш ты. — Не цяпер!

Рэха вяртае твой голас. Ты чуеш, як ён дрыжыць. Ты адрываешся ад думак і недаўменна глядзіш на вар'ятку. Табе хочацца плюнуць ёй у твар. Біллі!? Так… Ты звыкся з гэтай мянушкай. Яна прыклеілася да цябе неадчэпна. Яна сцёрла тваё сапраўднае імя. Ты адгукаешся на яе. Яна таксама адтуль, з той, незабытай табой, гісторыі. Білл!.. Біллі!.. Дэбіл… Чаму дэбіл?… Калі-небудзь ты раскажаш нам сваю гісторыю? Калі-небудзь…

— Не цяпер.

Вар'ятка спрабуе злавіць цябе за руку.

— Цяпер!.. — захлёбваецца яна несапраўдным рогатам.

— Пудзіла!..

— Мы-гы…

— Пудзіла! — ламантуеш ты ашалела. Ці ёсць хто-небудзь дзе-небудзь, хто зразумее цябе?

Застылае ў карцінная нерухомасці наваколле. На твары вар'яткі цень стомленасці. І ўпартасць. Час канчаць з гэтым.

— Усё роўна цябе пацалую! Ляля!..

Хопіць… Далей — цішыня.

Вочы тлумачаць усё. Словамі можна выказаць толькі тое, дзеля чаго яны існуюць. Ты і ёсць лялька. Аднавокае пудзіла з тварам, спярэшчаным глыбокімі зморшчынамі, з ранамі, якія ніколі не загояцца. «Жыццё само за цябе ўсё вырашыць. Ідзі і жыві!..»

Ты ненавідзіш яе. Не за вар'яцтва, ведома, а за тую рознасць, якая ляжыць паміж вамі вякамі, за тое нахабнае навязванне сябе Свету. Ты перакананы, гэта і ёсць выкрыццё ілжывай яго Мудрасці. Час!.. Дзе і як ад цябе схавацца? Элі, элі, лама сабахтані?..

Ты растаптаны сваёй пасіўнасцю. Бо хто хоча стаць мудрацом, той мусіць нарадзіцца вар'ятам. Так склалася гістарычна…

СТРЭМКІ

# ДАГОНІМ АМЕРЫКУ, БОСЫМ ВЕСЕЛА БЕГЧЫ

Вячаслаў ДУБІНКА

У гады панавання Хрушчова-кукурузніка раёнкі былі натакаваны Мікітавымі парадамі і мудрымі тэзамі, як біклага вясёлай брагай. У райгазеце Любані, дзе я працаваў фотапекарам «булак», а гэта перадавікі масласырзавода, ратнікі сельгасбітваў, у кожным нумары адказны сакратар, крыху «паэт», змяшчаў свае вершаваныя партпрыпеўкі і «працоўныя» гуканні да камуніі.

— У нашай райгазеце, як у ленінскім дэкрэце, — жартавалі дасціпныя літрабы, перачытваючы штодзённыя партдэпешы, якія кідаліся ў райпраўду ад абласных і цэнтральных парткухараў.

Прыгадваецца надзвычай ходкая ўзнёслая шапачка раёнкі. «Новая праграма ў камунізм вядзе прама». Якраз у галаве Мікіты саспела мудрая «дрындушка». Пра тое, як праз чатыры пяцігодкі кожнаму савецкаму чалавеку будзе жрачкі ад пуза на кожнага едака — будаўніка камунізма, разяўляй шырэй галодны рот… Я не партчлен, але разам з партыйцамі спяшаўся ў камунію, фотаплёнкі не шкадуючы. Гойсаў усюды, дзе радзіла бульба, каласілася збожжа, даіліся кароўкі, свяціла савецкае сонца. Райпраўда даносіла звонкае слоўца партыйнае ў кожную хату, асабліва натхняла тых, хто асушаў любанскія балоты, высекшы нямала лесу. У той жа год у Новым Ёрку Мікіта ўрэзаў пыхлівай Амерыцы ў яе ж «хаце», пад дых! Пра ракеты, якія мы кляпаем, як каўбасы. І пахваліўся, што новае пакаленне савецкіх людзей будзе жыць пры камуніі! І, як па завядзёнцы, кожны партчлен і неахоплены партшэрагамі савецкі чалавек неяк задумліва плюсаваў да свайго ўзросту яшчэ «дваццатнік», пасля якога ўжо і камунія, усцешваўся:

— Дажыву!

Любаньская раёнка «Будаўнік камунізма» штодня, пяць разоў на тыдзень, гукала:

— Любанцы за ўдарны намалот. Любанцы — дамо 500 цэнтнераў бульбы з аднаго га. Уляжам за Амерыкай, любанцы!

І ўляглі. За пыхлівай Амерыкай. Бальшавіцкім слоўцам, агіткай агністай, намалотам прапагандысцкім. За вёсачкай Радкава адна дарога запрашала ў багаты слуцкі край, другая кіравала на беднаватую Старобіншчыну, трэцяя збочвала на «кузьню» ўрадлівасці — «Беларуськалій». На раздарожжы быў прысабачаны вялізны, каб амэрыканцы і з космасу зыркалі, бігборд. Задзірысты бычок, хвост у космас задраўшы, цвяліў і, ведома каго: «Держись, корова из штата Айова!».

Кожны блін газетнае райпраўды ішоў з новай прапагандыскай расчынкай. У тыя гады і, праўда, шпарка пачалі, Амерыка задыжала. У космас запусцілі хлопца Юру, савецкія цюцькі бадзёра адгаўкалі сто восем гадзінаў у касмічным бязмежжы. Простая савецкая дзяўчына хораша спявала на арбіце. У нас і балет з увішнымі лябёдачкамі — самы, самы. Пра ракеты з каўбасамі прыгадвалі. Гармонік знайшоўся, калі бубны прывезлі. Салоўкі заспявалі — музыкі акрыялі. Весела даганялі Амерыку.

А мой бацька Андрэй, слухаючы Мікітаву харчпесню пра камунію, адно ўсміхаўся, паўтараючы:

— Ліха тваёй матары! Дагонім Амерыку, босым бегчы лёгка!

## Сляпы і дурны дарогу не агораюць

Гукае мяне рэдактар «Звязды» і без прадмоў:

— Вайскавыя гулянкі пачаліся, манёўры, калі хочаш. Халастымі гасяць, але ўсё, як у жыцці. Фоткі зробіш. Гані ў Стоўпцы, там знойдзеш кампалка, палкоўніка, сынок гэтага, — рэдактар ледзь не шэпча прозвішча высокага партдзеяча, сакратара ЦэКа, — здымкаў наклапаеш, на поўны разварот дамо. А раптам спее, лупіцца новы Ракасоўскі, хто ведае, дзе чорт абедае і хто яму чарку падносіць.

Я дабраўся да вояроў. Баявыя калоны рушылі, войска схавалася ў лесе чорнай ночы. А дарогі на той час былі такія, што конь падковы пагубіць, перашкоды пераадольваючы.

А наперадзе войска «Ракасоўскі» ў навенюткай палявой форме, рашучы камандзір, кампалка. А куды ж вы байцы папылілі? Там Макар цяляты пасе, на вясёлым гармоніку граючы. Усе камбаты, камроты, камузводы маўчаць, добра ж ведаючы, куды вядзе Сусанін — недавук, вылупак! Плеш пераеў бясконцымі прыдзіркамі, мацюкамі, хамствам. Недавучаны палкаводзец, бацька сынка бессаромна пхае. Усе маўчаць, што калона ідзе не туды, на «пагібель».

Уранні наваліліся «на ворага», даўбанулі, з саракапятак урэзалі, але самі атрымалі з засады. Ушчэнт прайгралі галоўную баталію, курам на смех. Прымчаў на газоне раз'ятраны камдзівізіі, вусаты двухметровы ўкраінец з Запарожскіх стэпаў, генерал Пахрыпчанка. Адвёў салагу-палкоўніка ў цішэйшы куток і голасна, каб усе чулі, уліў «Ракасоўскаму»:



— Ты куды людзей пагнаў?! Прэш на Чырвоную Слабаду, а паклаў полк пад Старымі Дарогамі! А калі б баявая аказія, табе і каюк! А колькі такіх, як ты, у вайну людзей спляжылі! Усю Еўропу хвалёны маршал Жукаў угнаіў трупамі салдат і афіцэраў, а такія, як ты, дапамагалі.

Пакідаючы баявую перамоджаную адзінку, прагаварыў здзекліва:

— Сляпы і дурны дарогу не агораюць.

## На Славянскім базары ад кайфа бык ацеліцца, а певень яйка знясе

Цягнік спяшаецца з расейскай сталіцы ў беларускую «тундру». У купэ атабарыўся дробны чынавенскі люд. Усе чыны з міністэрства расейскай культуры спяшаюцца на Віцебск. Не на конскі, а на славянскі базар. І пазамінулае, і мінулае гасцяванне на базары ім вельмі спадабаліся. Удаўся «праздник» славянскай душы. І штогод ён усё званчэй. Шчырую бяседу расейскіх культурнікаў натхніў трэці «пузырёк» маскоўскай. Маскоўцы не стамляюцца вандраваць па Віцебскаму «спеўніку». Якіх толькі гісторый не пачуў я за некалькі гадзін, і ўсе пра «праздник славянской души». І як бухалі без перадыху суткамі, кадрылі свежых цёлак, атрымалі шыкоўны прэзэнт ад Галоўнага, ікорку жралі ложкамі, «пивцо пили фрицевское», в «люксах любили этих самых звёзд».

Асабліва шчыравалі на мінулагоднім «празднику славяндуши» высокі, хударлявы «прэс-аташнік» культдэпартаменту багатае суседкі. І кожную карацельку-ўспамін пачынаў з усмешкай.

— Толькі начальнік мікрафон у рукі, я ўжо «закадрил хахлушку. А как стемнело, моя пышка з салом в шоколаде уже готовая. Пишем в актив. Солистка хора закарпацкого села Жеребчик».

Сатаварышы з культарнага дэпартаменту ўважылі яшчэ па адной. І вачыма на свайго культкарэфана: давай «трепись». А той даўно чакаў і без прадмоў:

— А мне попалася молдаваночка. Она впервые на базаре. Канистру чернила приволокла, виноградное, дамские пальчики. Зачернили, запели. Красиво пела, по-украински. Ах эта нічэнька, гарно, прегарно. Я же сам с Донеччины. Месяц за окном, а мы поём. Пора за дело, а голова не своя… Это надо так набраться. Винцо пилось хорошо, ударило по барабану. Закурили, а что делать дальше, не знаю.

▸ ГРЫФАМАНІЯ

# «ЖЫЦЦЁ НЕПРЫКМЕТНА ЗНІКАЕ…»

## ГУТАРКА ЭДУАРДА АКУЛІНА З АЛЕСЕМ КАМОЦКІМ

***Эдуард Акулін:** — Алесь, як казаў Анатоль Сыс, «пачні з Радзімы»… Бо акром таго, што ты родам з Барысава, я пра цябе амаль нічога не ведаю…*

***Алесь Камоцкі:*** — Сапраўды, я барысаўскі хлопец. Там я нарадзіўся. Там прайшло маё дзяцінства. Там я закончыў школу і там, дарэчы, у дзесятым класе ў мяне з’явілася першая гітара.

***Э.А.: — Мала каму вядома, што ты маеш дзве адукацыі. Спачатку была вучоба ў Маладзечанскай музычнай вучэльні, калі не памыляюся — па класе кларнета, а пасля філасофскі факультэт БДУ. І ўсё ж урэшце рэшт музыка перамагла. Чаму?***

***А.К.:*** — Калі ты думаеш, што ў сувязі з гэтым у маёй душы адбылася Грунвальдская бітва, ты глыбока памыляешся. Для мяне гэтыя два паняцці мірна суіснуюць. Больш за тое, я лічу, што музыка, песня можа мець філасофскае гучанне, і наадварот, філасофскі трактат часам гучыць як музычная араторыя…

***Э.А.: — Хто ці што падштурхнула цябе да бардаўскай дзейнасці?***

***А.К.:*** — У сярэдзіне сямідзесятых гадоў я ўпершыню ўбачыў па тэлевізіі Грушынскі фестываль і быў вельмі ўражаны, што звычайная бардаўская песня здольная збіраць пад сваім сцягам дзесяткі тысяч людзей. А потым было захапленне творчасцю Акуджавы, Нікіціна, Доліна…

***Э.А.: — Ты імкнуўся пераймаць іх манеру выканання?***

***А.К.:*** — Не. Я проста спяваў іхнія песні, як падказвала мне маё сэрца.

***Э.А.: — Твой дэбютны альбом называўся «Першы сшытак»(1986). Ты выконваў песні на словы У. Караткевіча, М. Багдановіча, Я. Сіпакова… І ніводнай песні на ўласны тэкст! Ці памятаеш ты сваю першую песенную ластаўку? Які гэта быў год?***

***А.К.:*** — Дакладна не памятаю. Здаецца, 82 ці 83-ці год.

***Э.А.: — І як называлася твая першая песня?***

***А.К.:*** — Нешта пра туманы…

***Э.А.: — Туманны адказ… Ад першага музычнага сшытка да першай «Спробы ісці па расе»(1997) — твайго першага зборніка вершаў, прайшло адзінаццаць гадоў. Гэта ладны кавалак жыцця. Чым ты займаўся ў гэты час? Толькі не кажы, што жыў…***

***А.К.:*** — Піў…

***Э.А.: — У 1999 годзе выходзіць твой альбом «Зорка спагады» , які ты напісаў цалкам на вершы Рыгора Барадуліна. Што для цябе дало творчае супрацоўніцтва з прызнаным майстрам беларускай паэзіі? Бо пэўны час існавала думка, што паэзія Барадуліна занадта складаная для музычнага ўвасаблення. Ці так гэта?***

***А.К.:*** — Я так не лічу. Музыка ў паэзіі Барадуліна закладзеная ад пачатку. Гэта душа Барадулінскага верша.

***Э.А.: — І як пачалося вашае творчае сумоўе?***



Алесь Камоцкі — бард, паэт, філосаф. Нарадзіўся 9 чэрвеня 1958 года ў Барысаве. У 1975–1976 гадах навучаўся па класе кларнета (Маладзечна). У 1977–1979-м служыў у войску. У 1986 годзе скончыў філасофскі факультэт БДУ. Жыве ў Мінску.

**Бібліяграфія:**

Спроба ісці па расе (1997)
Нападзяванае (2004)
48 (2007)
Глыбіня дажджу (2007)

**Супольныя праекты:**

Край (фотаальбом) (2005), фота Вадзіма Грудзько

**Дыскаграфія:**

Першы сшытак (1986)
Зорка спагады (1999), на вершы Рыгора Барадуліна
Псалмы (2000), на вершы Рыгора Барадуліна
Асяніна (2001), на філасофскія вершы Ганада Чарказяна ў перакладзе Р. Барадуліна
Дым (2002)
Дом (2003)
Дах (2006)
З бацькоўскай кружэлкі (2008)
9 (2009)

**Асноўныя супольныя праекты:**

Як усё ў жыцці (1998), на творы Уладзіміра Жылкі
Віно дажджоў (2002), на творы Уладзіміра Караткевіча
Паравіны году (2003), песні ў выкананні Змітра Вайцюшкевіча
Бывайце здаровы! Bella Ciao (2004), італьянскія песні па-беларуску, беларускія – па-італьянску
Месяц і сонца (2004), японскія песні па-беларуску.
Тое, што трэба (2008), песні ў выкананні Змітра Вайцюшкевіча

***А.К.:*** — Неяк мы разгаварыліся з дзядзькам Рыгорам. Я сказаў яму, што не магу пісаць «рамансную лірыку», бо Барадулін пасутнасці мяне апярэдзіў. А Рыгор Іванавіч паскардзіўся, што, на вялікі жаль, не валодае гітарай. Мы вырашылі аб’яднаць нашыя творчыя намаганні. І такім чынам нарадзілася песенная «Зорка», зорка нашай узаемнай спагады…

***Э.А.: — Наступным крокам вашага супрацоўніцтва стаў выхад сумеснага альбома «Псальмы».(2000 г.). Зварот да духоўнай паэзіі для цябе выпадковы эпізод у творчай біяграфіі ці нешта большае? Ведаю, што ў касцёле ты бываеш рэгулярна, я маю на ўвазе касцёл Сымона і Алены, у якім праходзяць твае канцэрты. А як часта ты бываеш у царкве, каб паразумецца з Богам? Ці дапамагае табе вера?***

***А.К.:*** — Праца над «Псальмамі» вялася паралельна з запісам «Зоркі спагады». Аб сваіх паразуменнях з Богам я не люблю гаварыць публічна. Лічу гэтую справу глыбока асабістай, нават інтымнай .У царкве бываю па святах: на Каляды, на Вялікдзень, на Тройцу і на Дзяды. Без веры не можна жыць. Бязвер’е забівае.

***Э.А.: — Апошнім часам «яркія прадстаўнікі» так званай найноўшай літаратурнай генерацыі публічна дэманструюць свой антыбеларускі цынізм. Я маю на ўвазе выказванні А. Бахарэвіча і М. Мартысевіч кшталту «мужык з батанічным псеўдонімам, які не ўмеў пісаць прозу», або «…Гісторыя Беларусі пісалася няўдачнікамі…» (Кароткая…Дык адным з культавых лузараў Вацлавам Ластоўскім), і ў тым жа шэрагу «мілыя няздары-сухотнікі Багдановіч, Канчэўскі…»… Хацелася б ведаць тваю думку на гэты конт. Хто для цябе — Кастусь Каліноўскі, Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Вацлаў Ластоўскі, Ларыса Геніюш? Ці падзяляеш ты думку яшчэ аднаго «выбітнога» рокера, што «беларускія пісьменнікі пішуць не па-людску». Каго ты лічыш сваім духоўным настаўнікам?***

***А.К.:*** — Гэтак гаварыць, усё адно як пляваць на бажніцы… А рокеру я параіў бы пачытаць прозу Гарэцкага, Чорнага, Мележа, Стральцова. Я не кажу ўжо пра паэзію. Гэта наш нацыянальны скарб. Мае духоўныя настаўнікі — пералічаныя табой людзі. Яны — не «лузэры». Яны нашыя нацыянальныя героі…

***Э.А.: — Алесь, колькі цябе ведаю, а ведаю ўжо амаль дваццаць гадоў, ты заўсёды стрыманы і спакойны, ветлівы і лагодны. Ты насамрэч такі ці толькі «прыкідваешся»? Бо, як кажуць, у ціхім балоце чэрці водзяцца… Ды і творчасць, асабліва бардаўская, гэта самаспаленне, самаўкрыжаванне… У сувязі з гэтым — ты азартны чалавек?***

***А.К.:*** — Я, як ты кажаш, не прыкідваюся. Я насамрэч такі. Не люблю жыццёвай мітусні. Азарт — гэта д’ябальская спакуса.

***Э.А.: — Вядома, што аднойчы, каб заваяваць прыхільнасць сваёй музы Марыны Ўладзі, Уладзімір Высоцкі выклаў падлогу гатэльнага нумару апельсінамі. На які рамантычны ўчынак здольны паэт і бард Алесь Камоцкі? Ці можаш згадаць нешта падобнае са свайго творчага лёсу?***

***А.К.:*** — Магу ,але не хачу. І наогул лічу ўчынкі такога кшталту неапраўданай бравадай. Магчыма, я больш прагматык, чым рамантык.

***Э.А.: — Ну а хоць кветкі ты любіш дарыць жанчынам?***

***А.К.:*** — Страшэнна люблю. І не толькі кветкі. Мне падабаецца ўвасабляць мары блізкіх людзей у рэальнасць.

***Э.А.: — Ты часта вандруеш па Беларусі, і не толькі, з канцэртнымі праграмамі. Ці можаш прыгадаць самы кур’ёзны выпадак з тваёй бардаўскай адысеі?***

***А.К.:*** — А чаму не сур’ёзны?

***Э.А.: — Жыццё і так занадта сур’ёзная рэч.***

***А.К.:*** — Згодны. А кур’ёзы здараліся… Аднойчы, пад час першага майго прыезду ў Варшаву, я даверыў несці гітару на канцэрт свайму сябру Багдану Сіманенку. І такім чынам мы выйшлі на сцэну. Спачатку Багдан, затым я. Вядома што публіка чалавека з гітарай прыняла за Камоцкага. Багдан сарваў неверагодную авацыю публікі. Гэта яму вельмі спадабалася, і ён паўтараў жарт пазней неаднойчы ў іншых месцах.

***Э.А.: — Апошні год у культурным жыцці Беларусі праходзіць пад сцягам кампаніі «Будзьма беларусамі!». Тваё стаўленне да гэтай ініцыятывы. Ці патрэбныя нам акцыі такога кшталту?***

***А.К.:*** — Гэта мая кампанія. Яе ўзнікнення я чакаў ад пачатку дзевяностых гадоў. Кампанія дапамагае мне жыць і тварыць, а таксама сустракацца з маімі слухачамі літаральна па ўсёй Беларусі.

***Э.А.: — Ведаю, што на працягу некалькіх гадоў ты быў адным з арганізатараў бардаўскага восені ў Бельску. Чаму ў апошнія два гады ты застаўся па-за фарматам табой жа выпеставанага дзецішча? Можа. настаў час вяртаць беларускую песню з вымушанай эміграцыі на Радзіму?***

***А.К.:*** — Таму і застаўся, бо апошнім часам «Бардаўскую восень» ператварылі ў камерцыйны праект. Яе арганізатарам усё адно: ці гэта песенны фестываль, ці чэмпіянат Беласточчыны па збору трускавак, — абы адбіць «бабло»… А беларуская песня, па-мойму, ужо вярнулася на Бацькаўшчыну з дапамогай кампаніі « Будзьма беларусамі!».

***Э.А.: — Неаднойчы быў сведкам, з якой любоўю і павагай да цябе ставяцца маладыя творцы. Ты сябе паводзіш з імі, як гуру, ці гэта прыязнасць узаемная? Каго з маладых беларускіх бардаў ты мог бы назваць сваімі вучнямі?***

***А.К.:*** — Гэта Анатоль Сыс быў «гуру» для маладых. А я стаўлюся да іх як да роўных. І стараюся навучыць іх жыццю на ўласных памылках.

***Э.А.: — На тваіх?***

***А.К.:*** — Так. На сваіх яны яшчэ паспеюць навучыцца. А таленавітай моладзі сёння шмат. Назаву толькі некаторых: Павел Кузін, Таня Беланогая, Алесь Наркевіч…

***Э.А.: — Мне вельмі імпануе твая канцэпцыя назову сваіх твораў. А найбольш твой музычны трыпціх: «Дым», «Дом», «Дах». Але ў апошні час ты з лексічных пераішоў на матэматычныя назвы. Я маю на ўвазе твой паэтычны зборнік «48» і новы песенны альбом «9», прэзентацыя якога адбылася 9.09.2009 года ў канцэртнай зале Мінск. Гэта выпадковы збег лічбаў ці свядомая спроба астральнай варажбы?***

***А.К.:*** — Мне падабаецца шаманіць з лічбамі.

***Э.А.: — А не баішся, што з нябёсаў 9.09.2009 чытаецца ў перакуленым выглядзе?***

***А.К.:*** — Спадзяюся, што Той, хто чытае з нябёсаў, ведае, як правільна гэта рабіць…

***Э.А.: — Ты маеш яшчэ адзін незвычайны музычны праект: альбом «З бацькоўскай кружэлкі». Запісваючы яго, сабе ў суаўтары ты ўзяў М.Ісакоўскага, А.Пахмутаву, М.Матукоўскага… Не страшна было спаборнічаць з мэтрамі расійскай песні. І наогул, як гэты праект быў успрыняты публікай?***

***А.К.:*** — Я ні з кім не спаборнічаў… Проста рабіў сваю справу. На маё ўласнае здзіўленне, праект вельмі прыхільна быў сустрэты публікай. Некаторыя мне не вераць, але літаральна за пару месяцаў разышоўся тысячны наклад кружэлкі…

***Э.А.: — «Вось так сядзець, калісь, і бачыць дождж… // Да вечара, які калісьці будзе, // Кудысьці пазнікалі дні і людзі. // Ёсць толькі дождж // І ўпоперак, і ўдоўж…» Гэта з твайго верша са зборніка «48». Мяркуючы па ім, цябе можна назваць «чалавекам дажджу». Я дзесьці чытаў, што людзі, закаханыя ў дождж, вельмі шчаслівыя. Ці лічыш ты сябе «шчаслівым» лёсу? Калі б была магчымасць пражыць жыццё яшчэ раз, ці ўвайшоў бы ты ў другі раз у той самы дождж?***

***А.К.:*** — На жаль, такой магчымасці не падвернецца. А наогул, я не шкадую ні аб чым. І калі б з’явілася магчымасць увайсці ў той самы дождж, не раздумваючы, зрабіў бы гэта, асабліва калі б гэта быў дождж першага кахання, дождж маёй маладосці…

### Мітусня

*Словы і музыка*
*Алеся Камоцкага*

*Em Am*
*Я з гадоў пережытых помню*
*H7 Em*
*Мітусню каляровых дзён,*
*Em Am*
*Пошук выйсця і шлях дадому,*
*H7 Em*
*І гуканне наўздагон.*
*Em Am*
*І памылак былых атрута*
*H7 Em*
*З цягам часу губляе смак —*
*Em Am*
*Што калісьці было пакутай*
*H7 Em*
*Таго проста ўжо няма.*

*Я, бывае, блукаю летам*
*За ўспамінамі след у след,*
*Я, бывае, гляджу без мэты*
*То ў люстэрка,*
*то на*
*партрэт.*
*А, бывае, сябе здзіўляю*
*І ў доўгім жыцці надзей*
*Я спакою сабе шукаю*
*З цягам часу ўсё часцей.*

## ДЗЕЯПІС

**Сяргей Астравец. Каты Ёзафа Ратцынгера: апавяданьні, эсэ, зацемкі, рэпартажы з Горадні. — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2009. — 248 стар. — (Кнігарня «Наша Ніва»). Наклад 200 ас.**



Мяжу, дзе заканчваецца Сяргей Астравец-пісьменнік і пачынаецца Сяргей Астравец-журналіст, заўважыць амаль немагчыма. Проза ягоная ўяўна дакументальная, публіцыстыка — умоўна мастацкая... Асабліва гэта датычыць тэкстаў новай кнігі. Большасць з іх друкаваліся напрацягу апошніх дзесяці-пятнаццаці гадоў у тыднёвіку «Наша Ніва», але ў адрозненне ад іншых журналісцкіх тэкстаў «на патрэбу дня» ніколькі не састарэлі, менавіта дзякуючы сваёй мастацкасці. Гарадзенцы пазнаюць сябе і свой час у апавяданнях і эсэ, у рэпартажах і зацемках — і некалі паставяць аўтару гэтай кнігі помнік.

**Анатоль Вярцінскі: выбраныя творы; Уклад., камент. А. Вярцінскага: прадм. В. Русілкі. — Мінск: Кнігазбор», 2009. — 528 стар.: [8] с. іл. — («Беларускі кнігазбор»: Серыя 1. Мастацкая літаратура). Наклад 1000 ас.**



Сорак шосты том кніжнага праекту «Беларускі кнігазбор» склалі выбраныя творы Анатоля Вярцінскага, чыё імя не патрабуе каментароў і эпітэтаў: знаны, знакаміты, выбітны, вялікі... Анатоль Ільіч паэт боскім талентам адабраў у гэты зборнік сваё самае-самае: вершы, паэмы, драматургію, публіцыстыку, літаратурную крытыку. Але галоўнае — вершы, з якіх так і праменяць маладосць і мудрасць, любоў і жарсць, сіла і моц, і неўтаймоўнае жаданне:

*Знайсці б які пакойчык кутні*
*і там, забіўшыся ў куток,*
*аддацца радасці пакутнай –*
*пісаць: радок! Яшчэ радок!*

**Ніл Гілевіч: выбраныя творы; Уклад., камент. Н.Гілевіча: прадм. У.Конана. — Мінск: Кнігазбор, 2009. — 600 стар.: [8] с. іл. — («Беларускі кнігазбор»: Серыя 1. Мастацкая літаратура). Наклад 1000 ас.**



Сорак восьмы (!) том кніжнага праекту «Беларускі кнігазбор» таксама сабраў і склаў сам аўтар — Ніл Гілевіч. Уладальнікам гэтай кнігі можна толькі пазайздросціць: апроч выбраных вершаў у адным томе яны маюць і славуты раман у вершах «Родныя дзеці», і непаўторныя паэмы «Лодачкі» і «Заручыны», і знакамітую аповесць «Пераджыўшы вайну», і легендарныя эсэ пра славутых дзеячаў літаратуры, і... гілевічаўскую публіцыстыку...

**Сергей Дубовец. Русская книга: второе издание. — Минск: И.П.Логвинов, 2009. — 132 стар. — Наклад 1000 ас.**



Гэтая кніга прайшла выпрабаванне часам і зноў стала... кнігай. Перавыдадзены праз дзесяць гадоў зборнік тэкстаў Сяргея Дубаўца, напісаны для ягонага «рускага брата» па-руску, ані не страціў сваёй актуальнасці. Гэта добра для аўтара, калі ягоныя кнігі не старэюць з часам. Гэта кепска для дзяржавы, калі сітуацыя ў ёй застыла настолькі, што час спыніўся. Падобныя кнігі, як верныя спадарожнікі, вяртаючыся да нас, павінны абуджаць нас і прымушаць задумацца: штосьці, пэўна, не так, калі боль не праходзіць... І няхай яны перавыдаюцца яшчэ не раз, але не таму, што «не страцілі актуальнасці», а як адбітак часу — таго...

**Павел Савоська. Апошні сезон: аповесці, апавяданні. — Мінск: Галіафы, 2009. — 398 стар. — Наклад 200 ас.**



Біяграфія Паўла Савоські — сама раман: «працаваў настаўнікам, экскаватаршчыкам, грузчыкам, плытагонам на лесанарыхтоўках у Сібіры, горным майстрам на Чукотцы, геолагам у старацельскіх арцелях «Дальняя» і «Мінерал», займаўся бура-падрыўнымі работамі на Паўночным Урале, Казахстане і Латвіі, журналістам у газетах «Культура» і «Кнігарня»...». Ці варта казаць, хто героі яго новай кнігі? Вядома ж, «людзі, якія трапляюць у складаныя ўмовы жыцця... людзі неспакойныя, яны не ўмеюць прыстасоўвацца, шчыра вераць у перамогу светлага...». У кнігу ўвайшлі тры аповесці і трынаццаць апавяданняў, якія не пакінуць чытачоў абыякавымі да лёсу і ўчынкаў герояў твораў.

ПОЗІРК

# ТАПАНІМІКА

Уладзімір СЦЯПАН

**Я жыву ў цэнтры горада, на праспекце. Усе падзеі адбываюцца навідавоку. Мітынгі, аўтамабільныя аварыі, праезды-пралёты замежных гасцей, каталікі колькі разоў на год праходзяць пад вокнамі, дарогу кветкамі пасыпаюць… Вось моладзь у Купалаўскім скверы апошнім часам падушкамі б’ецца — імітуе лёсавызначальныя для зямлі беларускай падзеі, прастытуткі, калі цямнее, пад вокнамі п’яна смяюцца ўсю ноч, а, бывае, плачуць, з кліентамі сварацца… Словам — праспект, што з латыні, як перспектыва перакладаецца. Можна кіно здымаць. Вядома, дакументальнае…**

Чатыры гады таму вёў дачку ў школу, праз двор. Тады яшчэ двары не былі, як цяпер, упарадкаваныя і чысценькія, забрукаваныя. Але і школа, і дом, і сметнікі свае месцы не змянілі. Як і мой ЖЭС-34. Карацей, статус-кво захаваўся. На нашым сметніку чаго толькі не бывае. І тэлевізары з маленькім экранчыкам, и радыёлы часоў працы Лі Харві Освальда на мінскім радыёзаводзе, і лядоўні аэрадынамічных формаў, і разламаныя камоды, карэльскай бярозай інкрустываваныя, шынялі генеральскія, боты хромавыя, кніжкі, старыя газеты, унітазы… Дык вось — тым разам побач з брудназялёнымі кантэйнерамі стаялі металічныя шыльды, цёмна-сіняй эмалевай фарбай паблісквалі, белымі літарамі на мяне глядзелі. Прачытаць прымушалі.

Я прыпыніўся. Задумаўся. Шыльдаў было штук восем. На кожнай надпіс «ПРАСПЕКТ ФРАНЦІШКА СКАРЫНЫ» і нумары дамоў. Ну, вядома розныя. Здагадацца не цяжка, хто паздымаў і на сметнік занёс — ЖЭС побач. Хацеў сфатаграфаваць, хацеў у якую вольную газету патэлефанаваць, хацеў у кватэру адзін прынесці, да сцяны прышрубаваць, каб на доўгую памяць.

Раззлаваўся тады на ўладу. Быў праспект у гонар славутага беларуса-асветніка названы. А тут і на табе…



Ну, а якімі яшчэ колерамі можна незалежнасць дэкляраваць. Правільна, толькі чырвонымі літарамі па белым!

Сталінскі, Ленінскі, Скарыны… Так павялося, праз увесь час, што праспект існаваў, яго чым-небудзь прозвішчам называлі. Традыцыя склалася. А тут традыцыю зламілі, назвалі — праспект Незалежнасці. Як не абурыцца. Галоўная вуліца горада, сталіцы… Шмат злосных пытанняў круцілася ў галаве, гатовыя былі з языка зляцець.

Праз дзень сінія шыльды са сметніка зніклі. Хто знёс, куды? Не ведаю. Новыя шыльды з’явіліся на будынках. Дзіўна, але атрымаліся яны белачырвона-белымі, як сцяг старажытны. І думаецца мне, што гэта было зроблена не па неабачлівасці, а на падсвядомасці. Ну, а якімі яшчэ колерамі можна незалежнасць дэкляраваць. Правільна, толькі чырвонымі літарамі па белым!

Прайшло чатыры гады. Жыхары і госці сталіцы прызвычаіліся да новай назвы праспекта. Калі і згадваюць мінулую, то без абурэння. І Францыск Скарына нікуды не знік, стаіць сабе побач з Нацыянальнай бібліятэкай.

Кажуць, што праспект перайменавалі па шматлікіх просьбах працоўных і ветэранаў. Можа яно і так. Але не ўпэўнены, што ветэраны прыдумалі такую новую назву, як «Праспект Незалежнасці». Гэта іншы стыль мыслення.

Усе ведаюць, што імя ўплывае на лёс чалавека і яго паводзіны. Пра гэта шмат пішуць і гавораць. Назва ўплывае часам і падсвядома. Прымушае і вымагае пэўных паводзінаў і светабачання.

І яшчэ што падумалася. Назвы праспектаў, вуліц і гарадоў, дадзеныя ў нечы гонар, мяняюцца лёгка. Прыкладаў хапае. А вось такую назву як «Праспект Незалежнасці» змяніць цяжка. Гэта толькі захопнік-акупант такое кашчунства можа зрабіць. Каб канчаткова прыніціць і зняважыць. Улада, якая існуе, адмовіцца ад слова «НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ» не зможа.

Імчаць па праспекце Незалежнасці картэжы замежных гасцей. Турысты прагульваюцца, мінчукі ходзяць.

Некалькі дзён таму заўважыў на сметніку пару вялікіх палітычных мапаў. Тых яшчэ, дзе адна шостая чырвоным зафарбаваная, а Беларусі амаль не відаць.

http://naviny.by

РЭКЛАМА

## БЕЛАРУСКАЯ ПРАСТОРА

Шаноўнае спадарства!

Вітаем вас на старонках новай беларускай інтэрнэт-крамы Prastora.by! У нас можна замовіць кнігі, музычныя дыскі, аўдыёкнігі, відэа ды іншыя беларускія тавары.

Калі ласка, заходзьце і замаўляйце! Упадабаныя тавары вы атрымаеце поштай, дастаўка дзеіць па ўсёй Беларусі.

Будзем радыя атрымаць ад вас свежыя ідэі, заўвагі і прапановы наконт працы інтэрнэт-крамы Prastora.by. Калі ласка, дасылайце іх нам праз форму зваротнай сувязі.

Пашырайма Беларускую Прастору разам!

З павагай – каманда Prastora.by




Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 280-17-91. Мінск-25, а/с 91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 6 СНЕЖНЯ, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**07.45** Камедыя «Каштоўны падарунак» (СССР).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** Арсенал.
**09.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.50** Альманах вандраванняў.
**10.15** Культурныя людзі.
**10.55** «У свеце матораў».
**11.30** «Nota Bene».
**12.10** Залатая калекцыя савецкага кінематографа. «Белы Бім Чорнае Вуха» (СССР). 2-я серыя.
**14.00** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**14.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Відэафільм АТН «Швецкі стол з модным меню... у Гётэборгэ».
**15.55** Камедыя «А як жа Боб?» (ЗША).
**18.00** Суперлато.
**19.15** «Off stage life» з Андрэем Усмалам.
**19.30** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна). Фільм «Міхаіл Круг. Жыццё ў стылі 90-х».
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоу.
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.10** «Зорныя танцы». «Жаночы сезон».
**23.40** Дэтэктыўны трылер «Пакой страчаных цацак» (Расія).

### АНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** «Хто ў хаце гаспадар?». 2005 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі» з Дзмітрыем Крыловым.
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** Фазэнда.
**11.40** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.00** АНТ прадстаўляе: «Песні Перамогі».
**13.30** Нядзельны «Ералаш».
**13.55** Камедыя «Дзеці панядзелку».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга.
**18.45** АНТ прадстаўляе: «Бітва тытанаў».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** «Вялікая розніца».
**22.50** Гарык Сукачоў. «5:0 на маю карысць». Юбілейны канцэрт.

### СТВ

**07.10** «Агенцтва». Камедыйны серыял.
**08.00** «Кіно»: «Ноч у бары Макула». ЗША, 2001г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.30** «Добры дзень, доктар!».
**14.00** «Прыватныя гісторыі».
**15.00** «Залатая калекцыя»:
**16.15** «Рэальны спорт».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.20** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** «Фільм тыдня»: «У адзін бок». Германія, 2006г.
**22.50** «Прафесійны бокс».
**23.50** «Арт-хаўс»: фільм рэжысёра Джані Амеліа «Ключы ад дома». Германія-Францыя-Італія, 2004г.
**01.40** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**02.25** «Сімпсаны». Мультсерыял.

### ЛАД

**06.55** Мір вашаму дому.
**07.05** Благавест.
**07.35** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.00** Меладрама «Цёмны бок сонца» (ЗША - Канада).
**09.45** Кінапробы.
**10.05** Школа рамонту.
**11.05** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**11.55** Біятлон. Кубак свету. Эстафета. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**13.30** Бухта капітанаў.
**14.10** «Правы чалавека». Аўтарская праграма Яўгенія Новікава.
**14.25** Гаспадар.
**14.55** Біятлон. Кубак свету. Эстафета. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**16.30** Фантастычны серыял «Эўрыка».
**17.25** Прыгодніцкі фільм «Сутычка ў небе» (ЗША).
**19.35** Нашы тэсты.
**20.10** Экспедыцыя.
**20.50** Тэлебарометр.
**21.10** Трагікамедыя «Простыя рэчы» (Расія).
**23.25** Свая музыка. Працяг.
**23.50** Пасоўванне+.

### РОССИЯ

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.25** Мультфільм.
**07.35** Фільм «Адкрыццё».
**09.00** «Карасі». Расія, 2008 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** Фільм «Пуцёўка ў жыццё».
**14.00** Весткі.
**14.20** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**15.25** «Набожная Марта». 2-я серыя.
**16.55** Прэм'ера. «Ізмайлаўскі парк». Вялікі гумарыстычны канцэрт.
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Сумленны дэтэктыў». Аўтарская праграма Эдуарда Пятрова.
**20.40** Прэм'ера. «Лепшыя гады нашага жыцця».
**22.40** «Адмысловы карэспандэнт».
**23.50** «Туды, дзе жыве шчасце». Расія, 2006 г.
**01.35** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.25** Меладрама «Пясочны дождж».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет» з Цімафеем Бажэнавым.
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ядзім дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Змаганне за ўласнасць».
**11.20** «Асабліва небяспечны!».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Савецкія біяграфіі». Анастас Мікаян.
**14.15** Прэм'ера. «Некалькі зманлівых дзён».
**16.00** Сёння.
**16.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вярнуць на дасведаванне».
**19.00** Сёння. Вынікова праграма.
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень.
**21.05** «Сеанс з Кашпіроўскім».
**22.10** Авантурная камедыя «Маскоўскі жыгала».
**00.05** «Авіятары».
**00.35** «Футбольная ноч».

### EUROSPORT

**09.00** Ветразевы спорт. Рэгата «World Match». Прамая трансляцыя.
**11.00** «Снежны выходны». Агляд. Часопіс.
**11.05** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Трондхейм). HS 131.
**12.00** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Астэрсунд). Мужчыны. Эстафета. Прамая трансляцыя.
**13.45** Лыжнае дваяборства. Кубак свету ў Нарвегіі (Трондхейм). Гонка па сістэме Гундэрсена. Прамая трансляцыя.
**14.30** Зімовыя віды спорту. Горныя лыжы. Аксель Лунд Свіндаль (Нарвегія).
**14.45** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Астэрсунд). Жанчыны. Эстафета. Прамая трансляцыя.
**16.45** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**17.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Трондхейм). HS 140.
**18.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў ЗША (Бівер-Крык). Мужчыны. Слалам-гігант. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**19.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Германіі (Дзюсельдорф). Камандныя спаборніцтвы. Спрынт.
**20.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў ЗША (Лейк-Луіс). Жанчыны. Супергігант. Прамая трансляцыя.
**21.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў ЗША (Бівер-Крык). Мужчыны. Слалам-гігант. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**22.25** «Снежны выходны». Агляд. Часопіс.
**22.30** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**00.00** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы ў Вялікабрытаніі. Першы круг. Мужчыны. Нарвегія - Германія.
**02.00** «Лыжнае дваяборства». Кубак свету ў Нарвегіі (Трондхейм). Гонка па сістэме Гундэрсена.

### БЕЛСАТ tv

**19.00** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.10** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.25** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 8 серыя.
**20.10** Форум (ток-шоў): «Хто ў хаце гаспадар».
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).
**21.30** Акно ў Еўропу.
**21.55** Фільматэка майстроў: «Дзікія пчолы», маст. фільм, рэж. Багдан Слама, 2001 г., Чэхія.

---

# Шаноўныя чытачы!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012211080010 фил. МГД ОАО «Белинвестбанк», код 153001764, УНН 190790926
г. Минск, ул. Коллекторная, 11

КУДА ______
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ______
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ______

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)

Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня ______
Кассир Всего ______

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

www.novychas.org

ЦІКАВА



# АПАКАЛІПСІС–2012

Іван БІЧ

**У інтэрнэце, па падліках амерыканскага выдання «New York Times», цяпер налічваецца 600 тысяч сайтаў, прысвечаных праблеме 2012 года. Іх стваральнікі і наведвальнікі актыўна дыскутуюць, ці варта праз тры гады чакаць глабальнай катастрофы.**

Феномен праблемы 2012 ужо выклікаў увагу культуролагаў і тых, хто займаецца масавай псіхалогіяй. Адкуль такі псіхоз? Здавалася, толькі нядаўна на календары быў 2000 год з так званай праблемай мілéніуму. Некаторыя аўтарытэты сцвярджалі, што кампутары не будуць здольнымі змяніць дату і адбудзецца сістэмная памылка, якая паралізуе планету. На гэтую тэму былі выпушчаны мноства кніжак, выйшлі тысячы перадач.

Усё абышлося. І, здавалася, людзі, атрымаўшы нейкі вопыт, павінны перастаць верыць усякім прайдзісветам.

Аднак не прайшло і дзесяці гадоў, як эсхаталагічная паніка зноў ахапіла зямлян. Якія цяпер падставы для істэрыкі? Іх некалькі. Па-першае, старажытны каляндар жрацоў індзейскай цывілізацыі, якая ўзнікла прыблізна ў 2000 годзе да нашай эры і працягвала існаваць да прыбыцця канкістадораў.

Індзейцы майя лічылі, што на працягу Вялікага цыклу — з 3113 года да н. э. па 2012 год н. э. — чалавечай гісторыяй кіруе галактычны прамень, які выходзіць з «ядра Галактыкі» і праходзіць праз Зямлю і Сонца. Праходзіць у адпаведнасці з «галактычнымі сезонамі», якія былі апісаны майя ў матэматычнай і сімвалічнай форме. У 2012 годзе цыкл павінен закончыцца. Па логіцы песімістаў, пасля гэтага ўзнікне новы прамень пад іншым градусам, што кардынальна зменіць планетарную вось і прывядзе да буйных катастроф.

Свае версіі існуюць у асяроддзі белых амерыканскіх кансерватараў. Яны даўно казалі, што абранне прэзідэнтам ЗША чарнаскурага палітыка стане пралогам канца свету. Да аргументаў на карысць гэтага тэзісу фундаменталісты нават адносяць карэкцыю выявы долара. У бліжэйшым будучым выраз «In God We Trust» на доларах будзе на іншым месцы.

Нарэшце, ёсць спіс Рымскіх Папаў, які склаў у XII стагоддзі прарок Малахай. Малахай быў ірландскім біскупам, які коратка апісаў гісторыю панавання бліжэйшых 112 Рымскіх Папаў. Калі верыць яму, якраз такая колькасць Пап будзе сядзець на святым пасадзе да канца свету. Цяперашні Папа Бенедыкт XVI у гэтым спісе стаяць пад нумарам 111.

Каб паставіць пад сумнеў тэзіс пра канец свету ў 2012 годзе, дастаткова згадаць, што цывілізацыя майя была не вельмі падобнай на цывілізацыю агентаў з космасу або ахоўнікаў сакральных ведаў. Дзікасць нораваў сярод майя была жудаснай.

Акрамя таго, чалавецтва чакала гэты самы канец свету ўжо шмат разоў. У хрысціянскім свеце, адпаведна розным трактоўкам Біблії і запаветаў пракокаў, Апакаліпсіс чакалі, адпаведна, у 33, 900, 999, 1000, 1013, 1033, 1492, 1584, 1666, 1844, 1899, 1900 гадах. Напрыклад, рыхтаваліся да апошняга дня напярэдадні 1492 года. Прычынай стала біблейская фраза: «Гэты свет зроблены на 7000 год». У праваслаўных краінах, між тым, датай стварэння свету лічыўся 5509 год да нашага часу. Калі дадаць 7000 — атрымлівалася якраз 1492.

Самымі неадэкватнымі наконт чутак пра канец свету былі сябры маленькіх сектаў. Іх прыхільнікі часам ахвотна верылі ў чуткі пра апошнія дні і заканчвалі жыццё самагубствам. Так, у 1900 годзе каля сотні сяброў расійскай секты «Чырвоная Смерць», не чакаючы прызначанага на той жа год канца свету, добраахвотна пайшлі з жыцця. У 1967 годзе дацкая секта Царква Ортан Дана чакала ядзернай вайны і, каб выжыць, схавалася ў падземным бункеры, парваўшы кантакты са светам. А вось група сектантаў з ЗША, якая таксама чакала ядзернай вайны, у 1980 годзе папросту схавалася ў гарах ЗША.

Думаецца, шмат хто памятае, як у 1993 годзе сябры секты «Белае Братэрства» намагаліся спаліць сябе напярэдадні прагназаванага імі канца свету наўпрост у Святой Сафіі. Апошнім у гэтай серыі стаў выпадак пад Пензай, дзе паслядоўнікі секты Пятра Кузняцова замураваліся ў пячэрах. Іх лідэр таксама сцвярджаў, што канец свету не за гарамі.

Наступнымі буйнымі аматарамі абвяшчаць пра канец свету былі вучоныя-матэматыкі. Яны вылічылі, што трагедыю трэба чакаць у 1524, 1533, 1763, 1919, 1960 і 1962 гадах.

Не адставалі і людзі, якія мелі псіхічныя адхіленні. Так, на 26 кастрычніка 1997 года прызначылі канец свету дзівакі, якія быццам падтрымлівалі кантакт з жыхарамі планеты Гуфера.

Ідэя канца свету часам была папросту літаратурнай фантазіяй. Так, вядомы фантаст Рэй Брэдберы напісаў апавяданне «Заўтра канец свету». Па сюжэту, канец свету адбываўся 19 кастрычніка 1969 года.

З усяго гэтага можна зрабіць выснову, што крыніцы вечнай веры чалавецтва ў канец свету ляжаць недзе ў падсвядомасці. Гэта частка нашай калектыўнай псіхалогіі.

Між тым, свой унёсак у нарастаючы псіхоз дадаў Галівуд фільмам «2012». Сюжэт фільма будуецца менавіта вакол версіі канца свету, згаданага ў календары майя. Па сюжэту, у 2009 годзе амерыканскі геолаг канстатуе, што ядро Зямлі, падобна мікрахвалёвай печы, награваецца, прычым тэмпература расце вельмі хутка. Ён інфармуе прэзідэнта ЗША. На саміце G8 у 2010 годзе прэзідэнт інфармуе лідэраў іншых дзяржаў пра хуткую катастрофу. Яны вырашаюць пачаць сакрэтны праект па забеспячэнні захавання чалавечай расы на гіганцкіх караблях, названых «каўчэгамі». Між тым, недзе ў ЗША існуе вучоны, які вылічыў парадыгму катастрофы і месцы, дзе можна выратавацца. Карта трапляе ў рукі простага чалавека, які намагаецца выратаваць сябе і сваю сям'ю...

І гэта толькі пачатак эксплуатацыі гарачай тэмы. У снежні на экраны выходзіць стужка «Шлях», а пасля ў лютым — «Кніга Ілая». Персанажы абодвух фільмаў жывуць на планеце пасля глабальнага апакаліпсісу.

Сыходзячы са сказанага, можна прагназаваць, што бум вакол дзяжурнага канца свету толькі пачынаецца.

Дарэчы, апошні канец свету мы перажылі на мінулым тыдні. Шмат хто сцвярджаў, што аднаўленне ў пачадзелак працы Вялікага калайдэра ў Швейцарыі прывядзе да стварэння «чорных дзірак, якія будуць пашырацца і засмоктваць фізічную матэрыю». Калайдэр працуе. Пакуль ніякіх вестак пра чорныя дзіркі не паступала.





## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Я лічу, што працяг санкцый і адначасова мараторый на іх з'яўляецца лепшай палітыкай. Пасланне наступнае: Еўрасаюз не прызнае Лукашэнку, паколькі няма дэмакратычнай легітымнасці яго ўлады. Але, уводзячы мараторый на санкцыі, мы актывізавалі дыпламатычныя каналы і падаём беларускім уладам зразумелы сігнал: фінансавая дапамога, ад якой вы больш за ўсё залежыце, магчымая ў рамках «Усходняга партнёрства», але для гэтага патрэбныя змены таксама ў палітычнай сферы.

**З інтэрв'ю Яцэка Пратасевіча, кіраўніка Камісіі Еўрапарламента па сувязях з Беларуссю.**
**«Rzeczpospolita» (Польшча)**

Шэраг аналітыкаў мяркуюць, што Масква была незадаволена кантактамі Мінска з Захадам і нежаданнем прызнаць незалежнасць Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Эксперты таксама адзначаюць, што Крэмль не можа быць задаволены сталымі кантактамі Лукашэнкі з прэзідэнтам Украіны Віктарам Юшчанкам — палітыкам, якога ў Маскве намагаюцца ігнараваць. Напачатку лістапада Лукашэнка правёў дастаткова цёплую сустрэчу з Юшчанкам, падчас якой прэзідэнты падпісалі мемарандум пра супрацоўніцтва ў рамках праграмы ЕС «Усходняе партнёрства». У гэтым годзе Юшчанка і Лукашэнка сустракаліся ўжо чатыры разы.

**BBC (Вялікабрытанія)**

Па меркаванні назіральнікаў, Мінск не дасць выразны адказ на пытанне незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі нават пасля таго, як адбыліся паездкі парламентарыяў у Закаўказзе. Апошняе слова ўсё адно застанецца за прэзідэнтам Лукашэнкам і будзе залежаць ад вынікаў яго гандлю з Масквой. Аляксандру Лукашэнку ад Масквы патрэбныя дзве рэчы — грошы, прычым больш вялікія, чым прапануе Масква, і гарантыі нейтралітэту Масквы на хуткіх прэзідэнцкіх выбарах. Як толькі ён іх атрымае, то ўся гэта камедыя скончыцца. А пакуль гульня працягнецца.

**«Коммерсант-ъ» (Расія)**

Наступным крокам пасля сустрэчы з беларускімі незалежнымі журналістамі, па логіцы, павінна стаць гутарка з апазіцыйнымі Лукашэнку палітыкамі. Расійскі істэблішмент пачынае разумець, што не Бацькам адзіным жыве Беларусь. Для складання поўнай карціны пра сітуацыю ў суседняй краіне патрэбныя розныя зрэзы меркаванняў і крыніцы інфармацыі. Тым больш, што адносіны Масквы і Мінску перажываюць не лепшыя часы. Для беларускага лідэра такая сітуацыя вельмі небяспечная — ён відавочна не вызначае формулу гульні, губляе ініцыятыву ў палітычным дыялогу. У такіх умовах ён гатовы нават адкласці падпісанне дакументаў па выгоднай для краіны мытнай дамове з Масквой і Астаной. На мінулым тыдні ён даручыў ураду прапрацаваць «магчымыя негатыўныя наступствы»… Дарэчы, на Маскву беларускія забабоны ўжо не дзейнічаюць.

**«Московский комсомолец» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ВЕНЕСУЭЛА. УГА ЧАВЕС ПАХВАЛІЎ ТЭРАРЫСТА І КАНІБАЛА



Падчас выступу перад дэлегатамі з’езда прадстаўнікоў сацыялістычных партый Уга Чавес выдаў шмат новых сенсацыйных тырад. У прыватнасці, назваў «героем рэвалюцыі» Раміраса Санчаса — сусветна вядомага тэрарыста, які мае мянушку Шакал. Цяпер Шакал сядзіць у французскай турме, дзе ён, дарэчы, прыняў іслам. Яму далі тэрмін за забойства ў 1975 годзе ў Парыжы двух супрацоўнікаў французскіх спецслужб. Таксама Шакал адказны за захоп у заложнікі ў Вене ў тым жа 1975-м 15 міністраў краін-сяброў OPEC. Трое з небаракаў у выніку былі забітыя. На думку венесуэльскага гаранта, «Санчаса асудзілі не па справядлівасці… на самай справе, ён быў вялікім байцом Арганізацыі вызвалення Палесціны». Другім кумірам Чавес зрабіў дыктатара Ідзі Аміна. Лідэр Уганды (1971–1979) праславіўся тым, што еў сваіх палітычных апанентаў. «Кажуць, што ён канібал, — сказаў Чавес. — Я ў гэта не веру. Ён быў вялікімі нацыяналістам і патрыётам».

**Па матэрыялах французскай прэсы**

### КАЗАХСТАН. АДСТАЎКА ПРЫХІЛЬНІКА



Дархан Калетаеў, першы намеснік старшыні партыі «Нур Атан» (партыя прэзідэнта Назарбаева), нечакана быў адпраўлены ў адстаўку. Цяпер ён будзе кіраваць нейкім фондам. Адстаўка чыноўніка выклікала шмат спекуляцый. Большасць аналітыкаў кажуць, што яго згубілі занадта адкрытыя праназарбаеўскія ініцыятывы. Менавіта Калетаеў шмат разоў з самай высокай трыбуны казаў пра неабходнасць надання Назарбаеву статуса пажыццёвага прэзідэнта. Акрамя таго, спадар Калетаеў увесь час сварыўся з апазіцыяй. Нават не хацеў сустракацца з яе прадстаўнікамі. Між тым, з наступнага года Казахстан атрымлівае пасаду старшыні ў АБСЕ. Наяўнасць у кіраўніцтве краіны такога чалавека, ды яшчэ не здольнага арганізаваць нават фармальны дыялог з апазіцыяй, можа пашкодзіць іміджу рэжыму. Натуральна, самі ўлады кажуць, што адстаўка Калетаева выклікана выключна абставінамі кадравай палітыкі.

**Па матэрыялах «Караван» (Казахстан)**

### ІСПАНІЯ. СУПРАЦЬ МАЛАДЫХ БАСКАЎ

Спецслужбы Іспаніі правялі самую буйную ў гісторыі аперацыю супраць маладых баскскіх нацыяналістаў, сяброў групоўкі Segi. Segi — забароненая моладзевая арганізацыя партыі «Батасуна», якая таксама пазбаўлена права легальнай дзейнасці за кантакты з тэрарыстамі з ETA. Усяго ў рамках аперацыі было арыштавана 36 чалавек. Канфіскавана шмат нацыяналістычнай літаратуры. Увогуле, афіцыйна рэпрэсіі супраць Segi звязваюць з кампаніяй супраць праекту TAV (будаўніцтва чыгункі для цягнікоў вялікай хуткасці, якое вядзецца зараз у Краіне Баскаў). Гэты праект, на думку нацыяналістаў, нясе пагрозу прыродзе. У барацьбе супраць TAV нацыяналісты некалькі разоў ужывалі бомбы і сабатаж. Адначасова пераслед Segi можна лічыць адказам дзяржавы на апошнія мірныя ініцыятывы з боку лагера былых сяброў «Батасуны». На мінулым тыдні яны прапанавалі Мадрыду перамовы па фармату тых, якія мелі месца ў Паўночнай Ірландыі напрыканцы 1990-х гадоў паміж каталікамі і пратэстантамі: абодва бакі адмаўляюцца ад вайсковых аперацый і дасягаюць кампрамісу. Аднак такі варыянт не падабаецца Мадрыду, паколькі прымушае яго прызнаць «Батасуну» і ETA ў якасці роўных палітычных акцёраў (да гэтага часу афіцыёз называе гэтыя структуры «банда тэрарыстаў»). Цікава, што адначасова заяву наконт прапаноў зрабіла адміністрацыя прэзідэнта Барака Абамы. У Вашынгтоне лічаць, што параўноўваць сітуацыю ў Паўночнай Ірландыі і Краіне Баскаў немагчыма.

**Па матэрыялах іспанскай прэсы**

ГЕАПАЛІТЫКА

# КАЛУМБІЯ І ВЕНЕСУЭЛА: КАНФЛІКТ РАЗГАРАЕЦЦА

**Алег НОВІКАЎ**

**Верны саюзнік афіцыйнага Мінска Уга Чавес імкліва ўцягваецца ў канфлікт з суседняй Калумбіяй.**



Альвара Урыбе



Уга Чавес

Шмат хто бачыць галоўным чыннікам цяперашняга канфлікту палярнасць ідэалогій пануючых у Каркасе і Багаце рэжымаў. Уга Чавес сябруе з Тэгеранам і Мінскам. Альвара Урыбе — галоўны рэгіянальны саюзнік Вашынгтона.

Аднак гісторыя супрацьстаяння Калумбіі і Венесуэлы мае больш глыбокія карані. Адносіны паміж дзяржавамі пачалі складацца, калі яны былі яшчэ правінцыямі — Санта-Марта (Калумбія) і Новая Андалузія (Венесуэла) — у складзе Іспаніі. Пазней правінцыі ўваходзілі ў склад дзяржавы Вялікая Калумбія.

Першыя тэрытарыяльныя спрэчкі пачаліся напрыканцы XIX стагоддзя з-за акваторыі Венесуэльскага заліва, заходні бераг якога — паўвостраў Гуахіра. Яшчэ ў часы каланізацыі сюды прыходзілі экспедыцыі канкістадораў як з Новай Андалузіі, так і з Санта-Марты, аднак мясцовае племя індзейцаў гуахіра аказалася моцным арэшкам. У выніку межы паміж правінцыямі — а пазней незалежнымі дзяржавамі — у гэтым раёне аказаліся не вызначанымі. Па-сутнасці, праблема не вырашана да гэтага часу. Ёсць дамова ад 1941 года, але гэта хутчэй дамова наконт правіл навігацыі ў Венесуэльскім заліве.

У 1987 годзе меў месца самы буйны памежны лакальны канфлікт. Калумбійскі вайсковы карвет «Caldas» увайшоў у спрэчныя воды. У адказ прэзідэнт Венесуэлы падняў ВПС. Самалёты лядалі літаральна над палубай «Caldas». Да сапраўднага бою не дайшло толькі дзякуючы дыпламатам.

Другая гістарычная праблема — месца калумбійскіх эмігрантаў у венесуэльскім грамадстве. У 1970-я гады ў Венесуэлы пачалася эра «Tan barato? Den dos» («Так танна? Давайце два»). Менавіта так казалі венесуэльскія турысты, якія кожныя выходныя рабілі шопінг у Фларыдзе. Дурныя грошы ў іх з’явіліся з-за росту коштаў на нафту. Эканамічны бум у суседзяў падштурхнуў шматлікіх калумбійцаў шукаць шчасця за мяжой, аднак венесуэльцы разглядалі іх выключна як танную працоўную сілу.

Трэцяя праблема — FARC (Калумбійскія вайсковыя народныя сілы), партызанская левадыкальная групоўка, якая з 1960-х гадоў змагаецца з законным урадам у Багаце. На пачатку 1980-х байцы FARC пачалі пранікаць на тэрыторыю Венесуэлы, часам са злачыннымі мэтамі. Каракас неаднаразова скардзіўся суседзям на вылазкі паўстанцаў. Сітуацыя кардынальна змянілася, калі да ўлады ў Каракасе прыйшоў левы папуліст Чавес. Цяпер надышоў час калумбійцам скардзіцца на тое, што Венесуэла дае тэрарыстам зброю, прадстаўляе базы на сваёй тэрыторыі. У сваю чаргу, Чавес пачаў казаць, што Калумбія ператварылася ў плацдарм для ўнутранай апазіцыі.

Менавіта праблема FARC прывяла да эскалацыі цяперашняга канфлікту. У ліпені пасля чарговых спрэчак наконт таго, дае партызанам Каракас грошы або не, Чавес загадаў, каб амаль увесь склад венесуэльскай амбасады ў Багаце выехаў на радзіму. Пасля пасол вярнуўся, аднак на гэты час Багата і Вашынгтон ужо падрыхтавалі праект дамовы аб перадачы амерыканцам сямі калумбійскіх вайсковых паветраных баз. У мэтах, як гаворыцца ў тэксце, «барацьбы з наркамафіяй» дамова была падпісаная 2 лістапада.

Рэакцыя Чавеса і яго саюзнікаў была істэрычнай. Фідэль Кастра назваў дамову ў сваёй калонцы ў газеце «Granma» актам пазбаўлення Калумбіі права на суверэнітэт. Ён згадаў, што нешта падобнае было падпісана ў пачатку 1950-х гадоў, што ў выніку прывяло да пасылкі калумбійскіх жаўнераў на вайну ў паўночную Карэю.

> **Тым часам Чавес заклікаў вайсковы сілы рыхтавацца да вайны з Калумбіяй. У некаторых правінцыях сапраўды пачалася мабілізацыя. Адначасова з памежных раёнаў сталі ўсё часцей прыходзіць навіны пра ўзаемныя правакацыі**

Галоўны тэзіс крытыкаў дамовы — тое, што яна, па-сутнасці, з’яўляецца першым этапам падрыхтоўкі інтэрвенцыі супраць Венесуэлы. Адно з вядучых левых лаціна-амерыканскіх выданняў «Rebeliyn» піша: «У сітуацыі сусветнага эканамічнага крызісу і падзення эканамічнай магутнасці ЗША здольныя падтрымліваць аўтарытэт выключна за кошт вайсковай прысутнасці ў рэгіёне. Сем баз ператвараюць краіну ў плацдарм і хаваюць хоць нейкую ілюзію дэмакратыі. Рэальная пагроза для рэгіёна — гэта войска, якое здольнае прыходзіць у любое месца свету і перамагаць там цэлыя цывілізацыі (прыклад — Ірак). У Венесуэлы ёсць падставы адчуваць пагрозу. Не сакрэт, што Венесуэла намагаецца будаваць асобную мадэль развіцця, не падобную на неаліберальную. Быць падрыхтаваным да горшага — стары ўрок гісторыі. Той, хто яго забывае, можа заплаціць занадта дорага. У Венесуэлы ёсць абавязак рыхтавацца да абароны».

Тым часам Чавес заклікаў вайсковы сілы рыхтавацца да вайны з Калумбіяй. У некаторых правінцыях сапраўды пачалася мабілізацыя. Адначасова з памежных раёнаў сталі ўсё часцей прыходзіць навіны пра ўзаемныя правакацыі. Найбольш гучны інцыдэнт здарыўся 20 лістапада. Тады венесуэльскія вайскоўцы ўзарвалі два масты на рэчцы Тачыра, якая знаходзіцца па калумбійскі бок мяжы. Афіцыйны Каракас прызнаў факт дыверсіі, аднак растлумачыў яе неабходнасцю змагання з наркатрафікам. У сваю чаргу, Мінабароны Калумбіі назваў выпадак актам гвалту супраць мірнага насельніцтва. Калумбійскі МЗС звярнуўся са скаргамі ў ААН. Канфлікт працягваецца.

Еўрапейская прэса, між тым, не верыць аргументам Чавеса. Іспанская «El Pais» адзначае: «Гісторыя адносін Чавес і Урыбе даўно нагадвае нейкі серыял. Яны то спрачаюцца, то мірацца. Аднак цяпер у гэтай сагі абсалютна новы эпізод. Вынаходнік дактрыны чавізму перайшоў усе межы… Паміж словамі пра тое, што Калумбія выконвае інструкцыі ЗША і рэальнасцю — вялікая прорва. У такім разе варта спытацца, дзе прычына мілітарнай паранойі Чавеса. Апазіцыя з Каракасу кажа пра тое, што мы назіраем панічную рэакцыю ўлады. Паводле вынікаў апошніх апытанняў, рэйтынг Чавеса падае з-за дэфіцыту прадуктаў першай неабходнасці, прымусовай кампаніі па эканоміі электрычнасці, эпідэміі грыпу».

Пакуль ва ўсім канфлікце больш за ўсё бонусаў атрымаў Альвара Урыбе, які выказаў намер у трэці раз балатавацца на пасаду кіраўніка дзяржавы. Для гэтага яму патрэбна дабіцца паправак у канстытуцыю. Дарэчы, ЗША не вельмі віталі такую ідэю. Аднак атмасфера знешняй пагрозы яму выключна на руку. Тая ж «El Pais» ставіць кропкі над «і»: «Парадокс у тым, што дзякуючы сваёй бессэнсоўнай тарабаршчыне Чавес сам дае Калумбіі алібі шукаць знешнюю апору сваё бяспекі. Не для таго, каб атакаваць, а каб абараняцца».

НАЦЫЯНАЛІЗМ

# СТРАСЦІ ПА ЗУЛЬФІІ

Алег ПЯТРОЎ



**Зульфія Чыншанло — юная спартсменка, якая толькі два гады як перайшла ў казахскае грамадзянства з кітайскага, стала чэмпіёнкай свету па цяжкай атлетыцы. Аднак пры гэтым яна не можа размаўляць па-казахску. Казахскія патрыёты ў шоку. Ці трэба краіне такія чэмпіёны? Прапануем падборку каментараў з гэтай нагоды на казахскіх сайтах.**



**Даведка:**

22 лістапада 16-гадовая казахстанская спартсменка Зульфія Чыншанло на чэмпіянаце свету па цяжкай атлетыцы сярод дарослых у Паўночнай Карэі заваявала першы залаты медаль. Увогуле, яна паўтарыла сусветны рэкорд. Пасля перамогі атлетка прайшлася з казахскім сцягам, аднак на прэс-канферэнцыі Зульфія размаўляла выключна на джунгарскай мове (яна паходзіць з народу джунгар — цюркскай этнічнай меншасці ў Кітаі) і ўсяго два гады таму атрымала казахскі пашпарт. Генеральны сакратар Федэрацыі цяжкай атлетыкі Казахстана заявіў, што спартсменка пакуль з цяжкасцю размаўляе на мове новай радзімы, але лічыць, што галоўнае, што яна размаўляе на інтэрнацыянальнай мове спорту. Ён таксама адзначыў, што 16-гадовая спартсменка сваім выступам узняла ўсю цяжкую атлетыку Казахстана.

Газіз: Дажыліся, што нашы спартсменкі размаўляюць на ўсіх мовах свету, за выключэннем дзяржаўнай. Што за краіна такая? Ці ёсць будучыня ў такой краіны?

Астан: Трэба толькі ганарыцца, што ў Казахстан едуць людзі з краін з беднай эканомікай. Ад таго, што некаторыя чыноўнікі спяваюць на казахскай, карысці няшмат.

Жасарал: Я, увогуле, рэзка супраць практыкі прыцягнення (закупкі) легіянераў. Калі мы сапраўды клапоцімся пра будучыню казахскага спорту, то сродкі трэба ўкладаць у падрыхтоўку кадраў. У казахскай правінцыі марнеюць тысячы таленавітых хлопчыкаў і дзяўчат, якія маглі б не горш прадставіць сваю радзіму на міжнародным узроўні.

Цімур: Прыцягненне легіянераў, якія дэманструюць поспехі, добра ўжо хаця б таму, што ўзмацняе канкурэнцыю ў дадзеным відзе спорту. Яна працуе на айчынны спорт. Ад каментараў, кшталту: «яна не размаўляе на казахскай», становіцца смешна. Гэта маразм — пераводзіць тэму спорту на прыналежнасць да той ці іншай нацыі. Трэба ганарыцца, што гэта казахскі медаль, які ўручалі пад наш гімн.

Даніяр: Наўрад ці мы — казахі. Сваю мову нават не ўздымем. Афіцыйная статыстыка кажа, што ў Казахстане 67 працэнтаў казахаў. Хлусня! Няма ў нашай краіны будучыні. Мы, казахі, краіну губляем сваім стаўленнем да мовы і нацыянальнай культуры.

RoK: Малайчынка, Зульфія! Усе краіны выкарыстоўваюць легіянераў. Мова — гэта на другім месцы. Няхай нават па-японску размаўляе.

Номад: Шматлікія людзі не размаўляюць на казахскай мове таму, што кіраўніка дзяржавы атачаюць выключна рускамоўныя, якія прасоўваюць рускую пазіцыю. Праблема ў нас саміх. Кожны на сваім месцы, у сваім атачэнні павінен размаўляць на казахскай мове. Я так і раблю. Паўсюды!

Шакен: Я мяркую пра спорт на прыкладзе маіх аднакласнікаў-трэнераў. Дзяржава не зацікаўлена ў падрыхтоўцы мясцовых спартсменаў. Мае знаёмыя — трэнеры па барацьбе і боксу — з-за адсутнасці трэніравальнай залы ўзялі ў арэнду Палац культуры, які належыць птушкафабрыцы. Праз нейкі час прэзідэнт фабрыкі, рэальны гаспадар палаца, забараніў ім займаць памяшканне, аргументуючы тым, што дзеці ствараюць шум, бо яготы дом побач.

**Кітайцы былі, напэўна, злымі, што выхадзец з іх краіны ўзяў медаль для іх праціўніка. Застаецца павіншаваць Зульфію і зборную Казахстана**

Асхат: Шчыра кажучы, жудасныя навіны. Нават медалі для нас зарабляюць жыхары Паднябеснай. Замест таго, каб развіваць свой спорт, вязуць варагаў адкуль толькі магчыма. Ну добра, калі б яны былі этнічныя казахі. Аднак калі джунгараў прывозяць і выдаюць за нешта выбітнае... Хачу лаяцца матам. Гэта не перамога Казахстана. Гэта перамога кітайскай школы. Трэба ўмець прызнаваць слабыя бакі. Няма аб'ектыўнага аналізу, ёсць выключна пераможныя рэляцыі.

Мурзік: Чаму развіццё мовы нельга нармальна і спакойна сумяшчаць з развіццём навукі, спорту? Дзіўна. Вельмі дзіўна.

Дукар: Зульфія — малайчына. Яна будзе прыкладам для нашых казахскіх спартсменаў. Я бачыў, як яна медаль заваёўвала. Вельмі ўсё было нечакана. Спачатку я думаў, што медаль возьме кітаянка. Але перамагла дзяўчына з Казахстана. Калі ўжо спартсмен выступае за нашу зборную — значыць, ён казахскі спартсмен. І не трэба дзяліць іх па нацыянальнасцях. У зборных Расіі па ўсіх відах спорту хапае выхадцаў з іншых краін, і ніхто не комплексуе з гэтай нагоды. Хтосьці напісаў, што гэта перамога кітайскай школы цяжкай атлетыкі. Кітайцы былі, напэўна, злымі, што выхадзец з іх краіны ўзяў медаль для іх праціўніка. Застаецца павіншаваць Зульфію і зборную Казахстана!

Асхат: Так склаліся абставіны, што яна прыехала сюды, каб зарабіць грошы. Добра, што зарабіла нешта і для функцыянераў ад спорту. Аднак з пункта гледжання развіцця айчыннага спорту і росту грамадзянскай (нацыянальнай) самасвядомасці, гэта не дасць нам нічога. Няхай будзе 9-е або 13-е месца, аднак яно будзе заваявана сваімі.

ЛІКУРГ: Шматлікія джунгары свабодна валодаюць казахскай мовай. Іх мова — дыялект кітайскай мовы, толькі яны мусульмане, і таму імкнуцца да цюркаў. У цэлым джунгары добры, працавіты народ.

МММ: Казахі толькі змогуць стаць чэмпіёнамі свету і алімпійскіх гульняў па з'яданні бешбармака.

Макс: Штосьці вас не разумею. Атрымліваецца, калі я не казах і не размаўляю на казахскай мове, я не магу працаваць на развіццё нашага РОДНАГА Казахстана?

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### МІХАЭЛЬ КОЦАБ



Міністр па правах чалавека Чэшскай рэспубліцы заявіў, што загадаў усім медыкам краіны спыніць практыку нелегальнай стэрылізацыі жанчын цыганскага паходжання. Такая практыка ўзнікла яшчэ ў часы камунізму (першая аперацыя такога кшталту датуецца 1971 годам), аднак ніводнага разу ні тагачасныя, ні цяперашнія ўлады не жадалі прызнаваць, што аперацыі па стэрылізацыі здзяйсняюцца ў рамках дзяржаўнай палітыкі. На самай справе, існавала тайная ўстаноўка ўладаў паменшыць рэпрадуктыўныя рэзервы цыганскай камуны ў краіне. Для публікі ўжывалася формула «стэрылізацыя пацыента X мела месца ў выніку індывідуальнай памылкі». Тэма стэрылізацыі цыганак даўно ўжо стала аб'ектам спрэчак паміж чэшскім урадам і праваабаронцамі. Апошні раз тыя выявілі факт стэрылізацыі ў 2003 годзе. Увогуле, у медычных архівах фігуруе 80 жанчын — ахвяр аперацый. Цяпер жанчына, у тым ліку цыганка, можа быць стэрылізаваная выключна па асабістай згодзе. Між тым, міжнародная арганізацыя Ліга правоў чалавека ўжо заявіла, што простага прыпынення практыкі стэрылізацыі цыганак занадта мала. Яны патрабуюць кампенсацый для тых жанчын, якія гвалтоўна пазбавіліся магчымасці нараджаць.

### ДЖЭМ ОЗДЭМІР



Старшыня Партыі зялёных ФРГ праславіўся як самы малады старшыня сярод вядучых нямецкіх партый і як першы немец турэцкага паходжання, які атрымаў такую высокую партыйную пасаду. Між тым, апошнія ўчынкі выклікалі цікавую палеміку ў шэрагах партыі. У 42-гадовага Джэма нядаўна нарадзіўся сын. З гэтай нагоды ён заявіў, што не паедзе на кліматычную канферэнцыю ў Капенгаген, дзе павінен быць падпісаны новы пратакол па кантролю над глабальным пацяпленнем. Джэм застанецца з жонкай і дзецьмі. Зялёныя ў крызісе. З аднаго боку, Джэм адкрыта «філоніць» адказнае мерапрыемства. Тэма змены клімату — галоўны канёк Зялёных. З іншага — менавіта эколагі раней гучна патрабавалі, каб бацькі даглядалі дзяцей столькі ж часу, як і маці. Такім чынам, маладыя маці змогуць не выпадаць з грамадства, а працягваць кар'еру ці атрымліваць адукацыю. Самае цікавае, што крок Джэма дружна падтрымалі ўсе мусульманскія і кансерватыўныя арганізацыі Германіі. Некаторыя нават лічаць, што лідэр Зялёных, калі застаўся дома глядзець за малым, даў відавочны сігнал правым пра тое, што падзяляе іх сямейныя каштоўнасці і гатовы на стварэнне з імі кааліцыі.

### ЮЛІЯ ЦІМАШЭНКА



Прэм'ер-міністр Украіны і лідэр блоку імя сябе самой да сваіх шматлікіх рэгалій дадала тытул «ганаровая казачка». 17 лістапада на пасяджэнні прадстаўнікоў казацкіх арганізацый Украіны ў Сімферопалі казакі вырашылі, што няма лепшага кандыдата на пасаду прэзідэнта, чым Юлія. Самае цікавае, што большасць казацкіх арганізацый, прадстаўленых на сустрэчы, адносяць сябе да прарасійскіх сілаў. Аднак тое, што Юлія — «аранжавы» палітык, іх не турбуе. Наадварот, як заявіў адзін з прысутных, «нельга не зразумець каапераацыі паміж Пуціным і лідэрам нашай дзяржавы. Выключна яе прымаюць у Расіі, з ёй вырашаюцца палітычныя пытанні». Больш таго, калі верыць словам прысутнага атамана Луганскай вобласці, за Цімашэнка выступае ўсё данское казацтва. Нагадаем, што менавіта данскія казакі ў часы «аранжавай» рэвалюцыі выказвалі гатоўнасць пачаць інтэрвенцыю супраць Украіны, каб вярнуць у склад Растоўскай вобласці некаторыя тэрыторыі, якія ўваходзілі ў Вобласць Войска Данскога да рэвалюцыі 1917-га. Што да Цімашэнка, яна паабяцала казакам у выпадку перамогі стварыць спецыяльны ўрадавы камітэт па праблемах казакоў, накшталт таго, які дзейнічае пры ўрадзе Пуціна. Тое, што Юлія — жанчына, для казакоў таксама не праблема. Паколькі, як было заяўлена на сходзе, Юлія Уладзіміраўна ўвасабляе Украіну-маці, усе казакі будуць галасаваць за «ганаровую казачку».

ЦІКАВА

# Культурны снежань: ТРЫ АНОНСЫ

Ева ВАЙТОЎСКАЯ, Алесь ГІНЗБУРГ

**Прадаўцы як дзяржаўных, так і недзяржаўных установаў гандлю і грамадскага харчавання пачынаюць ужо аздабляць залы і вітрыны ў чаканні Каляд і Новага году. Гэтак і ў беларускай літаратуры даўмеліся: расказваць пра культурныя падзеі варта пачынаць задоўга да гэтых самых падзеяў. І на гэтым этапе на першае месца выходзяць арганізатары — людзі, якія ўзвальваюць на сябе ўсю няўдзячную працу па пашырэнні інфармацыі, пошуку памяшкання ды зборы публікі. Адгукнуўшыся на самыя розныя прэс-рэлізы, мы адшукалі тых, хто стаіць за імі. Ніжэй Югася Каляда, Віка Трэнас ды Георгій Барташ па ініцыятыве культаглядальнікаў «НЧ» нахвальваюць літаратурныя вечарыны, да якіх маюць дачыненне.**



Югася Каляда

## ГРУЗІЦЕ ВЕРШЫ БОЧКАМІ

*маладыя літаратары з Харкава выступяць у Мінску*



Пачнём, аднак, з падзеі лістападаўскай, сустрэча з героямі якой чакае чытача літаральна заўтра. Прывабіла яна нас сваёй надзвычайнасцю: украінскія паэты ў Мінску — госці частыя, але каб у такой колькасці?..

> 28 лістапада (субота) а 18:00 у галерэі «Ў» (пр. Незалежнасці, 37А, (ст. м. «Плошча Перамогі»), у двары дома «Подзвіг народа») у рамках фестывалю «Кніга як арт-аб'ект» пры падтрымцы украінскага выдавецтва «Смолоскип» адбудзецца творчая акцыя літаб'яднання «Бочка» (Харкаў, Украіна).
>
> Выступаюць: маладыя ўдзельнікі «Бочкі» Насця Велес, Ігар Зарудка, Кацярына Карунык, Алена Рыбка, а таксама крыху старэйшыя за іх, але ўжо прызнаныя ва Украіне пісьменнікі Алег Коцараў, Сашко Ушкалаў. Праводзіць вечарыну гомельская пісьменніца Югася Каляда, якая пачытае свае творы. Таксама прагучаць пераклады ўкраінскай і беларускай паэзіі.
>
> Уваход вольны.

**Пісьменніца Югася Каляда, вядучая вечарыны, расказвае, як з перспектывы жыхаркі горада на памежжы выглядае беларуска-ўкраінскі культурны абмен.**

— Як жыхарка гораду-на-памежжы, магу ўпэўнена сцвердзіць: паміж Гомелем і Чарнігавам сапраўды трывае шчыльны абмен, але ў рэчышчы матэрыяльнай культуры. Памежныя аўтобусы з цягнікамі штодня вязуць па абодвух напрамках прадукты харчавання і вопратку — а зусім не кнігі і перыядычныя выданні.

Мая абазнанасць ва ўкраінскай літаратуры абумоўлена выключна асабістай ініцыятывай. Я раю тым, хто піша па-беларуску, вывучыць украінскую мову. Мы атрымаем унікальны досвед параўнання і лепш зразумеем беларускую: словаўтварэнне, этымалогію лексікі; убачым, як нацыянальная мова ўваходзіць у паўсядзённы ўжытак, як трансфармуюцца запазычанасці і калькаванні. І тады ўжо чакае захапляльнае падарожжа па абшарах новаадкрытай Культуры: ад фальклору да сучаснай паэзіі, якая фармуецца і складаецца літаральна на вачах.

Тым і цікавы ды карысны выступ удзельнікаў мультмастацкага аб'яднання «Бочка»: мы маем магчымасць не на падставе чутак «а як там у іх», а на грунце ўласнага досведу зрабіць выснову, дык чым жа ёсць паэзія г. зв. «двухтысячнікаў», і самім спрагназаваць, у якім кірунку развіваецца маладая ўкраінская літаратура.

Пісьменнік абавязаны рэгулярна і своечасова друкавацца. Такую неаспрэчную выснову я зрабіла пасля таго, як даслала ў кошык парачку аповесцяў, неабачліва пакладзеных «у шуфляду», з разлікам на будучыню. Кожны год дадае досведу, мяняе каштоўнасці, ацэнкі; і прапанаваць чытачам тое, што я ўважаю за састарэлае, мне не дазваляе сумленне. Затое мне не сорамна за апошнія вершы, іх я і пачытаю.

## ДЫЯЛОГ ЗОРАК

*штогадовы літаратурна-мастацкі праект «Выявы–2009»*

«Вы-я-вы» прывабілі нас не толькі шматлікім мультымедыйнымі цікавосткамі, абяцанымі ў анонсе, але і тым, што гэта, бадай, адзіная літаратурная імпрэза ў краіне, за ўваход на якую БЯРУЦЬ ГРОШЫ. Прычым арганізатаркі папярэджваюць: квіткоў на ўсіх ахвочых можа не хапіць! Другая незвычайная рэч наконт праекту — яго ладзяць «ПРОМА-ГРУПА» — так паэткі Віка Трэнас і Юлія Новік цяпер пазіцыянуюць сваё творчае аб'яднанне.

Штогадовы некамерцыйны літаратурна-мастацкі праект «Выявы» — ініцыятыва наймаладзейшага пакалення беларускіх літаратараў. Першае мерапрыемства адбылося 6 снежня 2008 года. Сёлета ў падрыхтоўцы «Выяваў» задзейнічана больш за дваццаць творцаў, сярод якіх — пісьменнікі, мастакі, фатографы, дызайнеры, рэжысёры, музыканты.

> 5 снежня (субота) у 18.00 у Тэатры рускага рамансу (вул. Чыгуначная, д. 27, корп. 2)
>
> «Выявы–2009» — спалучэнне візуальнага, музычнага і літаратурнага мастацтва.
>
> Вас чакае «Дыялог зорак»:
>
> Людміла Рублеўская і Вераніка Шніп
>
> Віктар Жыбуль і Джэці
>
> Уладзімір Арлоў і Андрэй Хадановіч
>
> Анатоль Івашчанка і Усевалад Сцебурака
>
> Алёна Беланожка і Маргарыта Аляшкевіч
>
> Барды Ната Пушкарова і Паша Кузіч, і іншыя.
>
> Кошт квітка 7000 бел. руб. Даведка і заказ квіткоў па тэл. +37529 5607793, +37529 1354495 або праз e-mail: vuavu@list.ru.
>
> Увага! Кожны наведнік атрымае ў падарунак унікальную самаробную электронную кнігу коміксаў «Блакітны Свін і яму падобныя», запісаную адмыслова для «Дыялогу зорак».

**Паэтка Віка Трэнас у новай для сябе якасці прамоўтаркі называе тры прычыны, па якіх варта набыць квіток на «Выявы» — бо такога вы болей нідзе не пабачыце!**

— Па-першае, да выступлення Уладзімера Арлова і Андрэя Хадановіча мы прымеркавалі паказ эксклюзіўнай сумеснай фотасесіі абодвух пісьменнікаў, зробленай двума цікавымі маладымі фатографамі.

Па-другое, для «Выяваў–2009» мы спланавалі адмысловыя рубрыкі. Спецыяльны госць, знаны блюзмен Юры Несцярэнка выканае свае лепшыя кампазіцыі. Удзельніца на біс Ганна Федарук прадставіць нумар, у якім спалучыліся паэзія, музыка і ўсходні танец. Дэбютантка «Выяваў», паэтка і фотамастак Ірына Агеева прэзентуе так званую «мабільную фотавыставу».

Па-трэцяе, можна будзе пазнаёміцца з «віртуальнымі» ўдзельнікамі «Выяваў» — мастаком Аляксеем Раўскім (Беларусь — Францыя) і рэжысёрам Джонатанам Дрыскалам (Канада). Будзе дэманстравацца фільм Дрыскала пра беларускі рыцарскі рух. Мы з Юляй Новік падрабязней раскажам пра іх творчасць падчас імпрэзы.



Віка Трэнас

## ФЭСТ АДНАГО ВЕРША

*конкурс калядна-навагодняй паэзіі*

Гэты праект прывабіў нас ужо традыцыйна: штогод «НЧ» з прыемнасцю публікуе вершаваныя вынікі калядна-навагодняй імпрэзы. Вядома ж, усе мы любім Новы год і Каляды — а Фэст аднаго верша прапануе адзначыць гэтыя святы незвычайна і па-эстэцку.

> Творчая суполка «Lito.Беларусь» запрашае ўсіх-усіх-усіх да ўдзелу ў ІІІ Фэсце аднаго верша, прысвечаным Божаму Нараджэнню, Новаму году, зіме і іншым снежна-гурбным, шампанска-мандарынавым вабнотам.
>
> Умовы ўдзелу ў фэсце:
>
> Вам неабходна даслаць на адрас gggbbb2007@gmail.com:
>
> 1. Адзін верш на згаданую тэму.
>
> 2. Псеўданім, пад якім ваш верш будзе адасланы сябрам журы.
>
> 3. Сапраўдныя дадзеныя: імя, прозвішча, месца жыхарства, кантакты (гэта інфармацыя — толькі для арганізатараў).
>
> Удзельнікі могуць мець любы ўзрост, жыць у любой краіне, а іх твор можа быць напісаны на якой-заўгодна мове.
>
> Выніковы вечар адбудзецца прыблізна ў дні каталіцкага Божага Нараджэння ў Мінску (дата, час і месца будуць абвешчаныя дадаткова — сачыце за абвесткамі на сайце http://lito1.ru). Спіс журы будзе абнародаваны пазней. Скажам толькі, што ён вельмі прадстаўнічы. Упершыню ў склад журы ўвойдуць пісьменнік Адам Глобус, а таксама пераможца папярэдніх конкурсаў Вольга Базылёва.
>
> Даведкі па тэлефоне: +37429 6521134

**Пісьменнік Георгій Барташ, кіраўнік суполкі «Lito.Беларусь», як і належыць дыпламаванаму гісторыку, расказвае пра гісторыю ўзнікнення фэсту яго і традыцыі.**

— Ідэя фэсту прыйшла таму, што ў ёй была вострая неабходнасць. У лістападзе 2007-га я паскардзіўся Віцы Трэнас, што даўно не ладзіў ніякіх літаратурных вечарын, бо не было «жыццядайнай ідэі». На жаль, проста чытанне аўтарамі твораў адно аднаму ў прысутнасці купкі сваякоў, каханкаў ды субутыльнікаў нікому не цікавае. Акцыя запамінаецца, калі яна заснаваная на арыгінальным сюжэце, канцэпце.

Як і ўсё найлепшае, «канцэпт» прыдумаўся ўначы, я патэлефанаваў Віцы зранку і сказаў: «Ідэя ёсць! Ідэя простая, як валёнак!» І сапраўды, схема фэсту дэмакратычная і не патрабуе грошай. За выняткам фінальнай вечарыны, усё адбываецца праз інтэрнэт.

Традыцыі — гэта, найперш, двухмоўе, а ў перспектыве шматмоўе фэсту. У мінулым годзе на конкурс прыйшоў адзін верш на ўкраінскай мове. Спадзяюся, за першай ластаўкай пацягнуцца іншыя. І аднойчы надыдзе дзень, калі мы атрымаем творы на іншых славянскіх, на балцкіх мовах… І выніковы вечар вядзецца па-руску і беларуску. Мая задача — стварыць шматмоўную літаратурную прастору.



Георгій Барташ

Стабільнасць складу журы і яго поўная незалежнасць — таксама адна з традыцый фэсту. Кожны сябар журы атрымлівае падборку вершаў па інтэрнэце і прымае рашэнні, абапіраючыся на ўласны густ. Вынік фэсту — арыфметычная сума меркаванняў. Арганізатары — пасрэднікі і на выбар пераможцаў не ўплываюць.

Шчыра запрашаю ўсіх, згодна з трэцяй традыцыяй конкурсу, да актыўнага ўдзелу!

ЮБІЛЕЙ

# 10-ГОДДЗЕ ГУРТА «:B:N:» БЯРОЗАЎСКІ ДЭСАНТ У СТАЛІЦЫ

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Калі ў 2004 годзе вядомы беларускі прадзюсер Віталь Супрановіч прапанаваў мне напісаць уводны артыкул для дэбютнага альбому бярозаўскага гурта «:B:N:» «Не трывай», то, назіраючы за відавочным творчым прагрэсам гэтай рэгіянальнай каманды, я дапусціў невялікае перабольшванне. Маўляў, хутка «:B:N:» для Бярозы стане чымсьці такім, як «Beatles» для Ліверпулю ці «Nirvana» для Сіэтлу. Але прайшлі гады, і гэта дапушчэнне працягвае набываць рэальнае ўвасабленне.**




У сябе на малой радзіме — у горадзе Бяроза — гурт актыўна ўдзельнічае ў правядзенні музычных фэстаў і канцэртаў, з іх дапамогай набіраюць моц і набываюць вядомасць маладыя беларускамоўныя каманды. Да таго ж «:B:N:» стаў адной з візітовак гэтага раённага цэнтра Брэсцкай вобласці. Але галоўнае — феномен паспяховай рэгіянальнай каманды для іншых музыкантаў з правінцыі з'яўляецца пацвярджэннем таго, што поспех у творчасці залежыць не ад мясцовасці, дзе нарадзіўся, а ад таленту.

У справядлівасці гэтага пастулата шматлікія слухачы і прыхільнікі гурта «:B:N:» змаглі яшчэ раз упэўніцца, калі наведалі канцэрт у мінскім «R-клубе», які музыканты прысвяцілі 10-гадоваму юбілею каманды. Спадзяванні слухачоў былі небеспадстаўныя — гурт апошнім часам радаваў іх новымі хітамі, выніковымі падарожжамі па фестывальных сцэнах Еўропы, і тым, як адзначыў адзін музычны крытык, што «:B:N:» дасягнулі ўзроўню «N.R.M.» і «Крамы».

Свой юбілейны канцэрт у сталіцы музыканты «:B:N:» і іх лідэр Алесь Лютыч вырашылі правесці ў сяброўскім фармаце. Таму распачаць канцэрт «:B:N:» — 10 год» было даручана маладому гурту з Бярозы «Кальмары». У іх кампазіцыях спалучаецца дынаміка фанку, штампы савецкай эстрады і застольныя рытмы беларускага вяселля. Увесь гэты мікс-кактэйль накіраваў слухачоў (сярод якіх — адзначу — было шмат студэнцкай моладзі) на пазітыўны лад. Хоць і ў клубным разуменні гэтага стану: з безупынным танчаннем, з неагрэсіўным штурханнем на танцполе (мошам) і скокамі са сцэны ў натоўп фанаў!

Няхай «Кальмары» — каманда маладая. Але, дзякуючы вопыту старэйшых сяброў з «:B:N:» і іх метадычнай дапамозе, музыканты ўпэўнена набіраюць вядомасць і выканаўчае майстэрства. Сведчаннем гэтаму сталі кампазіцыі гурта, якія слухачы спявалі разам з «Кальмарамі»: «Бадмінтон», «Амбрэла» (кавер на модную песеньку амерыканскай поп-дзівы Rihanna), «Ён і яна»... Што тычыцца партнёрскага стану гурта, то гэта выглядае так: лідэр «:B:N:» Алесь Лютыч займае месца за бубнамі ў «Кальмарах», а іх галоўны вакаліст-«кальмар» Сяржук Машковіч з'яўляецца пастаянным тэкставікам у «:B:N:». Дый на розных фэстах і канцэртах «:B:N:» і «Кальмары» выступаюць супольна.

Зусім іншую музыку прапанаваў слухачам гурт «Крок», які на сённяшні дзень з'яўляецца ці не самымі заўважным прадстаўніком беларускай альтэрнатыўнай сцэны. «Крок» выконвае тыповы grunge, які ў музыцы гурта «сплаўляецца» з рытмамі панк-року і nu-metal. Гэта падабаецца слухачам, як падабаецца ім і харызматычнасць лідэра «Крока» Рамана Сухоцкага, які ўзяў на сябе ўсе вакальныя партыі ў гурце. Канешне, браць на сябе адказнасць за ўсю каманду на сцэне — ганаровая справа, але з гэтага выцякаюць і недахопы ў кампазіцыях «Кроку». І галоўнае тут тое, што некаторыя песні падаюцца вакальна недапрацаванымі. Мусіць, тут павінны падставіць сваё сяброўскае плячо і іншыя удзельнікі «Крока», заспяваць разам з Раманам? Так, як гэта робяць выканаўцы з гурта «IQ 48», якія ў гэты дзень таксама віншавалі «:B:N:» з дзесяцігоддзем.

У гэтай «самай марсіянскай» камандзе беларускай сцэны спяваюць (ці падпяваюць) ці не ўсе музыканты. Але цэнтрам прыцягнення слухацкай увагі на сцэне застаецца дуэт Эша (вакаліста


Фота аўтара

Алеся Ракаўца) і Буззы (гітарыста Яўгена Бузоўскага). Гэтыя дасціпныя і дынамічныя хлопцы не толькі выканалі песні, але ўклалі ў іх візуалізацыю свой акцёрскі талент. Канешне, у рамках рок-шоу, якое ладзяць музыканты «IQ 48», абапіраючыся на няспынны дыялог са слухачамі і сцэнічную імправізацыю.

Але што такое рок-шоу без добрых песень? У гурта «IQ 48» іх шмат, і ў гэты дзень на канцэрце гучалі і новыя кампазіцыі з апошняга альбому «Героі», і старыя хіты, якія прынеслі «IQ 48» вядомасць, — «Клён», «Таполі». Не абышлося без сюрпрызаў: у падарунак юбілярам прагучала актуальна-сатырычная кампазіцыя «Аграгарадок», у выкананні якой удзельнічала вакалістка гурта «Джамбібум» Ганна Даўгаполава. Завяршыўся сэт «IQ 48» яшчэ адным падарункам слухачам: усім ахвочым музыканты раздавалі hand-make-версію свайго новага акустычнага DVD «Зрабі сам». За што ўсе прысутныя горача (нават, гарачна) віталі музыкантаў і некалькі хвілін скандзіравалі галоўны слоган гурта: «IQ 48» — здаровыя лосі!»

І вось надышоў зорны час для юбіляраў з гурта «:B:N:»! Музыканты з Бярозы і іх лідэр Алесь Лютыч вельмі эмацыйна дзячылі сваім сябрам з усёй Беларусі за віншаванні, за дапамогу, за добрыя словы ў гэты хвалюючы для іх дзень. Але галоўнае дзякуло ад бярозаўцаў было паднесена ў выглядзе гранічна шчырага і энерганасычанага выканання любімых моладдзю песень. Таму распачалі «:B:N:» з самых вядомых і меладычных — «Толькі я», «Адчуваю», «Спіралі», «Гарады», «Цягнік»... Гімнам музычным прыхільнасцям музыкаў і тых, хто ў гэты дзень у дзень запоўнілі «R-клуб», стала праграмная кампазіцыя «Жыве рок-н-рол!!!» Тут у зале з'явілася расцяжка «:B:N:», якая стала фірмовай адзнакай для афармлення другога альбома гурта.

За хіт-канвеерам у выкананні гурта «:B:N:» музыканты не забылі і пра музычныя падарункі, якія яны падрыхтавалі для сваіх прыхільнікаў. Першай нечаканасцю стала з'яўленне на сцэне былой салісткі берасцейскага гурта «Сцяна» Яўгеніі «Пчолкі» Хіло, якая прыбыла на канцэрт сяброў з Бярозы наўпрост з Турцыі. Доўгая адсутнасць на радзіме не адбілася на вакальных магчымасцях Пчолкі, якая разам з Алесем Лютычам цудоўна праспявала песню «Дажджамі» і нагадала яе аўтэнтычнае гучанне. Да таго ж, уручыла «бээнаўцам» шыкоўны торт з дзесяццю свечкамі, якія былі патушаны пад агульныя спевы ўсёй залы: «З днём нараджэння, «:B:N:»!» на вядомы матыў «Happy Birsday Tu I!»

Асаблівы энтузіязм у слухачоў выклікала з'яўленне на сцэне легендарнага беларускага рокера, лідэра гурта «Neuro Dubel» Аляксандра Кулінковіча. І для гэтага сюрпрызу былі важкія падставы. Справа ў тым, што гурт «:B:N:» запісаў для трыб'юта «Neuro Dubel» кампазіцыю «Гузік». Гэтая простая песня ў выніку аб'яднання высілкаў Кулінковіча і «:B:N:» гучала зусім па-іншаму, набыла фаталістычны, нават змрочны сэнс.

Цікава, што павіншаваць гурт «:B:N:» прыйшлі ў гэты дзень і айчынныя рэперы. Гэту плынь сучаснай беларускай музычнай культуры прэзентаваў на юбілейнай вечарыне Вінцэнт. Рэпер у энергічнай, нават агрэсіўнай манеры чыткі тэксту выканаў разам з гуртом «:B:N:» кампазіцыю пад пакуль умоўнай назвай «Беларускія рэперы і рокеры аб'ядноўваюцца!». Маю спадзяванне, што гэтыя стылістычныя эксперыменты Вінцэнта будуць працягнуты, і слухачы з задавальненнем адчуюць іх плён у будучыні.

Але сюрпрызы ад бярозаўскіх музыкантаў не абмяжоўваліся толькі запрашэннем зорак беларускага року ці рэпу. Алесь Лютыч і яго сябры па «:B:N:», перад тым, як выйсці на сталічную сцэну, сканцэнтраваліся на калектыўным творчым працэсе. Вынікам яго стала прэзентацыя шэрагу новых кампазіцый, сярод якіх такія навінкі, як «Жыццё маё», «Я заўсёды з табой», філасофскай балады «Будзь сабой», а таксама фальклорных апрацовак — «Ружа» і «Канюшня», якая, дарэчы, гэтым разам чакана была выканана сумесна з лідэрам гурта «Палац» Алегам Хаменкам. І хоць часцяком можна пачуць нараканні, што народныя песні не такія папулярныя сярод моладзі, як аўтарскія рок-кампазіцыі, гэтым разам можна было ўпэўніцца, што моладзь ведае і спявае сваю фальклорную спадчыну. Прынамсі, тая моладзь, якая слухае «:B:N:». Сваім малодшым сябрам-рокерам Алег Хаменка зрабіў нечаканы падарунак: уручыў экзатычны музычны інструмент, які мае некалькі назваў: рэйнстык (rain stick), альбо «дрэва дажджу», «дажджавая флейта». Ды выказаў спадзяванні ў духу мілнаўскага Віня-Пыха, што калі-небудзь гэты падарунак спатрэбіцца музыкам для выканання і запісу іх песень. Няхай сабе і так!


Фота аўтара

Раскрыю адну таямніцу: выснову пра тое, што «:B:N:» дасягнулі ўзроўню «N.R.M.» і «Крамы», якую я цытаваў на пачатку свайго артыкула, выказаў у інтэрнэце аўтар гэтых радкоў. У ім было трохі перабольшвання, але факт застаецца фактам: гурты сярэдняга пакалення айчынных рок-выканаўцаў ужо ідуць на змену сваім старэйшым калегам. Нават калі апошнія пад цяжарам узросту ці стомленасці перастануць выступаць з канцэртамі і выдаваць альбомы, іх ёсць каму змяніць, працягнуць іх справу. І гэта сведчанне новай сітуацыі на беларускай рок-сцэне.

СПАДЧЫНА

# ЦІ АДРОДЗЯЦЦА ПАЛАЦЫ?

Аляксей ХАДЫКА

**Дваццаць гадоў таму, чытаючы кнігі Міхася Ткачова пра замкі Беларусі, якія пад аховай дзяржавы імкліва занепадалі, перажываючы імгненні іх даўняй інтрыгоўнай гісторыі, той-сёй марыў уявіць сябе на месцы ўладальніка і выратавальніка старасвецкай сядзібы. Часам паўставалі прыватныя праекты, накіраваныя на аднаўленне занядбаных помнікаў, як з сапегаўскім замкам у Старым Быхаве: у распрацоўку канцэпцыі яго рэстаўрацыі бізнесмен з прозвішчам Мікалай Сапега ўклаў свае ўласныя грошы. Але з розных прычын, перш за ўсё з-за неразваротлівасці дзяржавы, ініцыятывы сыходзілі на нішто, бы вада ў пясок.**



Новы малады міністр культуры Павал Латушка, апраўдваючы авансы, якія давалі яму журналісты, пабачыўшы інтэлігентнасць і шчырую зацікаўленасць справай былога беларускага амбасадара ў Польшчы, зрабіў канкрэтныя крокі ў накірунку развязання акрэсленай праблемы.

На сённяшні дзень дзейнічае дзяржаўная інвестыцыйная праграма, асноўнымі пляцоўкамі якой з'яўляюцца Мірскі і Нясвіжскі замкі. Працы вядуцца на 13 аб'ектах. Але ва ўмовах крызісу аб'ёмы фінансавання скарачаюцца: калі на іх мэты ў 2009 годзе прадугледжвалася 111,5 мільярда рублёў, то на наступны — толькі 50 мільярдаў, што відавочна недастаткова для вялікай колькасці унікальных будынкаў, якія знаходзяцца на мяжы знішчэння. Цалкам жа сёння ў Беларусі ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў уключана 4587 адзінак, з іх больш за 1500 помнікаў архітэктуры.

Сядзібна-палацавых ансабляў музейнага значэння ў спісе каля 190, прычым, па звестках галоўнага спецыяліста ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Мінкультуры Юрыя Барысюка, 63 помнікі нікім не выкарыстоўваюцца, а палова з іх нават не мае дакументаў на правы ўласнасці. Паўстала пытанне тэрміновага навядзення парадку ў ахоўным спісе і пошуку інвестараў.

У выніку загадчыца сектарам згаданага Упраўлення Мінкультуры Наталля Хвір паведаміла пра фармаванне спісу з 31 аб'екта, якія знаходзяцца ў нездавальняючым стане і будуць перададзены новым уласнікам для рэстаўрацыі. Паралельна інвестарам, у тым ліку і замежным, даецца магчымасць набыцця помніка за сімвалічны кошт, нават за адну базавую велічыню — 35 тысяч беларускіх рублёў. Пры ўмове, што сядзіба будзе адрамантавана або адрэстаўравана і захавае аўтэнтычнасць. Законапраект, падрыхтаваны Міністэрствам спорту і турызму, забяспечыць правы інвестара на доўгатэрміновую арэнду зямельнага ўчастка з набытым помнікам. Тэрмін можа скласці самае меншае 50 гадоў, або 99 гадоў, як у Літве.

У спіс Мінкультуры трапляюць палац Чацвярцінскіх XIX стагоддзя ў вёсцы Жалудок Шчучынскага раёна Брэсцкай вобласці, сядзібна-паркавы комплекс у Высокім (XVIII–XIX стагоддзяў) Камянецкага раёна, палацава-паркавы комплекс XVIII–XIX стагоддзяў у вёсцы Паланечка Баранавіцкага раёна, сядзібна-паркавы ансамбль XIX стагоддзя ў Старабарысаве Барысаўскага раёна Мінскай вобласці.

Поўны спіс прапанаваных для набыцця аб'ектаў у хуткім часе з'явіцца на сайце Міністэрства культуры. У перспектыве помнікі павінны выкарыстоўвацца ў праграмах агра- і экатурызму, а механізм перадачы помнікаў інвестарам удакладняецца. Істотна, што ў заявах прадстаўнікоў Міністэрства дэкларуецца павышэнне кантролю за рэканструкцыяй архітэктурных помнікаў і забеспячэнне грамадскасці доступу да інфармацыі ды ўдзелу ў захаванні гістарычных каштоўнасцяў — стаіць задача пазбегнуць еўрарамонту там, дзе патрабуецца кваліфікаваная рэстаўрацыя.

А пакуль за большасцю архітэктурных мемарыялаў, што патрабуюць выратавання, як за прыгаданым на пачатку замкам у Быхаве, стаіць невясёлая гісторыя спробаў вырашэння іх лёсу ў апошнія гады.

Палац у Жэмыславе Іўеўскага раёна, маёнтак Умястоўскіх, пабудаваны ў трэцяй чвэрці XIX стагоддзя як архітэктурная рэпліка каралеўскай рэзідэнцыі ў Лазенках у Варшаве, так і не знайшоў новага гаспадара. Нягледзячы на ахоўныя абавязкі, аформленыя пакупніком з Міністэрствам культуры ў працэсе набыцця комплексу ў АПК «Суботнікі», сума ў 9,5 мільёна рублёў, выплачаная за палац, падалася Камітэту дзяржкантролю недастатковай. Насуперак таму, што пакупнік фактычна набыў не толькі помнік, але абавязкі шматмільённых валютных інвестыцый у яго рэстаўрацыю, Жэмыслаўскі палац сёння вернуты былому гаспадару, АПК, якое, аформіўшы дакументы зноў, усё ж спадзяецца знайсці для яго забяспечанага ўласніка. Выратаванне палацу для агракамбіната напросту не па сродках.



Гіне выдатны ансамбль італьянскага архітэктара Джузепе Сака, збудаваны ў 1779 годзе ў Свяцку ў 20 кіламетрах ад Гродна. Палац Валовічаў з 2005 года зняты з балансу медычнай установы, ён пачаў руйнавацца, пазбавіўся ліўнёвай сістэмы адводу вады. Рамонт, які патрабаваў некалькі мільёнаў беларускіх рублёў, зараз, па ацэнцы гісторыкаў Андрэя Вашкевіча, Андрэя Чарнякевіча, Юрыя Гардзеева, Ігара Лапехі і Алеся Смаленчука, вылецца ў сотні тысяч долараў — з неабходнасцю прасушкі і ўмацавання сцен. Ні спробы выставіць палац на аўкцыён, ні перадаць яго на баланс Нацбанку з прыстасаваннем пад гасцявы замак, плёну не далі: задача яго рэстаўрацыі заліўшне сур'ёзная.

Магчыма, больш пашанцуе палацу ў Жалудку, колішняй вялікакняжацкай маёмасці, потым уладанню Сапегаў, Тызенгаўзаў і Чацвярцінскіх. Шыкоўны неаваўся. Больш за тое, наяўнасць у касцёле Ушэсця ў Жалудку фамільнага склепу Тызенгаўзаў з пахаваннем знакамітага кіраўніка каралеўскіх мануфактур пры Станіславе Аўгусце Панятоўскім, надворнага падскарбія ВКЛ Антонія Тызенгаўза — дадатковы аргумент для пераўтварэння мястэчка ў кропку на карце папулярных турыстычных маршрутаў у будучыні. І тое, што палац сёння зрабіўся месцам здымак першай на «Беларусьфільме» стужкі жахаў «Масакра» рэжысёра Андрэя Кудзіненкі, аўтара культавай стужкі неафіцыйнага беларускага кіно «Акупацыя. Містэрыі», — дадатковы шанс вяртання гістарычнай сядзібы да новага жыцця.

Ці адродзяцца палацы? Будзем спадзявацца, што новыя павевы ў дзейнасці Мінкультуры перадводзяць вырашэнне наспелага пытання ў рэчышча практычнай дзейнасці.

**КАМУНІКАТ.ORG запрашае да супрацоўніцтва беларускіх аўтараў, выдавецтвы і рэдакцыі!**

Інтэрнэт-бібліятэка Камунікат.org узнікла ў 2000 годзе як прыватная ініцыятыва і стваралася на грамадскіх пачатках. З часам сціплы збор публікацыяў перарос у буйную бібліятэку, якая сёння з'яўляецца адной з найбольш папулярных бібліятэк у сеціве.

Камунікат.org — праект Беларускага гістарычнага таварыства ў Беластоку — супрацоўнічае з рэдакцыямі многіх перыядычных выданняў Беларусі і замежжа, з выдавецтвамі і аўтарамі, з навукоўцамі і даследчыкамі, з творцамі розных напрамкаў мастацтва. Па адрасу www.kamunikat.org вы знойдзеце публікацыі як класікаў беларускай літаратуры, так і маладых пачынаючых аўтараў. Багатыя зборы гістарычнай літаратуры і кнігаў, недаступных у традыцыйных бібліятэках Беларусі, робяць Камунікат.org крыніцай інфармацыі для студэнтаў і навукоўцаў.

Тут можна таксама пазнаёміцца з навінкамі друку розных краінаў свету — усё, што выдаецца беларусамі і пра беларусаў, навуковыя даследаванні, слоўнікі, метадычныя дапаможнікі, матэрыялы, якія маюць сувязь з беларускасцю ва ўсіх яе праявах, — усё гэта знойдзеце на старонках інтэрнэт-бібліятэкі Камунікат.org

Камунікат.org у рамках праекту «Беларускія аўтары» дае таксама магчымасць ствараць персанальныя сайты беларускіх пісьменнікаў, публіцыстаў і даследчыкаў, якіх кнігі знаходзяцца ў рэсурсах бібліятэкі.

Нядаўна ўзорам праекту «Беларускія аўтары» распачаў працу новы праект — «Беларускія выдаўцы і выдавецтвы». Тут ствараюцца інтэрнэт-сайты з інфармацыяй пра асобныя беларускія выдавецтвы і выдаўцоў. На сайтах таксама з'яўляецца інфармацыя пра кнігі, надрукаваныя гэтымі выдавецтвамі, якія знаходзяцца ў рэсурсах Камунікат.org

Праект «Беларускія выдаўцы і выдавецтвы» дае магчымасць больш лёгка вандраваць па зборах Беларускай інтэрнэт-бібліятэкі Камунікат.org ды знаёміцца з навінкамі друку ды напрамкамі дзейнасці асобных выдавецтваў.

У планах чарговы праект — «Выдавецкія серыі».

Каб пабываць у гэтай бібліятэцы, не трэба выходзіць з дому — дастаткова ўключыць кампутар, не трэба чакаць у чарзе па кнігі — яны даступныя ўвесь час, не трэба плаціць за абанемент — карыстанне бібліятэкай бясплатнае.

**ЗАХОДЗЬЦЕ І КАРЫСТАЙЦЕ, КАЛІ ЛАСКА. ЗАПРАШАЕМ!**

**Кантакт: kamunikat@kamunikat.org**




Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Аляксей Кароль

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 27.11.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.